№ 1 (455) 6 студзеня 2005

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднаўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

**Як падаюць дыктатуры**
Сёньняшні дзень і гістарычныя паралелі.
**Старонкі 14—17.**

**Падпішыся сёньня!** Каб гарантавана чытаць «НН»: 1) дашліце ў Рэдакцыю свой дакладны адрас і тэлефон, 2) перакажыце на рахунак «НН» ахвяраваньне на выхад газэты з разьліку 18 000 рублёў на квартал. На які рахунак пералічаць ахвяраваньні? Адказы на пытаньні ды блянк ахвяраваньня — **старонка 9.** Сьпіс ахвярадаўцаў «НН» — **старонка 7.**

# ГОД беларускай прэсы

У лістападзе «Нашай Ніве» споўніцца 100 гадоў. Беларускі каляндар на 2006 год — старонка 24. Экстрэмальная прафэсія: газэтчык — старонка 10.

**Украіна выстаяла**
Газавы канфлікт з Расеяй скончыўся на карысьць Кіева.
**Старонка 4.**

**Ці бел-«...трансгаз»?**
«Газпром» сьвяткуе атрыманьне кантролю над «Белтрансгазам».
**Старонка 5.**

**Поўны рот каўбасы**
Адпаведныя органы зацікавіліся Клічаўшчынай, калі раён выйшаў у рэкардсмэны па наяўнасьці аўтамабіляў...
**Старонка 38.**

**Хто супраць Лукашэнкі,**
галасуе ад 12-й да 14-й.
**Старонка 8.**

**Палямон. Коды легенды**
Аўтарам легенды пра Палямона мог быць... Гістарычную таямніцу разгадаў Алег Латышонак.
**Старонка 30.**




У самалётах «Аўстрыйскіх авіяліній» пасажырам заўжды прапануюць сьвежы нумар «Нашай Нівы».

# У нумары:

**тэма нумару**
Украіна выстаяла ... 4
Што будзе зь «Белтрансгазам»? ... 5
Цень Шродэра. З Бэрліна — Алесь Кудрыцкі ... 6
**факты і камэнтары**
Праляскоўскі — у адстаўцы, Нявыглас — кіраўнік Адміністрацыі 8
Хто супраць Лукашэнкі, галасуе ад 12-й да 14-й ... 8
Пазьняк прапануе «народнае галасаваньне» ... 8
«Рэгіянальную газэту» выкінулі з шапікаў і падмяняюць «Региональной» ... 10
**мы самі**
Падзякі ахвярадаўцам ... 7
Як падпісацца на «НН» зараз ... 9
Газэтны экстрым ... 10
**хроніка**
Мікалай Аўтуховіч дабіўся вызваленьня ... 11
Павал Севярынец. Лісты зь лесу: «Ёсьць Бог, мы ня проціў… Толькі мы ў яго ня верым» ... 12
Сьціслая хроніка супраціву ... 12
**палітыка**
Шанцы на падзеньне дыктатуры ацэньваюць Андрэй Казакевіч, Віталь Сіліцкі і Валер Карбалевіч ... 14
Як падалі дыктатуры: гістарычныя паралелі ... 15
**культура**
Алесь Разанаў прэзэнтаваў «Кнігу ўзнаўленьняў» і «Лясную дарогу» .. 18
Шорт-ліст «Вялеса» ... 18
Тузін гітоў: вынікі 47-га туру ... 18
«IQ-48» — «Сьвятло ў цемры» ... 18
Тэхніка дыханьня ў беспаветранай прасторы. Прэм'ера Свабоднага тэатру ... 19
Брытанскі гурт «Belarus» параўноўваюць з «Radiohead» ... 20
**з усіх старон ... 21**
Літоўскі дэпутат-беларус Вацлаў Станкевіч: «Каму Беларусь дарагая, той ня будзе супраць дэмакратыі» ... 22
Беларускі каляндар на 2006 год ... 24
**камэнтары і пошта**
**пошта рэдактара ... 26**
Аляксей Коцюбаў. Стратэгія вастрыя і мэталу. «Будзьма гатовыя да дзейнасьці ў абыход усялякіх дзяржаўных структураў» ... 27
**іншымі словамі**
Віталь Тарас. Імпэрыя наносіць удар у адказ ... 28
Аляксандар Класкоўскі. Імпэрскі тарыф ... 29
**гісторыя**
Алег Латышонак. Палямон. Коды легенды ... 30
**бібліятэка**
З радзімы Сумара ... 37
**рэпартаж**
Поўны рот кілбасы. Рэпартаж Аляксея Бацюкова з Клічаўшчыны ... 38
**сьвет узьвесяліўся**
Андрэй Хадановіч. Цуд на Каляды 40
Дзед Мароз у камэндатуры Гудагай ... 41
Калядкі ... 42
Ксёндз Ян Твардоўскі. Нашто існуе Раство ... 43
**газэтка дзеткам**
Робін-Бобін ... 44
**каіса**
Шахматныя вынікі году ... 45
**дзе варта быць**
«Гары Потэр і Келіх Агню» ... 46
«Дзённы дазор» ... 46
**левым вокам**
Лёлік Ушкін. Газ, славяне ... 48

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

КАЛЯДНЫ ДАР — КАЛЯНДАР

Шукаючы зорку удзень зь ліхтаром,
здаецца, спазьніўся — а не!
Бо кожны ў Каляды бывае царом,
і сьвята яго не міне.

Бо мы — беларусы і маем у дар
адзін каляндар і другі каляндар.

І нехта паставіў ялінку,
рэальнасьцю робячы сны.
А хтось яшчэ мае хвілінку,
бо ёсьць каляндар запасны.

Па першых Калядах — другое Раство:
адным — хараство і другім — хараство!

Хоць жолаб цяпер называецца ясьлі,
ды сьвечкі ня згасьлі.
Хоць трох каралёў называюць валхвы,
ды кожны жывы:

Каспар, Мэльхіёр, Бальтазар —
К+М+Б —
І новая зорка — табе!

Учора кулялася чарка,
і несьлі ў пячору дары…
А сёньня цьвярозыя й хочам падарка
па іншым календары!

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

Чытачы “Нашай Нівы” выявіліся сапраўднымі грамадзянамі. Колькасьць падпісчыкаў пасьля Новага году вырасла на 320 чалавек, і зьвесткі працягваюць надыходзіць. Ён хацеў запалохаць, а сутыкнуўся з радыкалізацыяй грамадзянскага духу. Гэта нармальная рэакцыя нармальнай нацыі.

Дзякуй тым 47 чытачам, якія прапанавалі распаўсюджваць газэту. Цяпер задача — арганізаваць розьнічны распаўсюд. Прашу ўсіх здольных далучацца.

Як бачыце, газэта з новага году стала цалкам новаю. Дакладней, старою: вярнулася да фармату часоў Мікалая ІІ. Цяпер кожны можа здрукоўваць яе. Прачытай і скапіюй другому. Прачытай і падшый. Газэта даецца вялікім трудом. Шануйце яе.

Хай падпіска на “НН” стане першым крокам, пасьля якога вы пачнеце скрозь і заўжды гаварыць па-беларуску. Як многія пачалі пасьля Ганебнага рэфэрэндуму 1995 году.

Спачатку было нязвыкла, яны бянтэжыліся і гублялі пэўнасьць. Цяпер мова для іх — стыхія і візытоўка, па якой іх пазнаюць і якая дапамагае ў самых складаных сытуацыях. Ведаю многа такіх людзей.

Разумею, што цяжэй зьдзейсьніць такі пераход сталым людзям, сацыяльнае кола якіх сфармаванае. Або тым, хто ў маленстве не гаварыў на роднай мове. Але: мала чытаць — трэба гаварыць. На мове, на трасянцы, на дыялектах.

Калі для кагосьці з вас мяжою стане цынічная забарона беларускіх газэтаў, значыць мы не дарма рабілі гэты нумар.

**Наша Ніва**
**незалежная газэта**
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
**Наклад 2921. Газэта выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.59 4.01.2006.
Замова № 78.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Па стане на абед серады 4 студзеня ініцыятыўная група Алеся Мілінкевіча сабрала больш за 25 тысячаў подпісаў. Пра гэта паведаміў кіраўнік групы Аляксандар Бухвостаў. Найлепшыя вынікі дае Гомельская вобласьць.**

**Кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэньні Зянона Пазьняка Сяргей Папкоў паведаміў, што паводле ацэнак штаба сабрана 10 тыс. подпісаў: «Мы зьбярэм ня меней за 150 тыс., але ў асноўным агітуем за народнае галасаваньне» (пра гэтую ідэю — старонка 8). Ён зазначыў, што да выбараў З.Пазьняк ня вернецца ў Беларусь — «рэжым крымінальны, а Зянон нам патрэбны жывы».**

**Ініцыятыўная група Валера Фралова сабрала крыху меней за 5 тысячаў подпісаў. «Няма ў мяне вялікага аптымізму», — наракае прэтэндэнт.**

**Кіраўнік ініцыятыўнай групы Аляксандра Вайтовіча прарэктар зачыненага ЭГУ Валер Дунаеў паведаміў, што сабрана крыху больш за 5 тыс. подпісаў.**



03.01.2006

Прыродны газ для Ўкраіны на бліжэйшыя 5 гадоў будзе каштаваць 95 даляраў за 1 тысячу м³.



04.01.2006

МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

# Украіна выстаяла

У ноч на сераду газавы кантракт паміж «Газпромам» і «Нафтагазам Украіны» быў падпісаны. Пастаўнікам газу ва Ўкраіну будзе кампанія «Росукрэнэрга» (сумеснае прадпрыемства «Газпрому» і аўстрыйскага «Райфайзэнбанку»).

У адрозьненьне ад Беларусі Ўкраіна адмовілася аддаць газаправодную сыстэму ў сумеснае з «Газпромам» прадпрыемства. У адплату за гэта, а найбольш мо за выхад з палітычнае залежнасьці суседзяў вырашылі пакараць: ці прымусіць плаціць $230 за 1000 м³ (у 2005 г. — $50), ці пакінуць бяз газу. Меркавалася, што напярэдадні парлямэнцкіх выбараў «памаранчовы» ўрад ці то капітулюе, ці сарвецца на нэрвы.

Кіеў настойваў: цана непрымальная. І зьвяртаўся па дапамогу да Эўропы й ЗША.

Напярэдадні Новага году Пуцін прапанаваў «кампрамісны» варыянт: у І квартале Ўкраіна купляе газ па старой цане, а з красавіка — па рынкавай. У Кіеве такі мараторы палічылі прынізьлівым і палітычна нявыгадным. Украіна зноў адмовілася, а Віктар Юшчанка нават заявіў, што спрэчка паміж Кіевам і Масквой — гэта «бітва за незалежнасьць значна больш цяжкая, чым на Майдане».

На канфлікт пачалі рэагаваць эўрапейскія краіны, найперш Польшча. З усяго газу, які спажывае краіна, прыкладна 65% — з Расеі. І Варшава вуснамі міністра эканомікі Пётры Вазьняка заявіла, што краіна будзе весьці перамовы з «Газпромам» і «Белтрансгазам» аб павелічэньні транзыту паліва церазь Беларусь. Дарэчы, пры канцы 1990-х Варшава вяла перамовы аб пастаўках газу са Скандынавіі, але левы ўрад Л.Мілера спыніў перамовы. Новы правы ўрад хоча як мага хутчэй аднавіць перамовы, каб пазбавіцца залежнасьці ад Расеі. Пра тое самае кажа прэса. Праваліберальная «Жэчпасполіта» напісала: «Пазбавіцца газавага дыктату «Газпрому» ня менш важна, чым дабіцца вываду савецкіх войскаў на пачатку 1990-х».

«Газпромаўскі» газ задавальняе чвэрць патрэбаў Заходняй Эўропы, 80% яго ідзе праз Украіну. У выніку газавага крызысу, у Вугоршчыну пастаўкі скараціліся на 25%, Польшчу — на 14%. Зьнізіўся ціск у газатранспартных сыстэмах Аўстрыі, Францыі, Італіі, Славаччыны, Сэрбіі, Босьніі. Пачаўся скандал.

На Захадзе загучалі галасы пра магчымасьць пазбаўленьня Расеі права старшынёўства ў «вялікай восемцы».

У выніку ў ноч на сераду газавы кантракт паміж «Газпромам» і «Нафтагазам Украіны» быў падпісаны тэрмінам на пяць гадоў. Ён дзіўны, калі не сказаць сюррэалістычны. Пастаўнікам газу ва Ўкраіну будзе кампанія «Росукрэнэрга» (сумеснае прадпрыемства «Газпрому» і аўстрыйскага «Р айфайзэнбанку»). «Газпром» будзе прадаваць газ па $230 за 1000 м³, а «Росукрэнэрга» пастаўляць яго ўкраінскім спажыўцам па $95. Розьніца будзе кампэнсаваная за кошт улучэньня ў балянс «Росукрэнэрга» туркмэнскага, узбэкскага й казаскага газу. Гэта азначае, што на бліжэйшыя пяць гадоў «Росукрэнэрга» стане эксклюзіўным пастаўнікам усяго імпартнага газу ва Ўкраіну. У 2006 г. ва Ўкраіну будзе пастаўлена агулам 17 млрд кубамэтраў імпартнага газу. А транзытны тарыф расейскага газу па тэрыторыі Ўкраіны ў Эўропу падвышаны з $1,09 да $1,6 за 1000 м³ на 100 км.

Дырэктар «Нафтагазу Ўкраіны» Аляксей Іўчанка адмовіўся даваць камэнтар па тэлефоне, сказаўшы, што для Ўкраіны дамова ёсьць вельмі добрым вынікам.

**Зьміцер Дрыгайла**

## КАМЭНТАР

### Вадзім Карасёў: «Газавая нічыя — палітычная перамога Юшчанкі»

Сытуацыю з падпісаньнем дамовы паміж «Газпромам» і «Нафтагазам» камэнтуе дырэктар украінскага Інстытуту глябальных стратэгіяў, палітоляг Вадзім Карасёў:

— «Газпром» фармальна застаўся з той цаной, на якой настойваў (230 даляраў), але на ўкраінскай мяжы газ будзе прадавацца ўжо па 95, прычым кампаніяй, якая афіляваная з «Газпромам». Украіна на гэтым перапродажы нічога не губляе. Дадамо, што галоўным для Ўкраіны было «палітычна-эканамічнае пытаньне», а ня чыста газавае. Так што цана ў 95 газавых даляраў — перамога новай украінскай улады, для якой канфлікт тэстам, як трэба сябе паводзіць: ці адразу пайсьці на саступкі, ці ўпарта гнуць сваю лінію, ці адшукаць нейкую кампрамісную формулу.

Адзначу, што Ўкраіна з Расеяй дамовіліся самі, без удзелу Брусэлю. Гэта выгадна Расеі — ёй не давялося слухаць папрокі ў свой адрас. Выгадна і Ўкраіне — роля «пакрыўджанага хлопчыка», за якога заступаецца Захад, спрацавала б не на карысьць украінскай уладзе.

Адбылася энэргетычная нічыя. Але палітычна гэта перамога Ўкраіны. Украінская ўлада з гэтай сытуацыі выйшла ідэальна, не згубіўшы твару, вытрымаўшы паўзу й учасна паставіўшы свой подпіс. Думаю, Юшчанка дадаў сабе некалькі адсоткаў на выбарах.

# Ці бел- «...трансгаз»?

«Газпром» сьвяткуе атрыманьне кантролю над «Белтрансгазам». Маўчаньне Лукашэнкі — знак згоды?

«Газпром» атрымаў кантроль над транзытным газаправодам праз тэрыторыю Беларусі ў Эўропу, — пішуць добра інфармаваныя расейская «Газета» і «International Herald Tribune», — у выніку чаго гэтая расейская дзяржаўная энэргетычная кампанія зможа больш жорстка кіраваць маршрутам, які выкарыстоўваецца для паставак свайго прыроднага газу на эўрапейскія рынкі.

Паводле ўмоваў падпісанага ў чацьвер пагадненьня, «Газпром» стане ўладальнікам беларускага кавалку магістральнага газаправоду «Ямал—Эўропа», які пампуе 10% агульнага аб'ёму экспартаванага ў Эўропу расейскага газу. Гэтае пагадненьне падпісанае пасьля некалькіх няўдалых спробаў «Газпрому» вырваць кантроль над дзяржаўнай кампаніяй «Белтрансгаз» у беларускага прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі.

Гэтая непразрыстая ўгода, кошт якой ня быў абвешчаны, аплачваецца пастаўкамі газу па цане ніжэй за рынкавую, а таксама бартэрам і сьпісаньнем пазык. Атрымаць якія-кольвек камэнтары ў беларускіх афіцыйных асоб не ўдалося.

Беларускі ўрад, ад якога не залежыць нічога, і прэзыдэнт, ад якога залежыць усё, сапраўды маўчаць. Ці азначае гэта, што нацыя расплаціцца газаправодамі за падтрымку Масквой Лукашэнкі ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты?

Гаворка ідзе пра маёмасьць коштам 5 мільярдаў даляраў (на столькі яе ацэньваў А.Лукашэнка). Калі інфармацыя праўдзівая, Беларусь страціць кантроль над ёю. Калі інфармацыя непраўдзівая, але расейскі бок лічыць яе праўдзівай, то ў красавіку, адразу пасьля выбараў, нас чакае жорсткі газавы канфлікт з Расеяй.

А «Газпром» настроены сур'ёзна. Намесьнік старшыні кампаніі Аляксандар Разанаў заявіў як пра пэўнасьць, што на працягу трох месяцаў будзе створанае супольнае газатранспартнае прадпрыемства. Гэта адбылося 27 сьнежня, у часе падпісаньня, «Газпромам» і беларускім урадам пагадненьня пра цану расейскага газу для Беларусі й газавага транзыту для Расеі. У адпаведнасьці з контрактам, «Газпром» паставіць у Беларусь 21 млрд м$^3$ газу па цане $46,68 за 1 тыс. м$^3$ «пры наяўнасьці тэхнічнай магчымасьці». Тарыф на транспартоўку газу адпаведны 2005 г. — $0,75 за 1 тыс м$^3$ на 1000 км па сетках ААТ «Белтрансгаз» і $0,46 — па газаправодзе «Ямал—Эўропа».

Як тлумачылі прадстаўнікі «Газпрому», цана паставак газу і транспартны тарыф улічваюць чатыры чыньнікі: Расея й Беларусь ствараюць саюзную дзяржаву; летась былі падпісаныя дакумэнты, паводле якіх Расея становіцца ўласьнікам беларускага ўчастку газаправоду «Ямал—Эўропа», па якім транспартуецца звыш 50% расейскага газу, які пастаўляецца праз Беларусь на экспарт; зямля пад газаправодам афармлена Расеяй у доўгатэрміновую арэнду; нарэшце, аднаўленьне перамоваў пра стварэньне на базе «Белтрансгазу» супольнага газатранспартнага прадпрыемства расейскага ААТ «Газпром» і беларускага ўраду на парытэтных умовах.

Газавы транзыт — адзіная на сёньня магчымасьць уплыву Беларусі на Расею. Адмова Беларусі перадаць кантроль над «Белтрансгазам» на ўмовах «Газпрому» справакавала газавы крызіс у пачатку 2004 г. з часовым адлучэньнем газу для нашай краіны.

Прадстаўнікі беларускага ўраду падкрэсьліваюць, што перамовы з «Газпромам» пра стварэньне СП не спыняліся, проста «не сышліся ў цане». Статутны фонд «Белтрансгазу» складае 1,15 трлн руб. ($550 млн), але рыначная цана такіх актываў нашмат вышэйшая.

Крыніцы ў «Белтрансгазе» кажуць, што менавіта пасьля сустрэчы Лукашэнкі й Пуціна ў Сочы стала вядома пра захаваньне ранейшых коштаў на газ. Значыць, менавіта прэзыдэнты дамовіліся пра стварэньне СП.

У кожным разе, мы маем пастаўкі газу па коштах, у два разы ніжэйшых за ўкраінскія. Тлумачэньне гэтаму можа быць адно — «Газпром» атрымаў нешта ўзамен. Праўда, ніводную з ранейшых дамоўленасьцяў такога кшталту Лукашэнка ня выканаў. І гэтым можа тлумачыцца прызначэньне прэзыдэнцкіх выбараў на сакавік. Раней за тэрмін стварэньня СП.

Нібы прадбачачы такі паварот, кіраўнік праўленьня «Газпрому» Аляксандар Мядзьведзеў папераджальна заявіў: «Чым хутчэй мы дагаворымся па «Белтрансгазе», тым лягчэй будзе плянаваць цэнавую палітыку для Беларусі ў будучым, паколькі ўсё адно тая спэцыяльная цана, якая дзейнічае для Беларусі, будзе сапраўдная толькі ў 2006 г.».

**Зьміцер Дрыгайла**

### АНОНС

**Шлях дробнай сволачы**

Праз вялікі аб'ём матэрыялаў, што надышлі ў №1, Рэдакцыя змушаная адкласьці друк аповесьці Евы Вежнавец "Шлях дробнай сволачы". Аповесьць пачне друкавацца з працягам ад №2. Перапрашаем.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла Вам запозьнена. Рэч у тым, што Вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. А квіток ахвяраваньня трапляе да нас толькі праз 3—10 дзён. Таму мы атрымалі Ваш адрас гэтак позна. Наступныя нумары будзем старацца дасылаць Вам у тэрмін.

Будзем з Вамі, а Вы — з намі.

**Тэлефоны для даведак:**
(017) 284-73-29
(029) 613-32-32
(029) 707-73-29
Пытацца Аляксандру

# Блакітная паняверка

Нямеччына занепакоена паглядае ў бок Украіны. Цень Шродэра над газавым канфліктам — з Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі**.

Раніца пэнсіянэркі фраў Тышляйн з усходненямецкага Ютэрбогу пачынаецца аднолькава. Яна ідзе ў лазенку і адчыняе вадаправодны кран. З кухні даносіцца лёгкі хлапок — запалілася газавая фаерка, што падаграе ваду. Струменьчык з крану цяплее. Можна ўмывацца. Фраў Тышляйн ставіць на кухні на пліту чайнік, пстрыкае запалкай. За акном праяжджае аўтобус з надпісам «У маім маторы — бясшкодны для навакольля прыродны газ». Фраў кранае батарэю ды падкручвае рэгулятар тэмпэратуры. Блакітны праменьчык у фаерцы ўспыхвае яшчэ мацней.

Фраў Тышляйн ніколі не была ў Расеі. Яна пра яе ня думае. Але Расея вітае яе штораніцы, дапамагаючы гатаваць ежу ды саграваючы ўначы. 35% газу, які спажывае Нямеччына, паходзіць з краіны, дзе кіруе экс-рэзыдэнт савецкай выведкі ў Дрэздэне.

## Нагода паразважаць

Штодзённае газавае краязнаўства для мільёнаў немцаў уключае і беларускі элемэнт — большасьць газу, які экспартуе Расея, ідзе праз Беларусь, якая пакуль што атрымлівае яго па мізэрнай цане, паслухмяна транспартуючы далей на захад. Таму цяперашняя газавая вайна паміж Украінай ды Расеяй выклікала ў Нямеччыне ня паніку, а занепакоенасьць.

2 студзеня міністар эканомікі Нямеччыны Міхаэль Глёс у інтэрвію тэлекампаніі WDR зазначыў, што старая цана на газ для Ўкраіны была замалая, але і новая цана надта высокая. Паводле Глёса, «рашэньне недзе пасярэдзіне».

Але нямецкі ўрад займае не тэмпэратура ва ўкраінскіх кватэрах ці дабрабыт топ-мэнэджараў «Газпрому», а ўласная залежнасьць ад экспартаванага газу. Нямеччына набывае газ у Расеі, шчодра плацячы за яго. Таму калі газ ідзе зь перабоямі, вінаваты пастаўшчык, які сам мусіць разьбірацца, хто і як дастаўляе газ у Нямеччыну. Калі Расея няздольная гэта зрабіць, яна — ненадзейны партнэр.



«Трэба добра падумаць, што рабіць, каб зьменшыць залежнасьць ад паставак энэрганосьбітаў з-за мяжы», — заявіў міністар. Сп.Глёс прапанаваў падумаць, ці варта цалкам адмаўляцца ад плянаў па поўнай адмове ад выкарыстаньня атамнай энэргетыкі, а таксама прыгадаць пра выкарыстаньне вугалю для пакрыцьця энэргетычных патрэбаў.

Глёса, які належыць да ХСС, жорстка крытыкавалі сацыял-дэмакраты. Яны настойваюць на тым, што рашэньне адмовіцца ад «мірнага атаму» было канчатковым. Але апошнім часам кансэрватары глядзяць на такія аргумэнты з сарказмам: кар'ерныя пляны экс-канцлера Герхарда Шродэра даюць падставу казаць пра тое, што ён карыстаўся ня толькі дзяржаўным інтарэсам, вызначаючы кірунак энэргетычнай бясьпекі.




— Газаправод «Ямал–Эўропа», якім расейскі газ ішоў у Эўропу бязь зьменаў.
— Украінскія газаправоды, у якіх расейцы зьніжалі ціск газу.
— Газаправоды з Туркмэністану — пастаўнікі 50% газу для Ўкраіны. Яго пампаваньне з Узбэкістану й Казахстану таксама вядзецца праз Расею.

**По энэргетычных артэрыях Нямеччыны цячэ 23% газу. Зь сярэдзіны 1990–х стаў галоўным сродкам ацяпленьня. З дапамогай яго саграваюць больш за 17 мільёнаў кватэраў ды прыватных дамоў — 46% жыльлёвага фонду. Больш за 75% новых дамоў будуецца з разьлікам на газавае ацяпленьне. Газ параўнальна недарагі, адносна няшкодны для навакольнага асяродзьдзя і нескладаны ў выкарыстаньні для выпрацоўкі энэргіі. Адзіны мінус — Нямеччына амаль ня мае радовішчаў. Больш за 80% блакітнага паліва краіна імпартуе, найперш — з Расеі (35%).**

**Выйсьце з энэргетычнай залежнасьці — энэргетычны кактэйль. Плянуецца, што ў будучыні Нямеччына будзе здольная ствараць большую частку ягоных інгрэдыентаў сваімі сіламі з дапамогай вадароду, ветракоў, сонца ды іншых узнаўляльных крыніцаў энэргіі. Ад выкарыстаньня атамнай энэргіі вырашылі адмовіцца цалкам. Таму газ разглядаецца як танная і найменш шкодная для навакольля часовая альтэрнатыва, якая аблегчыць пераходны пэрыяд да новай энэргетыкі. Вось толькі калі той пераход адбудзецца? Эўрапейскаму кантынэнту да яго — як да Месяца. Ужо цяпер ЭЗ на 50% залежыць ад імпарту энэрганосьбітаў, а ў 2030 г., паводле падлікаў Эўракамісіі, залежнасьць можа скласьці 70%. Цяпер у Эўропе каля 15% энэргіі здабываецца з дапамогай альтэрнатыўных сродкаў. Паводле аптымістычных прагнозаў, у 2010 г. паказчык падвысіцца да 22%. Залежнасьць ад газу застаецца ў Эўропе праблемай №1.**

### Цень Шродэра

Экс-канцлер, мякка кажучы, зьдзівіў нямецкую грамадзкасьць рашэньнем узначаліць раду акцыянэраў будучага паўночнаэўрапейскага газаправоду. Рэч у тым, што ўрад Шродэра ўсяляк лабіраваў прыняцьце рашэньня пра пабудову газаправоду, які дазволіць пампаваць газ з Расеі па дне Балтыйскага мора. Не прайшло і трох тыдняў пасьля таго, як Шродэр афіцыйна сышоў з пасады канцлера, як зьявілася інфармацыя пра тое, што ён узначаліць камітэт, які будзе вызначаць палітыку акцыянэраў таго самага газаправоду, атрымліваючы за гэта больш за 1 млн эўра ў год. Пры гэтым галоўным акцыянэрам будучага газаправоду зьяўляецца «Газпром». Фактычна, свой заробак Шродэр будзе атрымліваць у крамлёўскай касе.

Дык пра што думаў экс-канцлер, абдымаючыся з Пуціным бяз гальштукаў ды плянуючы газавы гешэфт — пра краіну ці пра пэнсію? Калі Шродэр нават на градус зьмяніў палітычны курс краіны ва ўласных мэтах, для немцаў як эўрапейскай нацыі гэта непрымальна. «Палітычнае маўчаньне ў адносінах да Расеі акупілася для сп.Шродэра фінансава», — зьедліва адзначыў кіраўнік партыі зялёных Райнгард Бютыкофэр. Новая пасада — гэта «грошы за маўчаньне пра генацыд у Чачэніі і паступовае задушэньне свабоды ў Расеі», — кажа Бэрнт Посэльт, эўрадэпутат ад партыі ХСС. Шродэра не ўхвалілі нават аднапартыйцы. «Я б так не зрабіў», — сказаў віцэ-прэзыдэнт Бундэстагу Вольфганг Тырзэ ў інтэрвію тэлеканалу ARD. Адным сваім крокам Шродэр кінуў цень на сябе самога, на адзін з найбуйнейшых у эўрапейскай гісторыі энэргетычных праектаў, а таксама на ўсю нямецкую ўсходнюю палітыку апошніх гадоў.

### Газ з дрэнным пахам

Шродэр прыдбаў сабе цёплае месьцейка, але пахне яно непрыемна. Кіраўнічым дырэктарам Паўночнаэўрапейскага газаправоду прызначаны Матыяс Варніг, кіраўнік прадстаўніцтва Дрэздэнскага банку ў Расеі. Пікантнасьць сытуацыі ў тым, што, паводле афіцыйных зьвестак, Варніг у 1970-х — 1980-х «працаваў штазі», даслужыўшыся да чыну маёра. Як старшыні камітэту акцыянэраў Шродэру не пазьбегнуць цеснага супрацоўніцтва з Варнігам.

У дадатак да ўсяго, газаправод зарэгістраваны не ў Расеі і не ў Нямеччыне, а ў швайцарскім кантоне Цуг, сусьветна вядомай афшорнай зоне. Інакш кажучы, структура, якая будзе забясьпечваць газам Нямечыну і ў якой будзе працаваць яе былы канцлер, ня дужа прагне плаціць падаткі. Дадайце да гэтага новае амплюа «Газпрому» як газавага душыцеля новых эўрапейскіх дэмакратыяў, і вы зразумееце, чаму канцлер лічыць за лепшае вытрымаць паўзу — уцямнага адказу на тое, ці адрачэцца Шродэр новай пасады, няма.

У любым выпадку, новы газаправод праз Балтыку, які раней разглядаўся як гарант энэргетычнай бясьпекі Нямеччыны ад ненадзейных транспартэраў накшталт Беларусі, паўстае ў змрочных фарбах. Прывязаўшы сябе да расейскай газавай трубы, Нямеччына рызыкуе калі-небудзь сама апынуцца ў ролі Ўкраіны, асабліва тады, калі пачне праводзіць непрыемную для Крамля палітыку. Хто тады патлумачыць фраў Тышляйн, што блакітны агеньчык у фаерцы згас, бо Нямеччына ня згодная плаціць новыя «рынкавыя» цэны, якія ў чатыры разы большыя за папярэднія?

# Ахвяраваньні ад падпісчыкаў

Аляксей З. зь Менску ахвяраваў на «НН» 600 тыс., Валянціна Г. — 150 тыс., Уладзімер Ц. з Мазыра — 50 тыс., Аляксандар П. з Мазыра — 100 тыс., Зьміцер Л. — 50 тыс., Павал К. зь Менску — 53 тыс. Сяргей Р. ахвяраваў 215 тыс. Уладзь К. ахвяраваў 150 тыс., Вольга К. ахвяравала 90 тыс., Янка З. ахвяраваў 215 тыс., Янка К. ахвяраваў на выданьне газэты 50 тыс., Станіслаў Н. — 50 тыс., Уладзімер Ш. — 100 тыс., Эльжбета С. — 215 тыс., Тацяна і Андрэй П. ахвяравалі на выданьне газэты 60 тыс., В.Г. зь Ліды ахвяраваў 108 тыс., Таіса Б. зь Менску ахвяравала 108 тыс.

Таксама дзякуй за ахвяраваньні

Міхаілу Б., Францу К., Ларысе Я. з Полацку.
Міхаілу К. з Брагінскага раёну.
Уладзімеру Л. са Смургонскага раёну.
Генадзю Ш., Анатолю Б., Івану М., Аляксандру К., Алегу П. з Маладэчна.
Віталю Г. з Чачэрску.
І.П. з в.Валынцы.
Веры Б. са Стаўпеччыны.
Юр'ю К. з Глыбокага.
Мікалаю Ю. зь Нясьвіскага раёну.
Багуславу У. зь Іўя.
Уладзімеру В. з Кобрына.
Юр'ю Г., Дзьмітрыю Д. з Бабруйску.
А.Дз., С.П., Аляксандру К., А.М. з Горадні.
Сяргею І. з Салігорску.
Аляксандру Н. зь Вялейкі.
Тамары К., Сяргею К., Алегу К., Сяргею Н. з Жодзіна.
Л.Г. з Гарадка.
Андрэю К., Сямёну Г., Аляксею К., Аляксандру Б., Анатолю Б., Базылю К., Тацяне Б., Андрэю С. з Магілёва.
Марату Ш., Ірыне Ж. з Наваполацку.
Сяргею Г. са Смалявіцкага раёну.
Віктару П., Ф.А. зь Ліды.
Аляксандру Г. з Лагойску.
Вячаславу К., Алегу Л., Багуславу Я., Віталю Ф. з Барысава.
Дзьмітрыю М. з Драгічынскага раёну.
Валянціне З., Іне А., Галіне Н. зь Віцебску.
Валер'ю П., Аляксею Ч. з Баранавіч.
В.Д., Уладзімеру М., С.І., Юліі С. з Гомелю.
Уладзімеру Б. з Ваўкавыску.
Міхаілу С. з Пухавіцкага раёну.
Інэсе В., Васілю Л., Генадзю Ш. з Аршанскага раёну.
Віталю А. са Слуцку.
Міхаілу Г. зь Берасьця.
Ю.Ф. з Бабруйску.
Мікалаю П., Віталю Ц., Аляксандры П. з Жлобіна.
Васілю Г., Валерыі К., Ліліі З., Ігару Р., Зянону Л. зь Менскага раёну.
Марыне Б. з Паставаў.
С.М. з Шчучына.
Уладзімеру Ц. з Мазыра.
Мікалаю Б. з Ваўкавыску.

Зь Менску:
Натальлі Д., І.П., Ю.Л., Сяргею П., Андрэю К., А.С., В.Л., Тацяне Ц., Натальлі К., Тацяне Т., Станіславу Р., Аляксандру М., Аляксею К., В.Дж., Тацяне К., І.С., Алегу Л., Уладзімеру З., Івану Н., Дз.М., Вадзіму В., Зоі С., В.Д., У.Л., Вользе П., Н.А., Андрэю, Тацяне П., Андрэю С., Алене В., Віктару Я., Анатолю Р., Тацяне Л., Аляксею Я., А.К., Валерыі Ч., Міраславе Ш., Ірыне В., В.Г., А.Е., Рагнедзе А., М.Ж., Я.К., Алене М., Віктару Д., Мікалаю К., Станіславу Р, В.С., Уладзімеру Р., Віталю К., Уладзімеру Д., Марыне Б., Віктару Ж., Т.П., Генадзю Р., Альбэрту С., Валер'ю П., Аляксандру С., Ірыне Д., Аўгену І., Валянціну Л., Аўгену Л., Натальлі Р., Аўгену М., Ігару С., Ігару К., Фёдару К., Андрэю А., Павалу Ф., Дзьмітрыю М., Юр'ю М., Анатолю С., Георгію Г., Уладзімеру К.

**Рэшта сьпісу ахвярадаўцаў будзе друкавацца ў наступных нумарах. Чытачы, якія пералічылі ахвяраваньні з разьліку толькі на адзін месяц, паклапаціцеся пра грошы на выхад «НН» у наступныя месяцы.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уся прэзыдэнцкая раць. На рэгістрацыю кандыдатаў у прэзыдэнты ў Цэнтравыбаркам зьехаліся прэтэндэнты і іхныя прадстаўнікі. На фота: Аляксандар Казулін і Сяргей Гайдукевіч паселі абапал Віктара Шэймана.**

# Сілавыя структуры працягваюць кіраваць краінай

Віктара Шэймана, што сышоў у адстаўку з пасады кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта на час выбарчай кампаніі, зьмяніў Генадзь Нявыглас. Дагэтуль ён узначальваў Раду бясьпекі. Пазбавіўся пасады адыёзны намесьнік кіраўніка адміністрацыі, адказны за ідэалягічны блёк — Алег Праляскоўскі, «у сувязі зь пераходам на іншую працу» (па нашых зьвестках — на дыпляматычную). Першы намесьнік кіраўніка адміністрацыі аграрый Аляксандар Папкоў цяпер проста намесьнік. На пасаду першага намесьніка прызначаны Анатоль Рубінаў, экс-старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі — славуты тым, што за часамі яго кіраўніцтва ВАК фактычна ўвёў цэнзуру дысэртацый.

**Яўген Васілеўскі**

# Хто супраць Лукашэнкі, галасуе ад 12-й да 14-й

Старшыня Талачынскага раённага штабу ў падтрымку Алеся Мілінкевіча, былы народны дэпутат СССР Мікалай Петрушэнка прапанаваў прыхільнікам пераменаў галасаваць на выбарах 19 сакавіка ад 12 да 14 гадзіны.

«Трэба паказаць самім сабе, як нас шмат, — кажа няўрымсьлівы камуніст. — Я жыву ў Коханаве. Каго ні запытаю — усе супраць Лукашэнкі. А чаму яны пішуць, што ўсе — за? Гэтага ня можа быць, калі ў маім пасёлку 239 сем'яў — сумленныя грамадзяне — маюць запазычанасьць за камунальныя паслугі па дзясятках тысячаў. Ня могуць яны ўсе быць «за», калі ў 185 кватэрах на Новы год адключылі сьвятло. Калі ўсе незадаволеныя выйдуць прагаласаваць менавіта з 12 да 14 гадзіны, яны адразу пабачаць, колькі нас. Гэта дадасьць людзям імпэту выйсьці на плошчу».

**ЗД**

# Пазьняк прапануе «народнае галасаваньне»

З.Пазьняк прапанаваў ідэю, як абараніцца ад фальсыфікацыі вынікі галасаваньня. Вось яе сутнасьць: на чыстым аркушы чалавек піша прозьвішча свайго кандыдата ды ідзе на выбары. На выбарчым участку ён атрымлівае бюлетэнь, ідзе ў кабіну для галасаваньня. Там кладзе бюлетэнь у кішэню, а кідае ў скрыню свой аркуш паперы. Увечары 19 сакавіка, на думку З.Пазьняка, выбарцы мусяць сабрацца на Цэнтральнай плошчы. Там, паводле словаў кіраўніка Пазьняковай ініцыятыўнай групы сп.Папкова, грамадзкай камісіяй будзе арганізаваны збор афіцыйных бюлетэняў, якіх плянуецца сабраць больш за 50% ад агульнай колькасьці. Што неабвержна засьведчыць рэальныя вынікі галасаваньня.

**Зьміцер Дрыгайла**

## Другі том «Энцыкляпэдыі ВКЛ» не забаронены

Ходзяць чуткі, што выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя» згортвае праект энцыкляпэдыі «Вялікае Княства Літоўскае», і падрыхтоўка другога тому спыненая. Нявыхад зьвязваецца зь «меркаваньнем Праляскоўскага» пасьля прамовы Лукашэнкі ў Магілёўскім унівэрсытэце, дзе ён рэзка адмоўна выказаўся наконт ВКЛ. Але дырэктар «БелЭн» Генадзь Пашкоў нам гэтыя чуткі абверг: «Нічога падобнага. Плянуем выдаць другі том у гэтым годзе».

Першы том энцыкляпэдыі стаў заўважнай падзеяй і заняў ганаровае другое месца ў рэйтынгу кніг году «НН».

**АВ**

# Увазе падпісчыкаў «НН»!!!

Некаторыя падпісчыкі «НН» пералічылі ахвяраваньні, але не даслалі адрасоў, абмежаваўшыся імёнамі. Так вы газэты не атрымаеце, даражэнькія. Вы, мусіць, думаеце, што вас уся краіна ведае. Не заўжды гэта так.

**Зьміцер К., Натальля А., Лідзія К. зь Менску**, што пералічылі ахвяраваньні, мы ня ведаем вашых адрасоў.

**Сп.Сакалоўскі з в.Іскра**, калі ласка, паведаміце раён, вобласьць і індэкс.

**Сп.Астроўскі з Аршанскага раёну**, як дакладна называецца ваша вёска?

**Леанід Мікалаевіч Н. з вул.Калініна**, калі ласка, паведаміце свой дакладны адрас.

**Ахрамчук В.Г.,** калі ласка, дашліце свой адрас.

**Алеся Юр’еўна М**. з Наваполацку, зь якой вы вуліцы?

Пакідаючы жарты, кажам вам вялікі дзякуй, чытачы «НН». Вы аказаліся сапраўднымі грамадзянамі. З новага году падпісчыкаў «НН» паболела на 320, прычым адрасы й квіткі надыходзяць а надыходзяць.

Даць рады такой плыні няпроста. Таму будзьце ласкавы на будучыню дасылаць разборлівы й поўны адрас. Выконвайце наступныя парады:

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведамце ў Рэдакцыю свой адрас.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П. Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## Калі вы не атрымалі газэты

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:
(017) 284-73-29
(029) 613-32-32
(029) 707-73-29

**Вельмі просім чытачоў, якія маюць намер ад Новага году чытаць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

1) Просім усіх чытачоў «Нашай Нівы» **як найхутчэй дасланц у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны.**
Т.: (017) 284-73-29, (029) 707-73-29, (029) 613-32-32,
e-mail: nn@promedia.by, а/с 537, 220050 Менск.
2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты прыватнае ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перақазу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш паштовы адрас, у тым ліку ІНДЭКС. Не памыліцеся ў адрасе, калі ласка.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

# На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» — 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# «Рэгіянальную газету» выгналі з «Саюздрукаў», падмяняюць «региональной»

З новага году «Саюздрукі» Менשчыны спынілі продаж незалежнай газэты ў рэгіёне. Цяпер выданьне, якое на 29 сьнежня мела наклад 8500 асобнікаў, можна набыць ураздроб у чатырох крамках у Маладэчне, па аднэй у Вялейцы, Валожыне, Мядзелі, Чысьці, а таксама ў шапіках у Астраўцы, Смургонях, Ашмянах. Прыватнікі — не панацэя: праз іх распаўсюджвалася 10—15% накладу. 70% ішло праз шапікі.

«Менскаблсаюздрук» тлумачыць адмову тым, што ім нявыгадна прадаваць выданьне. «Няпраўда! — абураны рэдактар газэты Аляксандар Манцэвіч. — У Мядзеле мы ўваходзілі ў тройку лідэраў: там прадавалася праз «Саюздрук» 1600 асобнікаў. У Маладэчне — 2 тыс. асобнікаў».

Ноў-хаў маладачанскае сытуацыі ў тым, што месца «Рэгіянальнай» у шапіках займае іншае выданьне. Прадаўцы прапануюць... «региональный» маладачанскі выпуск «Из рук в руки». Пакупнікам тлумачаць, што «выданьне будзе замест «Рэгіянальнай». Некалькі месяцаў таму прадстаўнікі «Из рук в руки» вялі перамовы з газэтай, каб тая адмовілася ад брэнду і перайшла «пад дах» расейскамоўнага холдынгу. А.Манцэвіч адмовіўся.

Галоўная рэдактарка «Из рук в руки» Вольга Краўчанка пацьвердзіла карэспандэнту «НН» выдавецкія пляны на маладачанскі рэгіён: «Мы вывучалі рэгіён і палічылі, што праект будзе мець посьпех». Наконт прычынаў выбару менавіта Маладэчаншчыны спн.Краўчанка казаць адмовілася: камэрцыйная таямніца. Але зазначыла, што ў іншых раёнах такіх выпускаў холдынг ня мае.

«Рэгіяналка» ў сваіх публікацыях палітыкі не кранала. Рэпрэсіі супраць яе паказваюць, што лукашысты б'юць па ўсіх незалежных выданьнях, ня толькі палітычных. Каб засталіся толькі купленыя з вантробамі бэабахтэры.

Крыніцы ў Адміністрацыі прэзыдэнта ўсё пашыралі чуткі, што ўдушэньне незалежных газэтаў — захад часовы. Маўляў, ці то з студзеня, ці то зь лютага ўсіх, хто будзе «паводзіць сябе добра», вернуць у продаж. Маўляў, дні "Замяталіна ІІ" — палкоўніка Праляскоўскага — зьлічаныя, а тады ўсё вернецца. Ёсьць прастакі, што дагэтуль лукашыстам вераць…

**Аркадзь Шанскі**

# Газэтны экстрым

## Беларуская незалежная журналістыка становіцца экстрэмальным відам спорту.

Сёлета ўлады знайшлі больш дзейсную меру барацьбы супраць СМІ, чым прыпыненьне выхаду на тры месяцы. Прэсу без прычыны адмаўляюцца друкаваць, выкідваюць з падпісных каталёгаў і газэтных шапікаў. Пацярпелі 17 выданьняў, у тым ліку «НН», «Народная воля», «Рэгіянальная газета», «Салідарнасць» (апошняя змушана прыпыніла існаваньне).

Рэпартэр мусіць прарывацца да эпіцэнтру важных падзей, бо любы чыноўнік можа адмовіць у акрэдытацыі ды не пусьціць нават у залю паседжаньняў, суд ці на завод. 25 такіх выпадкаў зафіксавана за 2005 год у Менску, Пінску, Ганцавічах, Гомелі, Смургонях, Горадні, Баранавічах.

Хоць свабода слова гарантуецца канстытуцыяй, незалежныя СМІ разглядаюцца як падрыўныя. Журналістаў затрымліваюць. Польскіх журналістаў у ліпені затрымалі за тое, што яны асьвятлялі падзеі вакол Саюзу палякаў. Затрымалі, бо «кепска былі бачныя пячаткі на пасьведчаньнях». Пакуль рэпартэры знаходзіліся ў РУУС, іх відэазапісы вынішчылі. Юлію Дарашкевіч, фатакора «НН», у сакавіку гарадзенскія амонаўцы гвалтоўна выдалілі зь месца правядзеньня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў.

За апублікаваны матэрыял журналістам пагражае крымінальная справа аб паклёпе, як здарылася летась у дачыненьні да рэдактара «Борисовских новостей» Анатоля Букаса, альбо зьбіцьцё, як журналістам Алесем Абрамовічам.

Тым часам расьследаваньні па справе зьніклых і забітых журналістаў топчуцца на месцы. Справа аб забойстве Веранікі Чаркасавай прыпынена «ў сувязі зь немагчымасьцю ўстанаўленьня асобы, якая падлягае прыцягненьню да адказнасьці ў якасьці абвінавачанага». Па факце сьмерці Васіля Гроднікава пракуратура адмовілася заводзіць крымінальную справу. Завадзкі так і ляжыць недзе ў лесе.

Журналісты незалежных СМІ ўсьведамляюць, што іх чакае на доўгай дыстанцыі барацьбы за свабоду. Тую самую, якую гарантуе Канстытуцыя.

**Сяргей Будкін**



**Вось сымбаль твой, забыты краю родны… У выніку 74-дзённай турэмнай галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча адпусьцілі пад хатні арышт. За час галадоўкі 40-гадовы Мікалай Аўтуховіч страціў 40 кг. Цяпер былы аўганец, які ўступіў у змаганьне з сваволяй Лукашэнкавых кантралёраў, вяртаецца да жыцьця ў ваўкавыскай больніцы. Пракурор раёну распарадзіўся прыбраць варту з палаты. На фота: Мікалай Аўтуховіч з 14-гадовай дачкой.**

ІРЫНА ЧАРНЯЎКА



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Няма

Аднойчы, распытваючы сіцэнцаў пра найбліжэйшую царкву, я набрыў на бабку гадоў 80-ці. Яна сядзела на лаўцы ля хаты і паводле ўсіх прыкметаў павінна была ведаць, дзе й каму моляцца тутэйшыя жыхары.

— У царкву мы ня ходзім, унучак, — растлумачыла старая. — Яна нам ня трэба. Мы ж у Бога ня верым.

— Як так?

— А-а… — няпэўна махае рукой бабулька. — Як камуністы былі, дык казалі, што Бога няма…

— А ён ёсьць, — кажу бабулі.

— Ёсьць, ёсьць, унучак, — ківае галавой тая.

— Ёсьць, мы ня проціў… Толькі мы ў яго ня верым.

Вось ён, сіценскі сымбаль веры. Ведаць, што Бог існуе, і ня верыць у яго. Штосьці да болю знаёмае і вельмі беларускае. У краі, дзе тысячагодзьдзе таму прапаведаваў Торвальд Вандроўнік, на радзіме Эўфрасіньні, Сімяона ды Скарыны, у самай калысцы беларускага хрысьціянства — ***няма веры.***

Калі падчас перакуру я паспрабаваў паразмаўляць пра Бога на эстакадзе з рабочымі, рэакцыя больш за ўсё нагадвала калектыўны прыступ шалу. «Што для нас гэты Бог зрабіў?.. Як камуністаў скінулі, усе вы за сьвечку і ў царкву! Чаму дзеці паміраюць, а Бог на гэта глядзіць?!. Вось мы тут прападаем, а яму ўсё роўна!..» Яны крычалі наперабой, аж захліпаючыся, як брэша зграя сабак, не жадаючы пачуць адказу, адчайна выплюхваючы ўсю сваю злосьць, і шпурлялі

## СЬЦІСЛА

**Перасьлед актывістаў**

**Аляксандра Дарафеева**, сябра ініцыятыўнай групы Мілінкевіча, 21 сьнежня затрымалі ў сваёй кватэры: яго падазраюць у дачыненьні да рабаўніцтва (Дарафееў кажа, што падвозіў меркаваных «рабаўнікоў», але ня ведаў пра злачынствы).

Каля Жлобіна 23 сьнежня міліцыянты спынілі машыну актывіста **Уладзімера Кацоры** й канфіскавалі 57 тыс. навагодніх віншавальных паштовак ад Мілінкевіча.

Кіраўніка Янаўскага раённага штабу **Уладзімера Казеку** затрымалі 29 сьнежня ў Белаазёрску, забраўшы 800 нумароў «Народнай Волі».

У ноч на 31 сьнежня супрацоўнікі ДАІ затрымалі ў Віцебску **Хрыстафора Жаляпава**, кіраўніка віцебскага штабу, і правялі несанкцыяваны надгляд. Яго змусілі даць пісьмовыя тлумачэньні пра паходжаньне інструкцыяў зьбіральнікам подпісаў і матэрыялаў пра адзінага.

**У СПБ**

**Анжаліку Борыс** 21 сьнежня выклікалі да сьледчага на вочную стаўку з дырэктарам шчучынскага Дому палякаў Віктарам Багданам: ён вінаваціць актывістаў СПБ у запалохваньні. 29 сьнежня сьледзтва па гэтай крымінальнай справе пракуратура падоўжыла яшчэ на месяц.

26 сьнежня каля Сапоцкіна затрыманыя «за парушэньне рэжыму знаходжаньня ў памежнай зоне» галоўны рэдактар газэты «Głos znad Niemna ў эміграцыі» **А.Пісальнік**, галоўны рэдактар часопісу «Magazyn Polski» **Андрэй Пачобут** ды кіроўца **Анджэй Лісоўскі.** Яны ехалі на калядную сустрэчу.

**У Сьветлагорску**

Раённы суд 13 сьнежня аштрафаваў актывіста ТБМ **Вадзіма Богдана** на 300 тыс.руб. за ўлёткі, знойдзеныя ў яго кватэры. Сябра ПБНФ **Тэльман Масьлюкоў** накіраваў заяву ў пракуратуру: праверыць правамернасьць дзеяньняў міліцыянтаў, якія правяліператрус кватэры. Міліцыянты вярнулі адзін з ксэраксаў.

**Прэса пад прэсам**

12 сьнежня суд Менску пакінуў у сіле рашэньне суду Кастрычніцкага раёну, каб **«БДГ. Деловая газета»** і журналіст **Сяргей Сацук** сплацілі былому супрацоўніку АМОНу Сяргею Бядрыцкаму штраф: з газэты — 20 млн руб., з Сацука — 2 млн.

Пасьля дадатковай праверкі Менская раённая пракуратура 14 сьнежня пастанавіла не пачынаць крымінальную справу па факце сьмерці журналіста **Васіля Гроднікава.**

Суд Партызанскага раёну 15 сьнежня адмовіў **Ігару Шынкарыку:** актывіст АГП падаў судовы пазоў на РУП «Белпошта», якое ня ўнесла газэту «Народная Воля» ў падпісны каталёг.

На рэдактара недзяржаўнага інфармацыйнага бюлетэню «Назіральнік» **Паўла Красоўскага** з Жодзіна 15 сьнежня завялі адміністрацыйную справу: яго вінавацяць у «факце зьнявагі дзяржаўнай асобы» за карыкатуру ў выданьні.

«Берасьцеаблсаюздрук» 16 сьнежня адмовіў газэце **«Ганцавіцкі час»** у распаўсюдзе на 2006 г.

З 1 студзеня недзяржаўная газэта **«Химик»** у Наваполацку будзе даступная толькі па падпісцы: полацкае аддзяленьне «Віцебскаблсаюздруку» адмовіла ў распаўсюдзе.

Прафсаюзнае выданьне **«Салідарнасьць»** 23 сьнежня спыніла выхад. Гарадзенская абласная друкарня 27 сьнежня адмовілася друкаваць **«Газету Слонімскую»** ў 2006 г.

Сьледзтва па забойстве журналісткі **Веранікі Чаркасавай** спынена 27 сьнежня «ў сувязі зь неўстанаўленьнем асобы, якая падлягае прыцягненьню да адказнасьці ў якасьці абвінавачанага». Яе сына Антона затрымалі 29 сьнежня й зьмясьцілі ў СІЗА, хлопца вінавацяць у вырабленні і збыце фальшывых купюраў.

**Аўтуховіча выпусьцілі**

**Мікалая Аўтуховіча** 27 сьнежня перавялі ў ваўкавыскую больніцу, зьмяніўшы меру стрыманьня на падпіску пра нявыезд. Прадпрымальнік трымаў галадоўку 74 дні, схуднеў на 40 кг.

**У Гомелі**

Актывіста БСДП(Г) **Яўгена Фурсеева** 14 сьнежня звольнілі з пасады выкладчыка паліталёгіі Гомельскага ўнівэрсытэту.

20 сьнежня каля будынку УКДБ затрыманыя моладзевыя актывісты **Андрэй Кірылаў, Дзяніс Чыкалёў, Зьміцер Саўчанка**: яны трымалі партрэты зуброўца Андрэя Зайцава, які скончыў жыцьцё самагубствам у 2001 г., калі яго дапякаў кагэбіст.

**Галадоўка ў Калінкавічах**

Чарнобыльскі ліквідатар, інвалід II групы **Васіль Сіліверст** абвясьціў 16 сьнежня галадоўку ў Калінкавіцкім раённым судзе: ён дамагаецца, каб прызналі, што ягоная інваліднасьць выкліканая ўдзелам у ліквідацыі наступстваў Чарнобылю.

**Дзень салідарнасьці**

15 сьнежня ў Барысаве падчас распаўсюду ўлётак да Дня салідарнасьці затрымалі **Алесю Ясюк. Паўла Маджару** затрымалі 15 сьнежня ў Гомелі за распаўсюд улётак з інфармацыяй пра Дзень салідарнасьці. У Сьветлагорску 16 сьнежня затрымалі ўдзельнікаў Дня салідарнасьці **Т.Масьлюкова, Андрэя Музычэнку, Вадзіма Данільчанку, Руслана Лютарэвіча,** актывіста ПКБ **Мікалая Міхалькевіча. Юр'я Калычава, Данілу Барысевіча, Руслана Мацьвеева** затрымалі ў Менску, калі яны фатаграфавалі запаленыя ў вокнах сьвечкі.

**Назіральнік у пастарунку**

**Міколу Астрэйку** 17 сьнежня завезьлі ў спэцпрыёмнік–разьмеркавальнік, каб адседзеў 11 з 15 сутак за правядзеньне несанкцыяванага сходу, якія не адбыў праз хваробу.

**Рэлігійны перасьлед**

Пратэстанцкай суполцы **«Сьвятло сьвету»** аб'яднаньня Хрысьціянаў поўнага Эвангельля пагражае ліквідацыя: яна страціла юрыдычны адрас.

Пробашчу каталіцкай парафіі ў Барысаве, грамадзяніну Польшчы **Робэрту Кшывіцкаму** 20 сьнежня не падоўжылі візу на 2006 г. з ініцыятывы Камітэту ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў.

**Штрафы на БХК**

Прэзыдыюм Вышэйшага гаспадарчага суду 20 сьнежня забавязаў

# веры

тыя выкрыкі, быццам камяні.
Дзіўная рэч: палітычныя прамовы тут праходзяць, а словы пра Бога выбухаюць, нібыта бомба.
«Страшны край, — сам-насам дзяліўся са мной уражаньнямі інжынэр, што прыехаў сюды зь Берасьцейшчыны, — тут жа нават як памрэ чалавек — не адпяваюць, не галосяць, не памінаюць толкам… Закапалі, як падлу, каб хутчэй выпіць, — і канец».
Сьвятар з Полацку прыяжджае ў Алёшчу ды Малое Сітна раз на год — пахрысьціць немаўлят. Далучыць, так сказаць, прыплод да паствы. Ня верыцца мне, што гэтак тутэйшыя душы будуць збаўлены. Ня верыцца, што ў Полацкай япархіі няма магчымасьці хаця б раз на месяц, хаця б у прыватнай хаце арганізоўваць хаця б адно набажэнства на абшары больш як 1 000 км$^2$… Праваслаўны атэізм, інакш не назавеш.
І люд разважае: «Што нам Бог? Жылі неяк бяз Бога і памром сабе. Згніём, а пасьля ж нічога няма». Ці можа чалавек, які рыхтуецца адно згніць ды зьнікнуць, думаць пра лепшую будучыню? Пра краіну, праўду, свабоду?..
Бязьвер'е — найглыбейшы й самы чорны корань зла, што буяе ў Алёшчы і Малым Сітне. Невідушчыя вочы, апушчаныя абліччы, жабрацтва, алькагалізм, самагубствы сілкуюцца адсюль. З пустога сэрца.
У тое, што гэтых людзей успоіць хрустальны сасуд рыначнага сацыялізму, што іх накорміць гуманітарка з Амэрыкі, што іх выратуе наездамі раз на год бацюшка, у мяне веры няма.
Але ў тое, што Бог дасьць абуджэньне гэтаму краю, калі пераможам у 2006-м, — веру.
*Малое Сітна*

«Ёсьць Бог, мы ня проціў... Толькі мы ў яго ня верым».

## СЬЦІСЛА



WWW.ZUBR-BELARUS.COM

**У навагоднюю ноч сябры незарэгістраванага «Зубра» ўзьнялі на Кастрычніцкай плошчы 10 бел-чырвона-белых сьцягоў.**

**ГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»** сплаціць каля 75 тыс. даляраў падаткаў і штрафаў за гранты, атрыманыя ад эўрапейскіх структураў.

**У Горадні**

**Уладзімера Леванеўскага** затрымалі 22 сьнежня ў Горадні падчас распаўсюду бюлетэню «Предприниматель».

Гарадзенскі абласны суд 15 сьнежня ліквідаваў **ГА «Таварыства вышэйшай беларускай школы»:** яно не прайшло перарэгістрацыі.

**Суды за салідарнасьць з прэсай**

23 сьнежня міліцыянты ў Баранавічах пачалі складаць пратаколы на ўдзельнікаў пікету ў абарону недзяржаўнай прэсы, што адбыўся 10 сьнежня, — **Віктара Мезяка, Аркадзя Блінкоўскага, Сяргея Гоўшу, Віктара Сырыцу.**

За ўдзел 10 сьнежня ў акцыі падтрымкі недзяржаўнай газэты «Віцебскі кур'ер» 28 сьнежня ў Віцебску аштрафаваныя на 580 тыс.руб. сацыял–дэмакраты **А.Гаўруцікаў, Зьміцер Караткевіч, Кацярына Сампоева, Іван** ды **Аляксандра Церашы,** актывіст ПБНФ **К.Смолікаў.**

**Моладзьдзю цікавяцца**

Моладзевага актывіста **Паўла Юхневіча** затрымалі 24 сьнежня каля касьцёлу сьв.Сымона й сьв. Алены ў Менску ды завезьлі ў Маскоўскі РУУС.

27 сьнежня ў Менску на кватэры моладзевага актывіста **Сяргея Рыкава** адбыўся ператрус, які без аніякіх дакумэнтаў правёў міліцыянт і двое ў цывільным. У Маскоўскім РУУС хлопца дапытвалі супрацоўнікі КДБ.

**Зарэмбюка баяцца**

У дэпутата Мастоўскага райсавету, сябра ініцыятыўнай групы Мілінкевіча **Алеся Зарамбюка** 27 сьнежня міліцыя брала тлумачэньні наконт бюлетэню «Мастоўская праўда». Ён заявіў, што ня мае дачыненьня да выданьня.

**Мін'юст трэпле партыям нэрвы**

27 сьнежня міністэрства вынесла паўторнае папярэджаньне **Беларускай экалягічнай партыі зялёных, БСДП(Г), партыі жанчын «Надзея», ПБНФ, Патрыятычнай партыі** за адсутнасьць юрадрасоў у нізавых суполак.

**Наркотыкі і фальшывыя даляры**

Актывіста БСДП(Г) **П.Маджару** з Гомелю затрымалі 23 сьнежня. У яго знайшлі пакецік з 1,5 г марыхуаны й завялі крымінальную справу за «незаконны абарот наркотыкаў». Хлопец кажа, што наркотыкі падкінулі.

27 сьнежня ў Менску затрымалі **Сяргея Папкова,** кіраўніка ініцыятыўнай групы З.Пазьняка: яго зьвінавацілі ў збыце фальшывай купюры. Пры ператрусе на кватэры сябры КХП–БНФ міліцыянты правяралі файлы на ягоным кампутары.

**Графіці—крымінал**

Уначы на 28 сьнежня за маляваньне графіці «16» затрымалі моладзевых актывістаў **Аляксандра Казакова й Зьмітра Зубра.** Іх трымалі ў пастарунку больш за двое сутак і распачалі справу паводле арт.363 КК (супраціў работніку міліцыі ці іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак). Хлопцам пагражаюць абмежаваньне волі тэрмінам ад шасьці месяцаў да 3 гадоў.

**Зачыненая «Беларуская пэрспэктыва»**

28 сьнежня Вярхоўны суд ліквідаваў міжнароднае **ГА «Беларуская пэрспэктыва»** за рэгістрацыю юрадрасу ў жылым фондзе й выкарыстаньне ў назьве слова «беларуская». Віцебскі гарвыканкам 28 сьнежня паведаміў, што спыняе дамову на арэнду офісу для **ГА «Прыватныя ініцыятывы».**

Прафэсару **Алегу Манаеву,** кіраўніку зарэгістраванага ў Вільні Інстытуту сацыяльна–эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, 30 сьнежня пракуратура вынесла папярэджаньне за сацапытаньні, праведзеныя «з парушэньнем устаноўленага парадку». Манаеў кажа, што праводзіць сацапытаньні як прыватная асоба.

**Штраф за Фядуту**

Работніцу трактарнага заводу **Раісу Кацько** пакаралі штрафам на 58 тыс.руб. за продаж кніг і газэтаў у неналежным месцы. Жанчына мяркуе, што падстава — продаж кнігі А.Фядуты «Аляксандар Лукашэнка».

**Камэдыя пад забаронай**

30 сьнежня не адбылося прэм'еры беларускамоўнай вэрсіі фільму **«Любоў насамрэч»:** адміністрацыя Менскага палацу дзяцей і моладзі адмовілася ад імпрэзы. Падставай стала тое, што арганізатарам выступіла не юрыдычная асоба, а група моладзі.

**АШ**

# Шанцы на падзеньне дыктатуры

ацэньваюць Андрэй Казакевіч, Віталь Сіліцкі і Валер Карбалевіч.

Аляксандра Лукашэнку ў сьвеце называюць апошнім дыктатурам Эўропы. Калі абрынуўся недэмакратычны рэжым ва Ўкраіне, многія прагназавалі, што наступнай у чарадзе будзе Беларусь. Пасьля эўфарыя зьмянілася пэсымізмам. Але пасьпешлівае прызначэньне датэрміновых выбараў на 19 сакавіка зблытала ўсе разьлікі. Пра імавернасьць магчымых пераменаў і іх перадумовы разважаюць палітолягі Віталь Сіліцкі, Валер Карбалевіч і Андрэй Казакевіч.

**«Наша Ніва»: Ці бачыце Вы ў беларускім грамадзтве перадумовы для пераходу да дэмакратыі?**

**Віталь Сіліцкі:** Пра гэта мы з пэўнасьцю даведаемся, калі перамены адбудуцца. Але адна перадумова для радыкальных зьменаў закладзеная ў саму канструкцыю ўлады. У сыстэме, заснаванай на неабсяжнай уладзе аднаго чалавека, заўжды адбываюцца радыкальныя зьмены, калі ён сыходзіць. А Ён ня вечны.

**Валер Карбалевіч:** Для радыкальных зьменаў неабходны крызіс, у нас пакуль няма ні сацыяльна-эканамічнага, ні палітычнага. Створаная Лукашэнкам мадэль паказвае сваю жыцьцяздольнасьць. Яна забясьпечвае ўзровень жыцьця, які палова насельніцтва лічыць прымальным. Узамен грамадзяне гатовыя цярпець парушэньне сваіх грамадзянскіх правоў. Гэтую выснову пацьвярджае высокі рэйтынг Лукашэнкі: звыш 50% паводле незалежных сацыёлягаў. Гэта больш, чым за тры месяцы да прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Гістарычны досьвед сьведчыць: аўтарытарныя рэжымы левага тыпу церпяць крах у выніку эканамічнай неэфэктыўнасьці. Менавіта з гэтай прычыны згінуў сацлягер.

**Андрэй Казакевіч:** Мусіць быць адчуваньне неабходнасьці пераменаў. Іншая справа, калі размова ідзе пра «наяўнасьць аб'ектыўнай крызіснай эканамічнай ці палітычнай сытуацыі». Першае — гэта рэальная энэргія пераменаў, другое — толькі патэнцыйная. Падаецца, што «жаданьне» і «неабходнасьць» пакуль не дастаткова артыкуляваныя ў масавай грамадзкай сьвядомасьці.

**«НН»: Ці ёсьць імавернасьць падзеньня рэжыму ў найбліжэйшы час і пры якіх абставінах?**

# Так падалі дыктатуры

*Адзінае, што трэба для трыюмфу зла, каб добрыя людзі нічога не рабілі*
Эдмунд Бёрк (1729—1797), ангельскі філёзаф

У кожнай краіне з дыктатарамі разьбіраліся па-свойму. У Лацінскай Амэрыцы былі свае асаблівасьці, у краінах Паўднёвай Эўропы — свае, у дзяржавах былога сацлягеру — свае.

## Партугалія: першая кветкавая рэвалюцыя

Дыктатура ў Партугаліі пратрывала 38 гадоў, а ляснула за адзін дзень. Рухачамі апазыцыі сталі афіцэры сярэдняга зьвяна. У пачатку 1970-х яны на чале з Атэлу дэ Карвалу стварылі Рух узброеных сіл (MFA), паставіўшы мэтай узброены пераварот. Паўстаньне прызначылі на 25 красавіка 1974 г.

У чацьвер, а 12.25, па радыё прагучала песьня-сыгнал для паўстанцаў. З ваеннай базы Сантарым капітан Сальгуэра дэ Мая вывеў 8 бронемашын і 10 грузавікоў зь пяхотай — на падтрымку рэвалюцыі. 5-ты пяхотны полк а 14-й заняў сталічную радыёстанцыю, а 17.30 MFA зьвярнулася па радыё да паліцыі і войска з просьбай заставацца ў кашарах.

Прэм'ер-міністар Каэтану спрабаваў схавацца на базе нацыянальнай гвардыі, салдаты якой лічыліся вернымі служкамі рэжыму. Але гвардзейцы таксама перайшлі на бок паўстанцаў. Супраціўляліся толькі падразьдзяленьні тайнай паліцыі.

Увечары без адзінага стрэлу быў узяты Генштаб і арыштаваныя міністры. А 20-й вечара MFA, што ня мела доўгатэрміновага пляну дзеяў (!), абвесьціла аб зьвяржэньні рэжыму. Дыктатар Марсэлу Каэтану зьбег.

Вуліцы сталіцы, куды высыпалі шчасьлівыя месьцічы, ператварыліся ў народнае сьвята. Тысячы школьнікаў маршавалі па горадзе, скандуючы: «Далоў фашызм». Бронемашыны паталі ў кветках. Гвазьдзікі былі паўсюль: у руках людзей, у пятліцах пінжакоў, іх дарылі жаўнерам, якія ўтыкалі іх у рулі аўтаматаў. Першая «кветкавая рэвалюцыя» прайшла амаль без крыві.

## Грэцыя: студэнцкая рэвалюцыя

Студэнты былі адзінымі, хто адкрыта супрацьстаяў хунце «чорных палкоўнікаў» (1967—1974). На першую маніфэстацыю — 21 красавіка 1971 г. — у чацьвертыя ўгодкі ўсталяваньня хунты выйшла толькі 200 чалавек. Эканамічны ўздым якраз ператвараў аграрную краіну ў індустрыяльна-аграрную.

Аднак пратэсты ўзмацніліся, калі эканамічны крызіс перакрэсьліў дасягненьні рэжыму. У лістападзе 1973 г. застрайкавалі навучэнцы ўнівэрсытэту Політэхніён у Атэнах. 17 лістапада ўнівэрсытэт узяты штурмам войскамі, 23 студэнты былі раздушаныя танкамі, больш за тысячу параненыя.

А сышла хунта досыць

**Віталь Сіліцкі:** Зьмена ўлады ў Беларусі тэарэтычна магчымая пры дзьвюх акалічнасьцях: страта кантролю за спэцслужбамі і антаганізаваньне ўладай больш шырокіх колаў насельніцтва, чым цяпер — калі ўсе рэпрэсіі падаюць на галовы вузкай сацыяльнай праслойкі. І да першага, і да другога, здаецца, яшчэ далёка.

**Валер Карбалевіч:** Такая імавернасьць невялікая. У Беларусі рэжым асабістай улады. Ён можа існаваць, толькі пакуль на чале яго стаіць сам Лукашэнка. Асоба кіраўніка тут незаменная. Любая спроба ягонай замены (напрыклад, у выпадку рэалізацыі праекту «Пераемнік») прывядзе да разбурэньня рэжыму. Асаблівасьць створанай у Беларусі сацыяльнай мадэлі палягае ў тым, што ўсе яе элемэнты і структурныя часткі жорстка счэплены адна з адной. Гэта закон функцыянаваньня ўсіх аўтарытарных і таталітарных сыстэм. У гэтым іх моц і ў гэтым іх і слабасьць. У недэмакратычных сыстэмах выпадзеньне аднаго кубіка разбурае ўсю піраміду. Такім кубікам можа быць што заўгодна: хваляваньні на буйным заводзе, павышэньне цэнаў на газ, міжнародныя санкцыі. Крах камуністычнага рэжыму ў Польшчы пачаўся з страйку на Гданьскай суднаверфі.

**Андрэй Казакевіч:** Павінна быць падзея, якая парушыла б маналітнасьць сыстэмы і яе «сымбалічны парадак» і мела б наступствамі страту ўладамі легітымнасьці. Пад легітымнасьцю я маю на ўвазе гатоўнасьць падпарадкоўвацца існым правілам палітычнае гульні і электаральнага працэсу. Такую падзею — выбары, страйк, рэпрэсіі — цяжка спрагназаваць. Гэтаму павінна папярэднічаць

Андрэй Казакевіч: Мы на піку кансалідацыі аўтарытарызму.

агульная эрозія сыстэмы. Але ёсьць адчуваньне, што зараз мы знаходзімся на піку яе кансалідацыі.

**«НН»: Ці могуць перамены адбыцца шляхам выбараў?**

**Віталь Сіліцкі:** Калі раптам спатрэбілася праводзіць выбары ў пажарным парадку, то, мабыць, і такое магчыма.

**Валер Карбалевіч:** Досьвед каляровых рэвалюцый дазваляе вывесьці формулу перамогі дэмакратыі: заваёва перамогі на выбарах плюс вулічныя акцыі. Права на ўладу патрэбна легітымізаваць. Ніякіх іншых спосабаў легітымізацыі, акрамя выбараў, не існуе. Тут цікавы досьвед Украіны. Пасьля «касэтнага скандалу», забойства Гії Гангадзэ там прайшлі масавыя маніфэстацыі пад лёзунгам «Украіна бяз Кучмы». Але яны не змаглі зрушыць рэжыму. А вось калі кандыдат аб'яднанай апазыцыі В.Ющанка атрымаў большасьць на выбарах і інфармацыя была данесеная да насельніцтва, людзі выйшлі на Майдан і адстаялі перамогу. Каб абараняць перамогу, гэтая перамога павінна быць. Калі апазыцыйны кандыдат не атрымае большасьці на выбарах, людзі ня пойдуць на беларускі Майдан. Так было ў 2001 г.

**Андрэй Казакевіч:** Ёсьць два сцэнары. Першы: апазыцыя мае перавагу ў электаральнай падтрымцы, і выбары маюць празрысты характар. Але гэта не сцэнар для 2006 г. Другі: выбары выкарыстоўваюцца як нагода ці «падзея» для дэлегітымізацыі сыстэмы і «прасоўваньня» зьмена. Такая падзея здольная зьмяніць палітыку ўлады, але няма гарантый, што такія зьмены будуць да лепшага. Кансалідаваныя аўтарытарныя рэжымы рэдка зьмяняюцца народам — для гэтага неабходны зьбег унутраных і зьнешніх абставінаў — у тым ліку і пэўны досьвед «эрозіі».

**Гутарыў Сямён Печанко**



**Чэскую аксамітную рэвалюцыю 1989 зьдзейсьнілі 300 тыс. чалавек, зь якіх 100 тыс. былі рабочымі.**

мірна. У 1974 г. трыюмвірат увязаўся ў ваенны канфлікт на Кіпры, але прайграў. Грэцыя мусіла вывесьці войскі з выспы. У краіне значна вырасла незадавальненьне сацыяльнай палітыкай хунты, і Г.Пападопуляс мусіў выканаць абяцаньне, якое даў у 1967 г.: пасьля навядзеньня парадку перадаць уладу грамадзянскаму ўраду. Улетку 1974 г. урад узначаліў Канстанцінас Караманліс, што цягам сямі гадоў знаходзіўся ў эміграцыі ў Парыжы.

## Чэхія: стаяньне на плошчы

У 1989 г. прыйшла чарга сацыялістычных дыктатураў ва Ўсходняй Эўропе. Вугорцы вызваліліся за 10 месяцаў, усходнія немцы за 10 тыдняў, чэхам і славакам хапіла некалькіх дзён.

У Празе ўсё пачалося з дэманстрацыі студэнтаў. 17 лістапада 1989 г. прайшла шматтысячная маніфэстацыя на ўгодкі разгону антыфашысцкай дэманстрацыі студэнтаў (1939). Насуперак заплянаванаму маршруту. дэманстранты збочылі на Вацлаўскі пляц. Спэцаддзелы міліцыі ўжылі зброю — 150 чалавек былі параненыя. Увечары на падваконьнях дамоў на вуліцах, дзе пралілася кроў, запаліліся тысячы сьвечак салідарнасьці. На наступны дзень застрайкавалі студэнты Вышэйшай тэатральнай школы і работнікі тэатраў. Яны патрабавалі прыцягнуць да ад-

Працяг на старонцы 16.

# Так падалі дыктатуры

Працяг са старонкі 15.

казнасьці віноўнікаў разгону. 19 лістапада чэскія дысыдэнты і палітыкі заснавалі грамадзкае аб'яднаньне «Грамадзянскі форум», які адыграў ключавую ролю ў падзеньні рэжыму Густава Гусака.

20 лістапада антыкамуністычныя маніфэстацыі прайшлі ў іншых гарадах краіны, а мітынг на Вацлаўскай плошчы ў Празе сабраў 100 тыс. чалавек. Гэтым разам людзі патрабавалі свабоды слова. 21 лістапада застрайкавала большасьць ВНУ. На Вацлаўскім пляцы сабралася 200 тыс. чалавек, а Вацлаў Гавал з балькону абвесьціў мэты «Грамадзянскага форуму»: выдаленьне з уладных структураў адыёзных дзеячаў, расьсьледаваньне расстрэлу студэнцкай дэманстрацыі, вызваленьне вязьняў сумленьня, свабода слова і друку. 22 лістапада студэнты дабраліся да заводаў — рабочыя мусілі ведаць пра падзеі, а ня верыць бруду, што ліўся з афіцыйных СМІ. 23 лістапада мітынг на Вацлаўскай плошчы сабраў 300 тыс. чалавек, сярод іх 100 тыс. былі рабочымі.

29 лістапада прасавецкі рэжым спыніў сваё існаваньне.

## Дыктатуру Чаўшэску скінулі пратэстанты

Некаторыя гісторыкі цьвердзяць, што ніякай рэвалюцыі ў Румыніі ў сьнежні 1989 г. не было, а адбыўся зрэжысаваны кланам Іліеску палацавы пераварот з выкарыстаньнем жыхароў Бухарэсту ў якасьці гарматнага мяса. Іншыя кажуць, што Іліеску проста своечасова зарыентаваўся ў падзеях. Але ў любым выпадку каталізатарам рэвалюцыі былі падзеі ў Тымішаары.

Пастар пратэстанцкай вугорскай царквы Ласла Токешы карыстаўся вялікай папулярнасьцю сярод мясцовага вугорскага насельніцтва. Ён быў вядомы тым, што адкрыта пратэставаў супраць парушэньня правоў вугорцаў. А для Чаўшэску яны былі, як палякі для Лукашэнкі.

За час сьвятарства Токешы колькасьць парафіянаў у прыходзе вырасла ў некалькі разоў, таму ўлады вырашылі перавесьці сьвятара ў вясковую парафію на поўначы. Бараніць сьвятара 15 сьнежня сабралася паўтары тысячы чалавек. На наступны дзень да вугорцаў далучыліся этнічныя румыны. Улады паспрабавалі запалохаць дэманстрантаў вадамётамі, аднак людзі крычаць у адказ: «Не разыдземся», «Хлеба» і... «Далоў дыктатуру Чаўшэску».



Каб Альбэрта Фухіморы своечасова сышоў, ён мог бы ўвайсьці ў гісторыю Пэру як прэзыдэнт-рэфарматар.

Калі ноччу 17 сьнежня Токешы арыштавалі, маніфэстанты штурмам узялі будынак міліцыі. 20 сьнежня застрайкавала ўся Тымішаара.

21 сьнежня ў Бухарэсьце наладзілі дэманстрацыю «Народ Румыніі супраць вандалаў з Тымішаары». Мітынг спачатку праходзіў паводле сцэнара. Прамова Чаўшэску перарывалася авацыямі. Аднак у натоўпе знайшоўся адзін чалавек, які, ня маючы, як выказаць свой пратэст, зьняў з нагі бот і, выкрыкнуўшы лёзунг супраць Чаўшэску, шпурнуў яго ў накірунку трыбуны. І сцэнар уладаў пачаў развальвацца. Рабочыя спачатку ў гэтым кутку плошчы, а пасьля ўсьцяж пачалі кідаць пад ногі партрэты кандукатара і ўлюлюканьнем перарвалі ягоную прамову. Мітынг трансьляваўся па тэлевізіі, і ўся Румынія ў жывым этэры пабачыла шок на твары дыктатара.

Дэманстранты разышліся па вуліцах з заклікам зрынуць дыктатуру. Невядомыя людзі —спачатку меркавалася, што гэта былі агенты румынскага ГБ, «Сэкурытатэ» — ужылі супраць маніфэстантаў зброю. Стралялі з дахаў і гарышчаў. 1100 чалавек загінулі (зь іх — 206 вайскоўцаў, якія перайшлі на бок народу), 2500 былі параненыя, але народнае паўстаньне было не спыніць.

Тут на палітычную арэну выйшаў Іён Іліеску, колішні фаварыт Чаўшэску. Іліеску ўзначаліў Фронт нацыянальнага вызваленьня. Чаўшэску, які пракіраваў краінай 24 гады, арыштавалі 23 сьнежня. «Карпацкага генія» абвінавацілі ў прывядзеньні краіны да заняпаду і злачынствах супраць свайго народу і празь некалькі гадзін разам з жонкай расстралялі. Кажуць, каб ніхто не даведаўся, што насамрэч адбылося ў калідорах улады 20—22 сьнежня.

## Дамінікана: Трухільё забілі паплечнікі

Іншы жорсткі і эксцэнтрычны дыктатар кіраваў сваёй краінай яшчэ даўжэй. Рафаэль Леанідас Трухільё стаяў на чале Дамініканскай Рэспублікі 31 год. То быў чалавек свайго часу — гітлерска-сталінскага.

Цягам двух дзесяцігодзьдзяў усе спробы апазыцыі зрынуць рэжым былі беспасьпяховыя. Урэшце тое, што не ўдалося апазыцыі, зрабілі сябры Трухільё. 30 траўня 1961 г. Трухільё быў забіты пяцьцю чалавекамі з найбліжэйшага атачэньня дыктатара.




Аўтамабіль дамініканскага дыктатара Трухільё, расстраляны змоўшчыкамі-паплечнікамі.

## Чылі: перамога паводле правілаў рэжыму

Эканоміка Чылі працвітала, і колькасьць удзельнікаў маніфэстацый пратэсту рэзка ўпала. Здавалася, што ў 1988 г. Аўгуста Пінач эт выйграе плебісцыт аб падаўжэньні сваіх паўнамоцтваў. Апазыцыя прыняла правілы хунты, кінуўшы ўсе сілы на падрыхтоўку да рэфэрэндуму. Нават камуністы, адкі-



Мікалае Чаўшэску ўцёк на верталёце з урачыстага мітынгу, што перарос у рэвалюцыю.



Каб адцягнуць увагу ад унутраных праблемаў, аргентынская хунта ўвязалася ў ваенную авантуру на Фалклэндах.

нуўшы ідэю народнага паўстаньня, прымкнулі да апазыцыйнага блёку.

Апазыцыя разгарнула кампанію пад лёзунгам «Не!» (слоган «Не — дыктатуры» ўжываць не было магчымасьці). Ходзячы ад кватэры да кватэры, выяжджаючы ў самыя аддаленыя вёскі, грамадзянаў пераконвалі, што трэба пераадолець страх і пайсьці на выбары. Згодна з заканадаўствам, для галасаваньня неабходна ўнесьці зьвесткі пра сябе ў выбарчыя сьпісы. Знакам кампаніі стала вясёлка, што сымбалізавала ўвесь спэктар палітычных партый і радасьць жыцьця.

У выніку 8 кастрычніка 1988 г. 54,6% чылійцаў прагаласавалі супраць падаўжэньня паўнамоцтваў Пінaçэта. Шакаваны вынікамі генэрал вырашыў не парушаць канстытуцыі.

## Перамагаючы страх

Падзеньню аргентынскай дыктатуры паспрыяў эканамічны крызіс пачатку 1980-х. Насуперак страху ў краіне аднавіліся дэманстрацыі пратэсту. Адны пратэставалі супраць росту цэнаў ды беспрацоўя. Іншыя — супраць парушэньня правоў чалавека. Сваякі зьніклых — найперш маткі — зьбіраліся ў Буэнас-Айрэсе, выходзілі на дэманстрацыі з заклеенымі ртамі.

Каб адцягнуць увагу, наступнік Відэлі генэрал Леапольда Гальтыеры ўвязаўся ў ваенную авантуру на Фалклэндах. І папулярнасьці ў народзе не здабыў, і гучную паразу ад брытанцаў пацярпеў. Гальтыеры перадаў уладу генэралу Рэйнальда Біньёнэ. Каб унікнуць народнага паўстаньня, Біньёнэ прыйшлося перадаць уладу выбранаму ўраду. Праўда, хунта таксама выдала закон аб амністыі, што вызваляў ваенных і паліцэйскіх ад адказнасьці за злачынствы, учыненыя ў 1976—1983 г.

Выбарчая кампанія зьвялася да барацьбы паміж лідэрамі асноўных дэмакратычных палітычных партый (так, магчыма, і ў нас некалі будзе).

На выбарах перамог лідэр Радыкальнай партыі Р.Альфансін. Паводле першага ягонага ўказу, генэралы Відэля, Віёля, Гальтыеры, Біньёнэ і іх паплечнікі былі арыштаваныя, а старэйшым афіцэрам было «прапанавана» падаць у адстаўку.

## Антыбайкот па-пэруанску

Каб нашчадак японскіх эмігрантаў Альбэрта Фухіморы своечасова сышоў, ён мог бы ўвайсьці ў гісторыю Пэру як прэзыдэнт-рэфарматар. Фухіморы перамог тэрарыстаў з групоўкі «Тупак Амару», інфляцыю, прыцягнуў у краіну інвэстыцыі. Аднак аднaчасова разагнаў парлямэнт, зьнішчыў незалежнае судаводзтва, неаднаразова перапісваў канстытуцыю ды перасьледаваў апазыцыю. У 2000 г. Фухіморы заманілася насуперак канстытуцыі балятавацца на трэці тэрмін, хоць прынятая ім жа канстытуцыя гэта забараняла. Выхад быў геніяльны: балятавацца можна, бо першы раз яго выбіралі па старой канстытуцыі.

Сацапытаньні прагназавалі Фухіморы ўпэўненую перамогу. Аднак адбыўся цуд. У першым туры прэзыдэнт ня змог сабраць 50% галасоў, а перад другім турам адзіны кандыдат ад аб'яднанай апазыцыі, доктар эканомікі Алехандра Таледа, з увагі на шматлікія фальсыфікацыі зьняў сваю кандыдатуру.

Фармальна Фухіморы перамог (ён застаўся адзін у выбарчым бюлетэні). Аднак трацiна бюлетэняў у скрынях была перакрэсьлена і ўпрыгожана надпісамі «Не — круцельству». Яшчэ 16% выбарцаў прагаласавалі за Таледа. Фухіморы сышоў у адстаўку праз паўгоду, у лістападзе 2000 г. Пасьля выбарчага фарсу легенда пра «аўтара пэруанскага цуду» разьвеялася, а рэйтынг паляцеў уніз. Каб унікнуць найгоршага, Фухіморы палічыў за лепшае сысьці.

Адстаўка Фухіморы была незвычайная. Падчас візыту ў Японію Фухіморы патэлефанаваў у Ліму прэм'ер-міністру ды паведаміў пра рашэньне.

Кожная дэмакратыя працуе аднолькава, кожная дыктатура падае па-свойму. Недзе, як у Чылі, яе скончылі выбары і рэфэрэндум, дзесь — Грэцыя, Аргентына — адыгрывалі значэньне міжнародныя фактары ды кепскае эканамічнае становішча. У Дамініканскай Рэспубліцы і Румыніі дыктатара чакаў жорсткі фінал. Але амаль паўсюль перадумовай было прасьвятленьне народу і падзеньне папулярнасьці дыктатара.

Ва Ўкраіне ўвосень 2004 г. палітолягі-інтэлектуалы былі настроеныя больш чым пэсымістычна. Але насуперак усім абставінам украінцы нечакана выйшлі на плошчу і адстаялі сваю перамогу.

**Алег Раявец**

# Новыя кнігі Разанава

У выдавецтве «Логвінаў» выйшлі «Кніга ўзнаўленьняў» і зборнік «Лясная дарога».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На фоне белага квадрату з чырвоным яйкам Алесь Разанаў чытаў свае вершы й пераклады. У менскай кавярні «Добрыя мыслі» 3 студзеня прайшла прэзэнтацыя «Кнігі ўзнаўленьняў» і зборніка «Лясная дарога».

Да прэзэнтацыі падрыхтавалі выставу «Яйкаквадратаў» — гэта артэфакты, створаныя А.Разанавым і мастаком Віктарам Маркаўцом. «Яйкаквадратамі» пазначаныя і новыя кнігі Разанава. На кожнай кнізе — новы твор. «Кніга ўзнаўленьняў» мае на вокладцы белае яйка ў чорным квадраце. Другая — чырвонае яйка ў белым квадраце. Наступнымі яйкаквадратамі будуць пазначаныя далейшыя кнігі сэрыі.

Разанаў кажа, што гэта будуць «і паэмы, і пункціры, і яшчэ нешта». Увойдуць творы, напісаныя ў Беларусі і Нямеччыне. «Можна было б укласьці ўсё ў адну кнігу, але яны самі захацелі ўкласьціся пластамі. Думаю, гэта правільны ход», — кажа паэт.

У першы зборнік увайшлі пераклады твораў Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Язэпа Руцкага, Мялета Смятрыцкага, Лява Сапегі ды інш. Большасьць друкавалася ў «Крыніцы». Паэт зазначыў, што ўсе аўтары складаюць наш кніжны эпас, таму кнігу ня варта лічыць скончанай. І з гэтага гледзішча кнігу лепш чытаць у адваротным храналягічным парадку, акунаючыся ўсё глыбей у беларускі Космас.

Разанаў распавёў, што перакладамі Скарынавых тэкстаў заняўся пры канцы 1980-х: «Я паклаў пераклады ў шуфляду, а яны не старэлі, а толькі маладзелі. І ў наш пакручасты час станавіліся ўсё больш сучаснымі». На творы Кірылы Транквіліёна ягоную ўвагу зьвярнуў літаратуразнаўца Іван Саверчанка. «Я нідзе болей не сустракаў такіх пранікнёных словаў пра зямное і вечнае», — прызнаўся Разанаў, чытаючы гэтага барочнага аўтара.

Доктарка багаслоўя Ірына Дубянецкая сказала: «Функцыю багаслоўскай і філязофскай школаў у Беларусі ўзяла на сябе паэзія, асабліва ў XX стагодзьдзі».

**Адам Воршыч**

# «Вялес» дастанецца Дубаўцу?

Абвешчаны шорт-ліст літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес», якую прысуджае Таварыства вольных літаратараў. У яго ўвайшлі эсэістыка Сяргея Дубаўца «Вострая Брама» і Вінцэся Мудрова «Ператвораныя ў попел», проза Югасі Каляды «Галоўная памылка Афанасія» і Алеся Наварыча «Літоўскі воўк», паэзія Натальлі Кучмель «Імгненьні».

Лідэр ТВЛ Алесь Аркуш кажа, што прэмія «Гліняны Вялес» становіцца ўсё больш кансэрватыўнай, схільнай да «даспелых» кніжак. Так, у шорт-ліст ня трапіў зборнік вершаў Вальжыны Морт «Я тоненькая, як твае вейкі».

**АВ**

# «IQ–48»: Цемра сьвятла ня згасіць!

У «Тузіне гітоў» перамагла новая песьня «IQ-48» на верш клясыка беларускай песьні Міхала Анемпадыстава «Сьвятло ў цемры». Яе запісалі ў Беластоку для складанкі А.Памідорава «Дыхаць!». Прадусэр заўважыў, што «Сьвятло» — галоўны гіт кружэлкі.

Міхал Анемпадыстаў **(на фота)** наведаў летась канцэрт «IQ-48» у «Рэактары», а праз некалькі дзён прапанаваў новы верш музыкам. «Песьня пазытыўная і аптымістычная, — кажа вакаліст «ай-к'ю» Саша Ракавец, — яна нам пакаціла».

Песьня набрала ў слухачоў гіт-параду 495 галасоў. Гэта рэкорд музычнага сэзону «ТГ».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Цяпер «IQ-48» працуе над новым гітом — песьняй «Ляцець на ўсход», зробленай у дуэце з Алесем Лютычам — вакалістам «:B:N:».

**SB**

## «ТУЗІН ГІТОЎ»

**www.music.fromby.net**
7-мы (41) тур. 2—15 сьнежня

1. «IQ–48». «Сьвятло ў цемры» — 495.
2. «Глюкі». «Ападкі» — 390.
3. «Зьмяя». «Чукча» — 369.
4. «Сьцяна». «Можна быць» — 392.
5. «Tav.Mauzer». «Брудная вада» — 291.
6. «Беларускія песьняры». «Вочы цёмна-сінія» — 249.
7. «Палац». «Праваджала маці сына» — 248.
8. «Айша». «Зь верай» — 242.
9. «Žygimont VAZA». «ContraБанда» — 242.
10. Вайцюшкевіч і «WZ–Orkiestra». «Сьвята ў вёсцы» — 239.
11. Pomidor/off. «Шабаны» — 192.
12. «Шляхта». «Менск–city» — 108.

Вынікі туру камэнтуе Віталь Драздоў, дырэктар ТА «Дзеці Сонца» і праграмны дырэктар «Гіт–ФМ» (Украіна). Праслухаць песьні можна ў Інтэрнэце на сайце «Тузін гітоў» і ў этэры штопятніцу на хвалях радыё «Менск» (92,4 FM) у 23.00 у праграме «Тузін гітоў з Алегам Хаменкам».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

20 сьнежня адбылася прэм'ера спэктаклю Свабоднага тэатру «Тэхніка дыханьня ў беспаветранай прасторы» Натальлі Мошынай у пастаноўцы Ўладзімера Шчэрбаня. П'есу змагла ўбачыць даволі вялікая колькасьць гледачоў: за вечар артысты паказалі спэктакль двойчы. Гэта трэцяя пастаноўка Свабоднага тэатру пасьля «Псыхозу» і «4.48». Спэктаклі праходзяць у прыватнай кватэры.



# Брытанскі гурт «Belarus»

парауноўваюць з «Radiohead». Праўда, ён ня мае ніякага дачыненьня да нашай краіны. Гітарыст **Мэт Кілфард** расказвае пра «Belarus» для «НН».

— Я працаваў у гітарнай краме «Кемптэрз», Лі часта заходзіў, і мы падоўгу гутарылі пра музыку. Дэйв Карыган далучыўся да нас як басіст. Ён граў з намі да мінулага году, покуль ня вырашыў сысьці. Яго вабілі падарожжы. Менавіта мы ўтрох сфармавалі гурт «Spacehopper». Марцін прыйшоў праз два гады, Рыч — у якасьці бубнача, вызваліўшы ад гэтай ролі Лі, якому даводзілася быць бубначом і сьпеваком адначасова. Лі стаў нашым фронтмэнам, зьмяніўшы бубны на гітару. Гэта дазволіла нам зрабіць насычаным гук. Мы зьмянілі назву на «Belarus» — узьніклі праблемы зь мінулым лэйблам.

**— Чаму «Belarus»?**

— Мы проста выбіралі назвы са сьпісу і ніколі па-сапраўднаму гэта не абдумвалі — проста палюбілася слова «Belarus». Але цяпер мы куды больш ведаем пра гэту краіну, ейны народ, прачытаўшы шмат артыкулаў у Інтэрнэце. Да таго ж Аляксандар Глеб тут гуляе за «Арсэнал».

**— Якія вашыя музычныя зацікаўленьні? Што ты слухаеш апошнім часам?**

— Мы ўсе слухаем багата розных музычных стыляў і заўжды абменьваемся кружэлкамі новых цікавых гуртоў, якія знаходзім.

**— Раскажы больш пра альбом «Communicate».**

— Альбом выйдзе ўвесну. На дыску будзе 11 трэкаў, некаторыя гучаць, як сапраўдныя гімны. З намі граў струнны квартэт на трох трэках. Проста адлёт! Альбом адлюстроўвае тое, чым мы цяпер ёсьць як гурт. Мы шмат экспэрымэнтавалі, ужывалі мілагучныя гітарныя рыфы, узмацняльнікі, клявішныя. Людзі кажуць, што мы ствараем эпічную музыку, таму што мы робім сапраўдны аркестравы гук на сцэне. Гэты тэрмін не зьвязаны зь лірыкай, а хутчэй з мэлёдыкай і гучаньнем.

**— Якія канцэрты вы плянуеце за межамі Каралеўства? Ці хацелі б выступіць у Беларусі?**

— Я думаю, што любы гурт з радасьцю выступаў бы ў розных краінах.

**— Якія-небудзь фінальныя словы нашым беларускім чытачам, сярод якіх, магчыма, зьявяцца і вашыя фэны?**

— Перш за ўсё вясёлых Калядаў і з Новым годам! And rock on!..

**Гутарыў Андрусь Храпавіцкі**

**Гурт складаецца зь Лі Алдэра (вакал, гітара), Мэта Кілфарда (гітара), Рычарда Войса (бас), Мартына Таўнсэнда (клявішы) і Рычарда Міліна (бубны). Крытыкі параўноўваюць «Belarus» з «Radiohead». У 2006 гурт выпусьціць першы поўнафарматны альбом «Communicate».**

...проста палюбілася слова «Belarus».



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**Расея. Бэнзольная пляма на Амуры дасягнула Хабараўску, парушыўшы водазабесьпячэньне гораду. Жыхары здабываюць яе з-пад 70-сантымэтровага лёду.**

# Вацлаў Станкевіч: Каму Беларусь дарагая, той ня будзе супраць дэмакратыі

*Хто б іх ні выйграў у 2006-м, яго не прызнаюць, мяркуе літоўскі парлямэнтар-беларус.*

Сярод літоўскіх парлямэнтароў найдаўжэйшы час беларускім пытаньнем займаецца Вацлаў Станкевіч. Ён паходзіць з роду Станкевічаў, які даў Беларусі шмат вядомых дзеячаў. Другі тэрмін В.Станкевіч узначальвае ў парлямэнце Камітэт па справах NATO, а за працу па далучэньні краіны да альянсу быў узнагароджаны Вялікім крыжам Камандора Вітаўта Вялікага.

На пачатку лістапада В.Станкевіч выступіў з заявай аб неабходнасьці як мага хутчэй распачаць канкрэтную размову зь беларускімі прадстаўнікамі ў сувязі са становішчам краіны на міжнароднай арэне. Аб'ектам гэткай размовы мусяць быць два беларускія законы — пра выбары і СМІ, бязь зьмен у якіх беларускія кіраўнікі ня могуць быць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю. Прапанова В.Станкевіча мае яшчэ адзін акцэнт — далучыць да літоўска-беларускіх перагавораў і Расею, а далей гэтыя перамовы перанесьці на ўзровень эўрапейскіх структур — Эўразьвязу, Рады Эўропы і АБСЭ. «Нашы ўрады, — сказаў В.Станкевіч, — мусяць супрацоўнічаць, кажучы папросту, на поўную катушку. Дзякуючы гэтаму, пэўны, дэмакратызацыя ў Беларусі пачнецца нашмат хутчэй».

Тым часам у Беларусі адбыліся новыя зьмены — уведзены папраўкі ў Крымінальны кодэкс, якія яшчэ глыбей штурхаюць Беларусь да самаізаляцыі і яшчэ больш ускладняюць яе міжнародныя дачыненьні. «НН» прапанавала В.Станкевічу растлумачыць беларускай аўдыторыі, ці зьмянілася цяпер яго пазыцыя.

**«Наша Ніва»: Пра неабходнасьць весьці дыялёг зь беларускімі афіцыйнымі прадстаўнікамі Вы казалі на працягу некалькі гадоў. Але што Вы скажаце цяпер, пасьля ўнясеньня зьмен у Крымінальны кодэкс РБ?**

**Вацлаў Станкевіч:** Зьмены ў Крымінальны кодэкс, фармулёўкі пра «дыскрэдытацыю», «дэстабілізацыю» нясуць шкоду краіне, павялічваючы яе самаізаляцыю. Але я застаюся пры сваім. І суседнім краінам, і беларускім уладам, і апазыцыі трэба зразумець: Беларусь як мага хутчэй трэба выводзіць на міжнародную арэну. Таму як найхутчэй трэба зьмяніць законы пра выбары і СМІ — каб яны адпавядалі эўрастандартам. Толькі тады вынікі наступных выбараў будуць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю і Беларусь прызнаюць дзяржавай, якая ідзе па шляху дэмакратыі. Пры цяперашнім законе, хто б іх ні выйграў у 2006 г., прэзыдэнт ня будзе прызнаны міжнароднай супольнасьцю як дэмакратычна абраны. Не мяняць законаў, ня ўводзіць элемэнтаў дэмакратыі — гэта значыць узмацняць ізаляцыю сваёй краіны. Тое, што яны ня здольныя клапаціцца пра інтарэсы сваёй краіны. Краіна, якая самаізалюецца, ня мае будучыні.



PFOTO.IRS.IT

**Вацлаў Станкевіч** — літоўскі парлямэнтар-беларус. Паходзіць з роду Станкевічаў, які даў Беларусі шмат вядомых дзеячаў. Другі тэрмін узначальвае ў парлямэнце камітэт па справах NATO, а за працу па далучэньні краіны да альянсу быў узнагароджаны Вялікім крыжам Камандора Вітаўта Вялікага.

*Літва зацікаўлена, каб не Расея прадстаўляла Беларусь у эўрапейскіх структурах, а самі беларускія прадстаўнікі працавалі ва ўсіх галоўных эўрапейскіх інстытутах.*

**«НН»: Ёсьць іншы падыход у Літве: чым горшай будзе сытуацыя ў Беларусі ў выніку санкцый, тым хутчэй людзі зразумеюць сутнасьць рэжыму і паўстануць супраць яго.**

**ВС:** Я прапаноўваю эвалюцыйны шлях, але магчымы і рэвалюцыйны. Аднак я супраць рэвалюцый, прынамсі пакуль ня выкарыстаны ўсе магчымасьці эвалюцыйнага шляху. Я кажу аб праблеме самаізаляцыі Беларусі, а не пра самаізаляцыю Лукашэнкі. Трэба тлумачыць, можа, не самому Лукашэнку, а яго міністрам, рэгіянальным кіраўнікам, і такім чынам спрабаваць эвалюцыйным шляхам ініцыяваць зьмены да лепшага. Ня варта спадзявацца на нейкі цуд, а падрыхтавацца да доўгае працы.

**«НН»: Літоўскія палітыкі досыць рэзка камэнтуюць увядзеньне рэпрэсіўнага заканадаўства ў Беларусі, кажучы пра вяртаньне сталінскіх часоў. І ў той жа час Літва мае шматлікія кантакты зь Беларусьсю на ўзроўні міністэрстваў. Выглядае, што ва ўсіх сваіх кантактах краіна найперш кіруецца эканамічнымі інтарэсамі?**

**ВС:** Эканамічныя кантакты трэба разглядаць асобна ад палітычных. Палітыка — гэта палітыка. Нягледзячы

на эканамічныя кантакты Літва ня можа адступіцца ад сваіх дэмакратычных каштоўнасьцяў. Мы — суседзі, мы нікуды адно ад аднога не падзенемся, незалежна ад таго, ці будзем мы разам у Эўразьвязе і ў NATO, ці не.

**«НН»: У часе візыту ў Нямеччыну В.Адамкус зрабіў рэзкія заявы наконт Беларусі, у прыватнасьці, што «не выключае магчымасьці нападу войскаў Лукашэнкі на маленькую балтыйскую краіну». Магчыма, прэзыдэнт агучыў патаемныя страхі Літвы?**

**ВС:** Я ня веру, што нехта ў Літве глядзіць на Беларусь як на нейкага ворага. Апрача таго, Літва — сябар NATO. Напасьці на Літву — значыць напасьці на NATO. Зь іншага боку, мы ўвесь час забываемся, што Беларусь зьяўляецца партнэрам NATO па шэрагу праграм. Я, калі бываю ў арганізацыях NATO ў Брусэлі, заўсёды пытаюся ў генэралаў альянсу, як яны расцэньваюць партнэрства зь Беларусьсю. Высокія прадстаўнікі NATO зазначаюць, што Беларусь выконвае свае абавязкі ў праграме «Партнэрства дзеля міру». Можна прывесьці яшчэ і шмат іншых аргумэнтаў на карысьць таго, што цяперашняя Беларусь — ня тая краіна, якая будзе пасылаць свае танкі на Вільню.

**«НН»: У Літве некаторыя палітыкі (напр. В.Ландсбэргіс) заяўляюць, што менавіта размовы пра магчымасьць кантактаў зь беларускімі ўладамі паспрыялі новым крокам да ўзмацненьня дыктатуры. Ці ня лье Ваша прапанова ваду на млын дыктатуры? Ці Вы ўсё яшчэ спадзеяцеся, што любы кіраўнік можа зразумець, што нельга гэтак шкодзіць сваёй краіне?**

**ВС:** Калі для кіраўніка Беларусі і яго вэртыкалі дарагія ня толькі іх пасады, але й дарагая Беларусь і яе народ — крокі па ўвядзеньні дэмакратычных элемэнтаў у жыцьцё краіны абавязкова трэба пачынаць. Калі афіцыйныя ўлады гэтага не пачнуць рабіць, кожнаму стане зразумела — ім ня рупіць Беларусь і яе будучыня. Тады афіцыйны Менск ня зможа сказаць беларускаму народу — бачыце, з намі не жадаюць размаўляць. Сёньня яшчэ магчыма перадолець сьцяну недаверу паміж афіцыйным Менскам і Захадам. Таму і прапаную — давайце сядзем і пагаворым. Мы не рыхтуем ніякіх пераваротаў, мы не зьбіраемся ўплываць на тое, каму быць наступным прэзыдэнтам Беларусі. Хто будзе прэзыдэнтам, скажа беларускі народ. Мы мусім пагаварыць пра будучыню Беларусі. Каб беларускае грамадзтва заняло дастойнае месца ў Эўропе, якога яно насамрэч вартае. А цяпер Беларусь нібы белая пляма у Эўропе — вось у чым бяда.

**«НН»: Што беларусу Станкевічу са знанага роду Станкевічаў баліць за Беларусь, ня дзіўна. Але што ад гэтага мае літоўскі палітык, Літва?**

**ВС:** Наадварот, афіцыйная Літва зацікаўлена ў тым, каб Беларусь была на ўсіх ўзроўнях, каб Беларусь прысутнічала на міжнароднай арэне. Каб яе не Расея прадстаўляла ў эўрапейскіх структурах, а самі беларускія прадстаўнікі працавалі ва ўсіх галоўных эўрапейскіх інстытутах, і Беларусь магла гаварыць сама за сябе. Для Літвы важна, каб Беларусь засталася самастойнай краінай са сваёй мовай, сваёй нацыянальнай культурай. І я гэтага хачу — і як беларус, і як грамадзянін Літвы.

**Гутарыла
Тацяна Поклад,
Вільня**

## СЛУХАЙЦЕ РАДЫЁ «ПАЛЁНІЯ»

### «Чалавек году» ў Польшчы

Траціна апытаных палякаў лічыць, што папа рымскі Ян Павал II заслугоўвае тытул «Чалавек году». У ацэнцы рэспандэнтаў Цэнтру дасьледаваньня грамадзкай думкі й рынку «Pentor» папа ў найбольшай ступені паўплываў на рэчаіснасьць Польшчы.

«У найбліжэйшыя гады мы будзем мець праблему, бо гэта была асоба, на якую заўсёды можна было спаслацца і якая выклікала найменш сумневаў. Гаворка ідзе пра тое, што калі на ўнутраным «рынку» не было адпаведнай асобы, то заўсёды можна было спаслацца на выдатнага суайчыньніка», — заявіў Ежы Глушыньскі з цэнтру «Pentor».

13% апытаных ня здолелі назваць асобы, якая заслугоўвае тытулу «Чалавек году». На думку 9%, згаданы тытул павінен атрымаць прэзыдэнт Аляксандар Квасьнеўскі. На наступных месцах таксама апынуліся палітыкі — новы прэзыдэнт Лех Качыньскі, Анджэй Лепэр, Дональд Туск й Казімеж Марцінкевіч.

### Валэнса раскрытыкаваў прэзыдэнцтва Квасьнеўскага

Лех Валэнса адмоўна ацаніў дзесяць гадоў прэзыдэнцтва Аляксандра Квасьнеўскага, што здаў паўнамоцтвы пры канцы сьнежня. Паводле Валэнсы, Квасьнеўскі ня вырашыў найважнейшых праблем дзяржавы. «Ён толькі спрытна, прыгожа, ветліва й кампрамісна адміністраваў... Але нічога для Польшчы не зрабіў. Галеча ўсё расла, падобна як і колькасьць праблем. Квасьнеўскі ня мог нічога з гэтым зрабіць, бо ён ня меў аргумэнтаў», — кажа першы прэзыдэнт Трэцяй Рэчы Паспалітай. Паводле яго, цяжка назваць заслугай А.Квасьнеўскага ўступленьне Польшчы ў NATO й Эўразьвяз, бо гэтыя працэсы пачаліся яшчэ перад пачаткам тэрміну ягоных прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў.

Л.Валэнса лічыць, што цяпер Квасьнеўскі мусіць зьнікнуць з польскай палітычнай сцэны, бо ў дачыненьні да ягонай асобы могуць зьявіцца нязручныя пытаньні.

### Сьведка знайшоўся

Былы дырэктар гданьскай суднавэрфі Клемэнс Гнех даў паказаньні ў працэсе забойстваў рабочых на Балтыйскім узьбярэжжы ў сьнежні 1970 г. На лаве падсудных знаходзяцца сем чалавек, якіх абвінавачваюць у кіраваньні дзеяньнямі паліцыі й войска, — у тым ліку тагачасны кіраўнік Міністэрства абароны Войцех Ярузэльскі й віцэ-прэм'ер Станіслаў Кацёлак.

К.Гнех зьяўляецца адным з найважнейшых сьведкаў. У ліпені 2005 г., праз 35 гадоў ад трагічных падзей на ўзьбярэжжы, у адным з інтэрвію ён сказаў, што ў сьнежні 1970 г. чуў, як былы віцэ-прэм'ер С.Кацёлак выказаў згоду страляць па рабочых вэрфі.

**Паводле Беларускай
службы радыё
«Палёнія».**

# 2006

## Студзень
**1** — Новы год.
**6** — Сьвята Трох Каралёў у каталікоў.
**7** — Нараджэньне Хрыстова ў праваслаўных.
**10** — Курбан-байрам у мусульман.
**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.
**31** — Новы, 1427-мы год у мусульман.

## Люты
**2** — Грамніцы ў каталікоў.
**4** — 75 гадоў з дня сьмерці гісторыка Ўсевалада Ігнатоўскага, першага прэзыдэнта Акадэміі навук Беларусі (1881—1931). Ён застрэліўся, каб унікнуць арышту саветамі.
**15** — Грамніцы ў праваслаўных.
**17** — 200 гадоў таму (1806) нарадзіўся заснавальнік беларускай археалёгіі Канстанцін Тышкевіч.

## Сакавік
**1** — Папяльцовая серада ў каталікоў.
**1** — 125 гадоў з дня забойства цара Аляксандра II беларускім нарадавольцам Ігнатам Грынявіцкім (1881).
**4** — 50 гадоў таму ў Беластоку пачала выходзіць газэта «Ніва» (1956).
**11** — 100 гадоў таму (1906) у Менску павешаны Іван Пуліхаў
**19** — 75 гадоў з дня нараджэньня літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва (1931).
**19** — прэзыдэнцкія выбары.
**25** — Дзень Волі.
**25** — Зьвеставаньне ў каталікоў.

## Красавік
**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.
**9** — Пальмавая нядзеля ў каталікоў.



нараджэньня галяндзкага мастака Рэмбранта (1606—1669).
**26** — 150 гадоў з дня нараджэньня драматурга Джорджа Бэрнарда Шоў (1856—1950).
**27** — Дзень Незалежнасьці ў гонар прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусі.

## Жнівень
**5** — 500 гадоў Клецкай бітвы. Войска ВКЛ на чале з Станіславам Кішкам і Міхаілам Глінскім разьбіла ўшчэнт татараў.
**13** — 50 гадоў таму памёр Якуб Колас.
**15** — Прачыстая ў каталікоў.
**15** — 175 гадоў з дня нараджэньня паэта й журналіста Вінцэся Каратынскага (1831—1891), сакратара Ўладзіслава Сыракомлі.
**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.
**28** — Прачыстая ў праваслаўных.
**29** — 250 гадоў таму нарадзіўся астраном Ян Сьнядэцкі.

## Верасень
**1** — 100 гадоў таму ў Вільні выйшла першая легальная беларуская газэта «Наша доля» (1906).
**6** — 400 гадоў таму (1654) памёр Пілiп Абуховіч, ваявода віленскі і смаленскі, пісар літоўскі. Кіраваў абаронай Смаленску ў 1654 г.
**24** — пачатак Рамазану ў мусульман.
**30** — Рош-Ашонэ (Новы год) у юдэяў.
**30** — 75 гадоў з дня нараджэньня народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча (1931).

## Кастрычнік
**14** — Пакроў у праваслаўных.

**11** — Дзень нараджэньня прарока Мухамада ў мусульман.
**13** — Пэсах у габрэяў.
**16** — Вялікдзень у каталікоў і пратэстантаў.
**16** — Вербная нядзеля ў праваслаўных.
**19** — 125 гадоў з дня нараджэньня Ўсевалада Ігнатоўскага.
**23** — Вялікдзень у праваслаўных.
**29** — 75 гадоў з дня сьмерці акадэміка Яўхіма Карскага (1861—1931).
**30** — 125 гадоў таму (1881) нарадзіўся паэт Янка Журба.

**Травень**
**1** — Дзень працы.
**2** — Радаўніца.
**9** — Дзень Перамогі над нацызмам.
**25** — Ушэсьце ў каталікоў.

**Чэрвень**
**1** — Ушэсьце ў праваслаўных.
**4** — Сёмуха ў каталікоў.
**9** — 125 гадоў з дня нараджэньня пачынальніка беларускага нацыянальнага руху Івана Луцкевіча (1881—1919).
**11** — Сёмуха ў праваслаўных.
**18** — 175 гадоў таму (1831) нарадзіўся рэвалюцыянэр Міхал Валовіч.
**20** — 400 гадоў таму пачалося мяшчанскае паўстаньне пад кіраўніцтвам Стахора Мітковіча ў Магілеве (1606).
**23** — Купальле.
**24** — Сьвяты Ян у каталікоў.
**29** — Сьвятыя Пятро і Павал у каталікоў.

**Ліпень**
**7** — Іван у праваслаўных.
**12** — Сьвятыя Пятро і Павал у праваслаўных.
**15** — Дзень Грунвальдзкае бітвы.
**15** — 400 гадоў з дня

## Студзень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | **1** |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** | **8** |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** | **15** |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | **21** | **22** |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | **28** | **29** |
| 30 | 31 | | | | | |

## Люты

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | **4** | **5** |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **11** | **12** |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | **18** | **19** |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | **25** | **26** |
| 27 | 28 | | | | | |

## Сакавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | **4** | **5** |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **11** | **12** |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | **18** | **19** |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | **25** | **26** |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

## Красавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |

## Травень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | **6** | **7** |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | **13** | **14** |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | **20** | **21** |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | **27** | **28** |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

## Чэрвень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

## Ліпень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |
| 31 | | | | | | |

## Жнівень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | **5** | **6** |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | **12** | **13** |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | **19** | **20** |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | **27** |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

## Верасень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **2** | **3** |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | **9** | **10** |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | **16** | **17** |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | **23** | **24** |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | **30** | |

## Кастрычнік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | **1** |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** | **8** |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** | **15** |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | **21** | **22** |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | **28** | **29** |
| 30 | 31 | | | | | |

## Лістапад

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | **4** | **5** |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **11** | **12** |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | **18** | **19** |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | **25** | **26** |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

## Сьнежань

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **2** | **3** |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | **9** | **10** |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | **16** | **17** |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | **23** | **24** |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | **30** | **31** |

**Лістапад**
**2** — Дзяды.
**18** — 75 гадоў з дня нараджэньня паэта Анатоля Вярцінскага (1931).
**23** — 100 гадоў з дня выхаду першага нумару «Нашай Нівы» (1906).
**27** — Дзень Герояў (Дзень Слуцкага збройнага чыну).

**Сьнежань**
**10** — Дзень правоў чалавека.
**15** — Ханука ў юдэяў.
**23** — 175 гадоў таму (1831) загінула Эмілія Плятэр.
**25** — Божае нараджэньне ў каталікоў.

## Юбілеі году

**1581** — Пінск атрымаў герб.
**1581** — заснаваньне ў Полацку езуіцкага калегіюму.
**1631** — заснаваны праваслаўны Куцеінскі манастыр пад Воршай.
**1881** — у Менску створана падпольная друкарня народніцкай арганізацыі «Чорны перадзел».
**1881** — у Пецярбурскім унівэрсытэце створана нелегальнае беларускае студэнцкае зямляцтва.
**1906** — нарадзіліся паэты Андрэй Александровіч, Сяргей Новік–Пяюн, гісторык Аляксандра Бэргман.
**Травень 1906** — у Пецярбургу заснавана выдавецкая суполка «Загляне сонца і ў наша аконца».
**1931** — у Вільні Рыгор Шырма заснаваў хор Беларускага саюзу студэнтаў.
**1931** — Антон Луцкевіч і Лукаш Дзекуць–Малей выдрукавалі поўную вэрсію Новага Запавету.

Шаноўныя нашаніўцы! Сардэчна віншую вас з Новым годам! Няхай у 2006 г. «Наша Ніва» вернецца ў каталёгі.

**Адам Мальдзіс, Менск**

Вы мужныя людзі, дзякуй вам.

**Раман Малаховіч, інвалід II групы, Менск**

Трымайцеся, браты. Жыве Беларусь!

**Алена Карп, Менск**

Трымайцеся, нас чакаюць перамены! Нашымі супольнымі намаганьнямі пераможам.

**Маргарыта Верамейчык, Менск**

Сардэчна віншую з Новым годам, з Калядамі! Здароў'я, шчасьця і дабрабыту вам і вашым сем'ям! Няхай усё ліхое застанецца ў адыходзячым годзе, а новы год дасьць надзею на годнае жыцьцё ў вольнай Беларусі!

**Леанід Гаравы, Гарадок**

Шаноўны пане рэдактар! Зычу, каб Вам хапіла сілаў, сродкаў і вытрымкі, каб у цяжкім наступным годзе ўтрымаць газэту на ўзроўні, ня страціць шмат старых і прыдбаць яшчэ новых падпісчыкаў. Сардэчна вітаю і зь нецярплівасьцю чакаю чарговага нумару.

**Эльжбета Смулкова, Варшава**

Шчыра зычу вам вясёлых сьвятаў, а таксама здароўя, аптымізму, надзеі на лепшае, дабрабыту і плённай працы ў 2006 годзе. З павагай і ўдзячнасьцю за вашу працу,

**Марына Ўласава, Менск**

Z Novym Hodam, z Kaladami — Ŭvierchu da nizu pakrytymi иakaladami!

**Iłona j Źmicier Saŭki, Miensk**

Зычу ўсім нашаніўцам здароўя, шчасьця і спор у справах. Я вас кахаю.

**Таіса Жарава, Менск**

Зразумела ж, з надыходзячымі сьвятамі — з Калядамі і Новым годам! Посьпехаў вам усім! Здароўя моцнага! Мужнасьці і ўдачы! Удача нам усім патрэбна.

**Дар'я Ліс, вёска Залесьсе (Смаргоншчына)**

Вельмішаноўная «Наша Ніва»! Сардэчна віншую з Калядамі і Новым годам. «Нашай Ніве» каласіцца!

**Антон Бубала, Верхнядзьвінск**

Віншую ўсіх вас з Новым годам і Раством Хрыстовым! І жадаем выдаваць газэту і ў Новым годзе! Бывайце здаровы!

**І.Раткевіч, Гародня**

Трымаймася разам!

**Янка з Гарадзеншчыны**

Мы пераможам!

**Андрэй Ерашкевіч, Горадня**

Трымайцеся! Нават пасьля самай цёмнай ночы прыходзіць сонечны ясны дзень. Мы пераможам. Жыве Беларусь! З надыходзячым Новым годам вас! Добрага здароўя вам і вашым блізкім і посьпехаў у вельмі цяжкай і адказнай працы.

**Васіль Бычык, Менск**

Мужнасьці ўсім нам і веры ў найлепшыя спадзяваньні людзей, не засьмечаных бацылай халопства і рудымэнтамі таталітарызму. Шчасьлівага Новага году.

**Уладзімер Каравацкі, Менск**

Віншую Вас са сьвятам Божага Нараджэньня і Новым годам! Жадаю мужнасьці, посьпехаў і вялікіх накладаў. Дзякую вам за вашую працу.

**Сяргей Пантус, Бярозаўка (Лідзкі р-н)**

Сардэчна віншуем! Мы пераможам!

**Юры Міхно, Стоўпцы**

Віншую з Нараджэньнем Хрыстовым і Новым Годам! Жадаю вам з дапамогай чытачоў пераадолець усе цяжкасьці, якія нам прыгатавала ўлада.

**Андрэй Роўбуць, Жодзіна**

Віншую ўсіх з Калядамі і Новым годам! Зычу здароўя, шчасьця, дабра, стойкасьці ў змаганьні за ідэі Адраджэньня.

**Юры Мянькоў, Баравая Буда, Кармянскі р-н**

Віншую рэдакцыю і карэспандэнтаў газэты з надыходам Калядаў і Новага году! Слоў павагі да газэты не пералічыць! Стаўшы чытачом газэты, зьмяніў свой сьветапогляд, што не дапамагае рабоце на дзяржпрацы. Чамусь ніколі не падпісваўся на газэту — прынцыпова набываў у розных кіёсках. Цяпер прынцыпы трэба мяняць. Жадаю і надалей чытаць «Нашу Ніву».

**Юрась Федзюковіч, Менск**

Прашу вас лічыць мяне падпісчыкам газэты «Наша Ніва» на 1-шы квартал 2006 г. Ахвяраваньне пералічыў праз «Беларусбанк» 16 сьнежня, бо ў гэты дзень я атрымліваю пэнсію (я інвалід 2-й групы зь дзяцінства). А вы ў далейшай абвестцы паведамце, ці трэба высылаць у адрас рэдакцыі квітанцыю. (Ня трэба, досыць пазначыць адрас на бланку ахвяраваньня, і ён нам прыйдзе. — **Рэд.**).

Дзякуй вам, што вы хвалюецеся пра нас і робіце ўсё магчымае, каб мы атрымалі сваю любую газэту, бо калі з майго жыцьця забраць «Нашу Ніву», мой сьвет значна паменшыцца, а цяперашнія ўлады лупяць па самым балючым месцы, яны жадаюць зрабіць нас глухімі і невідушчымі, карацей — быдлам. Каб мы толькі глядзелі тэлевізар і ведалі, як мы багата, хораша жывём. Але я лепей ведаю, як я жыву, а найболей гэта відаць, калі я саджуся абедаць або наведваю аптэку і не магу набыць сабе тыя лекі, якія мне лепей падыходзяць. Таму я тэлевізара амаль не гляджу — гэта скрыня для дурняў, якім падабаецца, як на экране выкручваюцца галапупыя безгалосыя бездары, што лічаць сябе зоркамі. Але «пройдзе і гэта», навала згіне, а ад вялікага да сьмешнага — адзін крок, як казаў Банапарт.

Шкада, што я гэтага ня ўбачу, у мяне двайны парок сэрца, і кожны дзень можа стаць апошнім.

Калі дзе якая памылка ў маім лісьце, дык выбачайце, бо я расеец, мову вывучаў па кнігах Караткевіча, Быкава, газэце «Наша Ніва», радыё «Свабода», а ў школе не вывучаў.

Удачы вам у такой патрэбнай справе! Беражы вас Бог! Жыве Беларусь!

**Уладзіслаў Хархардзін, Верхнядзьвінск**

## Ад Рэдакцыі

Дзякуй усім, хто павіншаваў «НН» з Калядамі. Ня можам і блізка выдрукаваць усе віншаваньні, бо гэтым разам, з нагоды падпіскі, прыйшлі іх сотні. Нашы чытачы выявілі сябе сапраўднымі грамадзянамі. З Новага году падпісчыкаў у газэты паболела на 320 (звесткі працягваюць паступаць). Суму ахвяраваньняў, якія прыйшлі на рахунак за сьнежань, і рэшту сьпісу ахвярадаўцаў выдрукуем у бліжэйшых нумарох.

## Дзякуй Уладзімеру Лобачу

за апавяданьне «Калядоўшчыкі». Даўно так добра не сьмяялася.

**Вікторыя Патулянец, Менск**

## Так і трэба

Напісаць ў газэту вымусіла радасная навіна. У Горадні нарэшце ў тралейбусах — аўтобусы пакуль расейскамоўныя — пачулася беларуская мова. Агучвае прыпынкі прыемны мужчынскі голас на добрай мове. Пры мне адны пасажыры хвалілі, адзін дзівіўся: «вот опять мова зазвучала». Адмоўнага пачуць не прыйшлося.

Калі я вяртаюся ў Горадню і еду ў свой мікрараён на «тралейбусе з магнітафонам», то адчуваю: я — дома, бо чую родную мову. Пра «беларускамоўнасьць» тралейбусаў гаворыць палова гораду. Нават далёкія ад вялікай і малой палітыкі людзі кажуць, што трэба, каб «усё было па-беларуску», асабліва ў заходнебеларускай Горадні. Усё залежыць ад нас...

**Рыгор Сімановіч, Горадня**

## Спэцмерапрыемства ў касьцёле

Увечары 25 сьнежня перад менскім касьцёлам Найсьвяцейшай Панны Марыі было шматлюдна. Аднак палову складалі людзі з рацыямі. Унутр храму нікога не прапускалі. Дзьверы катэдры прыкрывала некалькі ахоўнікаў. Яны тлумачылі парафіянам, што касьцёл будзе адкрыты і служба пачнецца сама меней праз гадзіну — спэцмерапрыемства. Разгадка была ў прыпаркаваным насупраць прэзыдэнцкім лімузіне зь вялікім чырвона-зялёным сьцягам.

**Дзяніс Тушынскі, Менск**

## Хай падпісваюцца

Заходжу на пошту ў цэнтры Менску. Стаіць чарга зь некалькіх міліцыянтаў. Божухна, ужо да пошты дабраліся. Але бачу, на нешта падпісваюцца. Цягну шыю — заглядаю аднаму цераз плячо. Ведамасная падпіска на газэту «На страже». Правільнае рашэньне з боку іхняга начальства. Колькі можна бясплатна грамадзкім транспартам езьдзіць, трэба і свае на нешта выдаткаваць.

**Янук М., Курасоўшчына, Менск**

## З фолькам варта інакш

26—27 лістапада ў Горадні прайшоў XI Гарадзкі фэстываль фальклёру. Мастацкія калектывы, вакальныя гурты школ, садкоў, каледжу мастацтваў, музычнай вучэльні, дому культуры дэманстравалі свае нумары. За два дні на сцэне ГДК адбылося больш як 50 выступленьняў.

Шкада толькі, што па колькасьці прысутных гледачоў была відаць «цікавасьць» сёньняшняга беларуса да такіх фэстаў. І гэта калі ўлічыць вольны ўваход ды выключыць удзельнікаў, якія часам заглядвалі, чакаючы свайго выступленьня…

**Воля Палуйчык, Горадня**

Апазыцыйны рух больш не магчымы. Надыходзіць час цьвёрдых у сваіх прынцыпах дысыдэнтаў.

# Стратэгія вастрыя і мэталу

Сытуацыя, у якой апынулася грамадзтва, сутнасна зводзіцца да банальнага супрацьстаяньня процілеглых сыстэм каштоўнасьцяў. Тры гады таму я зьдзіўляўся з наяўнасьці незалежнай прэсы ў шапіках, з адсутнасьці перасьледу за іншадумства, недахопаў у татальным рэжымным уціску асобы. Зьдзіўляўся, бо сьветапогляд і каштоўнасныя арыентацыі ўладных структур па сваіх якасьцях далёка не адпавядаюць сьветапогляду грамадзтва, у якім падобныя фрагмэнты дэмакратыі жыцьцяздольныя. Сучасная Беларусь стала прадуктам зьмяшаньня дзьвюх сыстэм і эпох — савецкай эпохі і эпохі незалежнай дзяржавы, на самым пачатку існаваньня якой адбылося шырокае пранікненьне дэмакратычных каштоўнасьцяў ва ўсе сфэры жыцьця. Выгнаньне гэтых каштоўнасьцяў — справа цяжкая, аднак рэальная. Яно можа расьцягнуцца на пакаленьні, пакуль не памруць усе, хто глынуў свабоды.

Сёньня мы маем справу з мэтанакіраванай палітыкай па зьмене грамадзкіх каштоўнасьцяў. Замест волі — парадак. Замест свабоды — сыстэма. Канфлікт грамадзтва і ўладаў, які агаліўся цяпер, высьпяваў пятнаццаць гадоў незалежнасьці. Замест адаптацыі ў новай геапалітычнай рэальнасьці ўлады зьдзейсьнілі выбар на карысьць аднаўленьня старой рэальнасьці. Сытуацыя чаканая і няшокавая — чарговага ўціску, з эфэктам сьцісканьня рукі на горле. Нечаканай яна сталася толькі для носьбітаў дэмакратычных каштоўнасьцяў. Ня хочацца ўжываць слова «наіўных». Заглушэньне прэсы, а далей і Інтэрнэту павінны былі ўлічвацца ад самага пачатку. Грамадзтва, што выношвае ідэі дэмакратызацыі ўмоў свайго існаваньня, нічога ня зробіць без свайго кукішу ў кішэні — кукішу, пра які загадзя яшчэ ня ведае які-кольвек чыноўнік.

Перакананьне, нібыта ў рамках дзяржсыстэмы магчымыя камунікацыі, што дазволяць пашырэньне дэмакратычнай думкі, выглядае новай наіўнасьцю. Так што першыя нумары «Нашай Нівы» за наступны год яшчэ чакайце ў сваіх паштовых скрынях, аднак ніхто не гарантуе вам гэтых нумароў празь месяц, год, два. «Дзе выйсьце?!» — шмат хто ўжо крычыць. У рамках дзяржаўнай сыстэмы выйсьця няма. Альтэрнатыва павінна быць па-за дзяржавай. Той частцы грамадзтва, якая асацыюе сябе з дэмакратыяй і індывідуальнай свабодай, трэба зьдзяйсьняць кансалідацыю ў такой форме зносін, якая ня будзе ўлічваць ніякіх дзяржаўных структур. Прынамсі, на найбліжэйшыя тры месяцы. Гэта будзе не апазыцыйным рухам — такой назьве не адпавядае сама сытуацыя ў краіне. Гэта будзе рухам па-за сыстэмай, дысыдэнцкім рухам. Эфэктыўнасьць яго будзе залежаць у першую чаргу ад колькасьці «пунктаў судакрананьня» яго з простым і незаангажаваным паспалітым людам. Гэта азначае ня толькі тое, што дысыдэнт павінен завязваць размовы ў аўтобусе або кідаць улёткі суседзям пад дзьверы. Гэта азначае, што дысыдэнт павінен абмяркоўваць і абдумваць тыя ж праблемы, якімі жыве шараговы грамадзянін, прапануючы альтэрнатыву іх рашэньня і агучваючы гэтую альтэрнатыву. Прыватная ўласнасьць на зямлю, служба ў войску, цэнавая й падатковая палітыка, сацыяльнае забесьпячэньне. Ідэалёгія і каштоўнасныя арыентацыі для яго, шараговага грамадзяніна, другасныя, і ён найчасьцей ухіляецца ад іх абмеркаваньня. Аднак варта паказваць яму, што большасьць яго надзённых праблем маюць сыстэмнае рашэньне. І так ствараць у яго вобраз рэальнай альтэрнатывы сучаснаму рэжыму — альтэрнатывы ў іншай сыстэме, а не ў хаосе. Патрэбна дасьціпная і шырокая праграма, патрэбна праграма дзеяньняў. Іх паабяцалі. Іх пакуль няма.

Будзьма гатовыя да дзейнасьці ў абыход усялякіх дзяржаўных структур.

Ня трэба баяцца вузкасьці шэрагаў людзей, што ідуць насуперак гэтаму рэжыму. Яны заяўляюць пра сябе ўголас, а на такое здольны ня кожны. Тыя, хто змагаецца, — гэта вастрыё, за ім ідзе яшчэ мэтал. А вастрыё павінна быць ня тоўстым, але — трывалым. Трываласьць будзе ў здольнасьці кансалідавацца, падпарадкаваць асабістыя амбіцыі і хціўыя памкненьні агульнай задачы. Кансалідацыя партый дэмакратычнага кірунку, недзяржаўных арганізацый цягнецца ўжо амаль дзясятак гадоў. Але гэта кансалідацыя ўнутры асобнага арганізму, што мае шырокую назву «дэмакратычны рух», альбо «дэмакратычная апазыцыя», а не ўнутры ўсяго беларускага грамадзтва. Трэба — кансалідацыя асобаў.

**Аляксей Коцюбаў**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Імпэрыя наносіць удар у адказ

*«Газы пры награваньні пашыраюцца».*
З падручніка фізыкі

Эканамічны ціск часам дае вынік, процілеглы задуманаму, піша **Віталь Тарас.**

У ноч на 1 студзеня, прыкладна а 0.30, на тэлеканале *Euronews* запаліліся чырвоныя літары: «экстраная навіна». Праўда, сам тэлесюжэт падаўся крыху няновым.

Тое, чаго ўсе чакалі ўжо некалькі месяцаў, зьдзейсьнілася. «Газпром» афіцыйна паведаміў аб адлучэньні Ўкраіны ад паставак газу.

Толькі ў ноч з 3 на 4 студзеня дамова між «Газпромам» і «Белтрансгазам» нарэшце была падпісаная. «Газпром» будзе прадаваць газ Украіне па 230 даляраў за тысячу кубоў, але Ўкраіна праз пасярэдніка — «Расукрэнэрга» — будзе набываць газ (у тым ліку туркмэнскі) па 95 даляраў. Газавы бліцкрыг крамлёўскіх летуценьнікаў завершыўся такім вось сюррэалістычным пагадненьнем. Але яго наступствы будуць адчувацца яшчэ доўга.

## Небясьпечнае прадказаньне

Кажуць — як сустрэнеш навагоднне сьвята, такім будзе і ўвесь год.

У мінулы Новы год усе буйныя інфармацыйныя каналы вялі жывую трансьляцыю з кіеўскага Майдану, дзе тысячы людзей сьвяткавалі перамогу Аранжавай рэвалюцыі. Гэтая карцінка сталася сапраўдным кашмарам для аўтарытарных рэжымаў, што ўтварыліся на прасторах СНД. Крэмль, абражаны да глыбіні душы, вырашыў нанесьці скрышальны ўдар у адказ. Вялікай крыўдай падаліся Маскве словы першага намесьніка міністра замежных справаў Украіны аб тым, што Расею, як і кожную імпэрыю, у пэрспэктыве чакае распад. Украінскі часовы паверааны быў неадкладна выкліканы ў МЗС, дзе было заяўлена аб недапушчальнасьці падобных прагнозаў, а разам з тым — і аб недапушчальнасьці бачыць у газавым ультыматуме Масквы палітыку.

Між тым, газавай атацы папярэднічала прапагандысцкая. Практычна ўвесь сьнежань галоўнымі героямі тэлеэкранаў былі «Газпром» і ягоныя чыноўнікі, якія пагражалі Ўкраіне эканамічным каляпсам — у тым выпадку, зразумела, калі ўкраінскі ўрад не паддасца на шантаж і не пагодзіцца купляць газ ад 1 студзеня па 230 даляраў за тысячу кубамэтраў — гэта значыць, амаль у пяць разоў даражэй, чым раней. На афіцыйнай мове гэта называлася «пераходам на рынкавыя цэны». На пытаньні эўрапейскіх спажыўцоў — напрыклад, у Нямеччыне, чаму ж Расея мерыцца па-ранейшаму прадаваць газ незалежнай Беларусі па 40 даляраў, — Масква адказвала: газатранспартныя сыстэмы ў гэтай краіне, маўляў, належаць Расеі, і таму параўноўваць сытуацыю з пастаўкамі газу ў Беларусь з пастаўкамі ва Ўкраіну некарэктна.

Наколькі карэктнай можна назваць саму гэтую заяву? Адказаць цяжка, бо афіцыйны Менск сарамліва ўхіліўся ад таго, каб праясьніць сытуацыю зь «Белтрансгазам» і ўмовамі экспарту расейскага паліва. Успамінаць аб тым, што менавіта Беларусь зрабілася тым палігонам, на якім «Газпром» упершыню правёў экспэрымэнт з закручваньнем газавых засланак, неяк няёмка і ў Маскве, і ў Менску. Тым больш, пасьля таго як прэзыдэнт Пуцін падчас сустрэчы ў Сочы блаславіў свайго беларускага калегу на датэрміновыя прэзыдэнцкія выбары.

Дарэчы, праводзячы свой першы газавы экспэрымэнт, «Газпром» не збаяўся таго факту, што адлучэньне паліва адразу адчуюць ня толькі ў Беларусі, але ў суседняй Польшчы, куды гэты канцэрн пастаўляў і пастаўляе газ па кантрактах. Абурэньне эўрапейскіх суседзяў тады было проста праігнараванае ў Маскве. Ёй трэба было павучыць Менск і паказаць, хто ў беларуска-расейскім «саюзе» гаспадар.

## Бог з газгольдэру

Гэтым разам рэакцыі Польшчы, Славаччыны, Аўстрыі, Італіі, а таксама Нямеччыны й Францыі ня толькі былі прадбачаныя, але й відавочна пралічаныя й загадзя ўключаныя Крамлём у сцэнар антыўкраінскай гістэрыі. Піяракцыя з выкарыстаньнем усіх расейскіх тэлеканалаў удалася. І Масква ў чарговы раз зрабілася закладніцай уласнай прапагандысцкай кампаніі. Фактычна, яна сама сябе загнала ў кут.

Пасьля гэткай артпадрыхтоўкі ў мэдыях адступаць было немагчыма. І калі Ўладзімер Пуцін выступіў у ролі свайго роду бога з машыны, запрапанаваўшы Ўкраіне спачатку шматмільярдны крэдыт на аплату газу па новай цане, а потым і ўвогуле пакінуць старыя цэны на першы квартал новага году, гэта выглядала, як кепская камэдыя.

Спасылкі на прынцыпы рынкавай эканомікі, трэба сказаць, ад самога пачатку выглядалі цынічна. Па-першае, «Газпром» — ня проста манапаліст, а кампанія, кантрольны пакет акцыяў якой належыць дзяржаве. Невыпадкова «Газпром» называюць месцам, у якім Уладзімер Пуцін можа знайсьці сабе прыстанішча ў выпадку, калі ён адмовіцца балятавацца ў прэзыдэнты па заканчэньні другога свайго тэрміну. З «Газпромам» зьвязваюць, дарэчы, і лёс экс-канцлера Нямеччыны Шродэра. Назваць гэты газавы праект чыста эканамічным можна хіба толькі жартам. Прынамсі, падобных жартаў не разумеюць у цяперашняй Польшчы, якая актыўна дапамагала станаўленьню дэмакратыі ва Ўкраіне.

Пад прэс «рынкавых адносінаў» у інтэрпрэтацыі Расеі патрапілі таксама Грузія з Малдовай. Цяпер ясна, з дапамогай якой зброі імпэрыя мае намер бараніць сябе ад экспарту каляровых рэвалюцыяў.

## Газавы шантаж, альбо Сэктар газу

Нічога новага Расея ня вынайшла. Можна згадаць, як на самым пачатку 1990-х, адразу пасьля таго, як Літва ад-

навіла незалежнасьць, Савецкі Саюз увёў эканамічныя санкцыі супраць былой рэспублікі. Спроба задушыць літоўцаў «паліўным голадам» толькі згуртавала літоўскі народ вакол свайго кіраўніцтва й выклікала яшчэ большыя антырасейскія настроі ў краінах Балтыі. Тое самае, можна не сумнявацца, адбудзецца і ва Ўкраіне. Складваецца ўражаньне, што Масква дзейнічае не паводле нейкага прадуманага пляну, а як слон у парцалянавай лаўцы. Слон адчувае сябе гэткім героем дня, і кожная новая разьбітая талерка выклікае ў яго прыступ эйфарыі ды пераможны трубны роў.

Такія паводзіны, натуральна, выклікаюць у Эўропе зусім апраўданыя пабойваньні й вымушаюць задумацца пра альтэрнатыўныя крыніцы энэргіі. Зразумела, перабудаваць транспартна-энэргетычны комплекс ня так лёгка, і ніхто ня будзе сварыцца з Расеяй адкрыта, пакуль яна зьяўляецца крыніцай досыць таннага паліва. Але варта помніць словы аднаго амэрыканскага палітыка з нагоды бэнзінавага крызісу 1970-х гадоў: «З нафтай можна шмат чаго зрабіць, — казаў палітык, — але яе нельга есьці». З таго часу некаторыя арабскія краіны — напрыклад, Катар альбо Кувэйт, зрабілі для сябе неабходныя высновы. Некаторыя, як Ірак, трымаліся за нафту як адзіную крыніцу даходу да апошняга. Але яна аказалася мала прыдатнай ня толькі для харчаваньня, але й для ўтрыманьня рэжыму.

### Хто наступны ў чарзе?

Дабрабыт Расеі, збудаваны на высокіх сусьветных цэнах на энэрганосьбіты, шмат у чым папяровы. Насельніцтва Расеі, калі не лічыць купкі прадпрымальнікаў і вышэйшых чыноўнікаў, пакуль не атрымала амаль нічога за кошт росту экспарту. Але тыя самыя чыноўнікі паводзяць сябе так, быццам яны сталі гаспадарамі сьвету.

У гэтай гісторыі з газавым шантажом ёсьць, аднак, і адваротны бок. Яна паказвае, што цэнавая палітыка «Газпрому», як і ўвогуле эканамічны ціск адных дзяржаваў на іншыя, даюць толькі абмежаваны вынік. А часам нават процілеглы задуманаму. Так адбылося, у прыватнасьці, з Кубай. Больш за тое, нават захопніцкія войны, як паказвае гісторыя, мала што даюць краінам-пераможцам. Насамрэч, каляніяльныя войны падрываюць моц імпэрыяў знутры. Пачаўшы ваяваць з Аўганістанам, Масква скончыла бруднай, незнакамітай і беспэрспэктыўнай вайной у маленькай Чачні. Вайна з Украінай (хай сабе эканамічная) скончыцца такім самым правалам і ганьбай, як і ўсе астатнія падобныя войны.

Тады, згодна зь лёгікай, надыдзе чарга Беларусі?

# Імпэрскі тарыф

Будучаму прэзыдэнту Беларусі прыйдзецца пераджыць такі самы газавы шантаж, які цяпер элегантна сарваў Юшчанка. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

На прыкладзе расейска-ўкраінскай газавае вайны мы выразна бачым, што такое імпэрскі нораў. Толькі наіўныя могуць паверыць, што за імпульсіўнай рынкавай рыторыкай «Газпрому», гэтай кіраванай з Крамля манаполіі, няма палітычных матываў. Тарыфы на блакітнае паліва карэлююцца са ступеньню ляяльнасьці таго ці іншага постсавецкага рэжыму.

Відавочна, што Масква ня можа дараваць Кіеву заходняй арыентацыі. Так і карціць пакараць за абуральную *самасьційнасьць* (слова, якое расейскія камэнтатары заўжды вымаўляюць зьдзекліва).

На гэтым тле асабліва сьмешныя развагі асобных нашых экспэртаў. Маўляў, каб увосень аб’яднаная апазыцыя лепей пакланілася Крамлю, дык ён, ня выключана, іначай гуляў бы зараз на беларускім полі.

У тым і рэч, што выключана! Сапраўдная беларуская *незалежнасьць* для імпэрскага мэнталітэту ёсьць зьявай яшчэ болей недарэчнай ды раздражняльнай, чым тая ўкраінская *самасьційнасьць*. Для маскоўскіх вярхоў Мілінкевіч ці Лябедзька — дзікія нацыяналісты і заходнія крэатуры паводле вызначэньня. Ужо таму, што гавораць пабеларуску. Ды ня лічаць суайчыньнікаў расейцамі. Са знакам якасьці.

Адна ўжо думка, што Беларусь можа выйсьці з арбіты Масквы, выклікае там панічны страх. Гэта й ёсьць імпэрскім інстынктам. Ён уласьцівы ня толькі элітам. Сацыёлягі засьведчылі, што газавы ўльтыматум Украіне ўхваляюць 80% расейцаў.

Некалі Бродзкі назваў Савецкі Саюз Верхняй Вольтай з ракетамі. Цяпер Расея прэтэндуе на ролю Верхняе Вольты з газам. Эўропа, надзвычай залежная ад газпромаўскіх даставак, б’е трывогу. Дзе гарантыя, што заўтра Масква ня возьме Захад за гарляк гэтак сама, як сёньня Ўкраіну?

Украіна ж, зазначыў Юшчанка, вядзе зараз сапраўднае змаганьне за незалежнасьць. У нас гэта яшчэ наперадзе. Бо добра вядома, дзе бывае бясплатны сыр. Дарэчы, аналітыкі дасюль мусяць толькі гадаць, пра што два кіраўнікі дамаўляліся ў Сочы за дзень да абвяшчэньня ў нас выбараў.

Масква рызыкуе зноў наступіць на ўкраінскія граблі. Экспэрты падкрэсьліваюць: газавым козырам можна згуляць толькі аднойчы. А вось як маскалі хацелі замарозіць «украінскіх братоў», тыя будуць памятаць доўга.

Паўтара дзесяцігодзьдзя таму мне давялося быць у Літве акурат тады, калі Масква помсьціла прыбалтам энэргетычнай блякадай за фактычны выхад з СССР. Але блякада толькі загартавала іх волю да незалежнасьці. Дый эканоміка балтыйскіх краінаў — няма ліха без дабра — хутчэй саскочыла з саўковай іголкі.

Вось і газавая вайна між Масквой і Кіевам, здаецца, сканчаецца кампрамісам. Аб’ектыўна ён на карысьць Украіны. Каб захаваць твар, «Газпром» мусіў вынайсьці нейкую сюррэалістычную схему: прадае Ўкраіне газ нібыта па $230, але тая купляе па $95!

Гэта ўсё адно ўдвая даражэй, чым для Беларусі. Аднак шантаж сарваўся. Зь іншага боку, незалежныя экспэрты зьвяртаюць увагу на тое, што танны газ — як наркотык для беларускіх уладаў. Марнуецца час, надзвычай спрыяльны для даўно насьпелых эканамічных рэформаў. Потым яны будуць надта балючыя.

Магчыма, зараз мы назіраем сюжэт, які паўторыцца празь нейкі час ужо ў дачыненьнях Масквы з новай Беларусьсю. Будучаму прэзыдэнту самы час матаць на вус украінскі досьвед.

# Палямон. Коды легенды

Палямон ня быў рымлянінам, толькі грэкам, ды яшчэ й жыдаватым. А аўтарам легенды пра Палямона мог быць... Чытач мусіць разабрацца сам, склаўшы 2+2. Гістарычную таямніцу разгадаў **Алег Латышонак**.



**Алег Латышонак — доктар гістарычных навук. Жыве ў Беластоку. Адзін з лідэраў беларусаў Польшчы.**

Апынуўшыся паміж Сцылай заказу з боку ўлады і Харыбдай гістарычнай праўды, аўтар геніяльна прашмыгнуў між страшнымі скаламі.

Байку пра пірата Палямона, які аказаўся каралём, я помню з маленства. Напісаў гэтую байку таленавіты польскі пісьменьнік Ян Бжэхва. Яшчэ і сёньня ў маёй памяці застаюцца радкі гэтага выдатнага твору дзіцячай літаратуры: «Płynie okręt pszez odmęty nie zwyczajny, lecz zaklęty» — «Плыве човен над вірамі не звычайны, а закляты».

Але Палямон — герой зусім не дзіцячай літаратуры. Ён зьявіўся на пачатку XVI ст. на старонках твору, зь некалькіх назваў якога («Летапісец», «Кроніка», «Кніга») найбольш верагодная наступная: «За кройнікі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага». Арыгінал твору не захаваўся. Самы даўні тэкст перадаюць летапісы Красінскага і Яўрэінаўскі, але нават у іх відаць выразныя сьляды пазьнейшай пераапрацоўкі. Чарговыя рэдактары даволі моцна ўмешваліся ў першапачатковы тэкст, мяняючы прытым і яго ідэйны зьмест.

## Легенда

Твор пачынаецца з паведамленьня аб шляхетным рымскім паходжаньні жамойтаў і літоўцаў. Легенду аб рымскім паходжаньні літоўцаў, жамойтаў і яцьвягаў першым падаў польскі гісторык Ян Длугаш, але наш невядомы летапісец нічога, апрача канцэпту, ад яго ня ўзяў. Расказвае аб тым, як у час жорсткага панаваньня Нэрона, які ўласнаручна забіў родную маці і свайго «найвышэйшага доктара» Сэнэку, нейкі рымскі князь Палямон, Нэронаў сваяк, на чале пяцісот чалавек рымскай шляхты сеў на караблі і ўцёк з Рыму, кіруючыся на Захад. Са згаданай шляхты найбольш выдатнымі былі чатыры роды — Кітаўрасы, Калюмны, Ружы і Угры (Урсіны). Дзякуючы парадам нейкага вучонага астранома ўцекачы зь «Міжземскага мора» (тут зусім не Міжземнае, толькі Паўночнае мора) праз раку Шуму (так аўтар называе Дацкія пралівы) выплылі на мора-акіян (па сёньняшняму — Балтыйскае). Па гэтым моры паплылі да вусьця Нёману і ўвайшлі ў адно зь яго адгалінаваньняў, якое называецца Скіля, далей падаліся ўверх Нёману да вусьця ракі Дубісы, дзе й пасяліліся. Прышэльцы назвалі гэтую зямлю па-славянску Пабярэжная зямля, а па-літоўску — Жамойцкая зямля. Размножыўшыся, выйшлі за раку Сьвятую й засялілі тэрыторыю да правага берага Вяльлі. Тут «ігралі на трубах дубасных», ад чаго іхны князь Кернус назваў гэтую краіну Літустуба, ад лацінскіх словаў litus — бераг і tuba — труба. Паколькі простыя людзі не змаглі правільна вымавіць лацінскую назву, сталі гэтую зямлю называць «Літва».

Па нашэсьці Батыя вялікі князь жамойцкі Мантвіл даведаўся, што Руская зямля стаіць спустошаная, а яе князі разагнаныя. Вялікі князь кіеўскі Дзьмітры ўцёк са спаленага Кіева да дручанаў і заснаваў горад Друцак (ад яго пайшлі «вялікія князі» Друцкія). Мантвіл паслаў свайго сына Скірманта з панамі раднымі за Вяльлю і Нёман. Скірмант знайшоў за Нёманам «гару красную» і пабудаваў на ёй горад Наваградак ды стаў вялікім князем наваградзкім. Пасьля заснаваў Горадзен і аднавіў зруйнаваныя татарамі Берасьце, Дарагічын і Мельнік. Між Вяльлёй і Нёманам Скірмант пасяліў над ракой Ашменай Крумпя і надаў яму ўсе землі будучага Ашменскага павету; ад гэтага Крумпя нарадзіўся Гаштаўт. Землі будучага Ейшыскага павету надаў Эйкшу, ад якога нарадзіўся Давойна, а Граўжыскага павету — Гроўжу, ад якога нарадзіўся Манвід.

Пасьля сьмерці Скірманта вялікім князем наваградзкім стаў ягоны сын Мінгайла. Ён разьбіў пад Гарадцом палачан, якія абыходзіліся тады бяз князя, узяў Полацак і такім чынам стаў яшчэ і вялікім князем полацкім. Пасьля сьмерці Мінгайлы ў Наваградку княжыў ягоны сын Шварн, а ў Полацку другі — Гінвіл. Шварн далучыў да Вялікага княства Наваградзкага Пінск і Тураў, пасьля разьбіў войскі татарскага цара Балаклая на мяжы Наваградзкага княства пад Койданавам і захапіў Мазыр, Чарнігаў, Старадуб і Карачаў. У міжчасьсе ў Полацку Гінвіл прыняў хрышчэньне, а зь ім — імя Барыс. Гінвіл-Барыс пабудаваў у Полацку некалькі цэркваў, у тым ліку Барысаглебскую, і заснаваў горад Барысаў. Меў Гінвіл-Барыс двое дзяцей, Глеба й Параскоўю. Параскоўя стала манашкай, служыла Богу і пісала кніжкі, пасьля пераехала ў Рым, дзе з часам пахрысьцілася і прыняла імя Праксэдыс. Глеб памёр бязьдзетна і на ім абарвалася гэтая лінія нашчадкаў Палямона.

Апошнім з наваградзкіх нашчадкаў Палямона быў вялікі князь наваградзкі Рынгальт. Пасьля ягонай сьмерці навагра-



Навагрудку.

З гісторыяй твор Ананіма ня мае абсалютна нічога супольнага. Загаловак «За кройнікі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага» нават як быццам падказвае, што пісалася нешта замест сапраўдных хронік. Уведзеныя аўтарам імёны — гэта або эпонімы (як Кернус — ад Кернава), або звычайныя літоўскія імёны. Інтэнцыя невядомага аўтара пры першым прачытаньні ясная: падкрэсьліць рымскае паходжаньне жамойцкай і літоўскай шляхты. Рымскае паходжаньне, у чым згодныя ўсе камэнтатары легенды, абазначае тут адвечную сувязь ахрышчанага ў заходнім абрадзе літоўскага народу са сталіцай каталіцкага сьвету. Жамойцкая шляхта тут, безумоўна, на першым месцы — выхадцы з Рыму пасяліліся сьпярша ў Жамойці, а «Літоўская дзяржава пачала называцца і множыцца ад Жамойці». Чарговая, хаця па важнасьці ня менш важная за папярэднія, мэта напісаньня твору — праслаўленьне чатырох згаданых у ёй родаў таварышаў Палямона, перш за ўсё Кітаўрасаў.

дзкія паны ўзялі сабе князем Швінтарога, сына вялікага князя літоўскага і жамойцкага Ўценуса з роду Кітаўрасаў. Род Кітаўрасаў прыйшоў да ўлады ў Літве пасьля сьмерці Кернуса, які ня меў сына, а сваю дачку Паяту аддаў за Гіруса з Кітаўрасаў менавіта. Апошнім з нашчадкаў Швінтарога, які займаў велікакняжацкі столец, быў Тройдзень. Пасьля ягонай сьмерці паны вынесьлі на Вялікае Княства Літоўскае, Жамойцкае і Рускае Віценя з роду Калюмнаў. Сынам Віценя меўся быць Гедымін. На тым канчаецца ўвесь легендарны пэрыяд. Расказ пра Гедыміна, хоць таксама напалову легендарны, абапіраецца на вядомы здаўна «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх».

**Палямон II, кароль Понту, эліністычнай дзяржавы на беразе Чорнага мора ў Малой Азіі, на тэрыторыі сёньняшняй Турцыі. Выява на тагачаснай манэце.**

Юдэйская князёўна Бэраніка выбрала яго сваім трэцім мужам, каб выправіць рэпутацыю, пацярпелую ў выніку яе скандальных паводзін.

## Першы код

Паводле М.Улашчыка, першапачатковы тэкст легенды заканчваўся на сьмерці Рынгальта, пра што сьведчаць словы «Таму канец» у палове летапісаў. Але й сама легенда падзяляецца на дзьве часткі — пачатковую, уласна жамойцка-літоўскую, і наваградзкую, да якой адносіцца 80% легендарнага тэксту да сьмерці Рынгальта. Прытым Наваградкам валодаюць Палямонавы нашчадкі па мячы, тады як Літвой і Жамойцю — па кудзелі. Паколькі да таго ў першай частцы больш дакладна апісваецца толькі тэрыторыя на паўночны ўсход ад Вільні (затое геаграфія Жамойці вельмі недакладная, проста фантастычная), а ў другой частцы — Наваградчына, Улашчык прыйшоў да думкі, што аўтараў легенды было двое. Усё ж у першай частцы першапачатковая Літва апісваецца як зямля Завялейская, г.зн. аўтар бачыць яе вачыма жыхара паўднёвага берагу Вяльлі, скажам, Вільні. Такім чынам, аўтарам абедзьвюх частак мог быць і адзін чалавек, які пабываў і за Вяльлёю, і ў

## Важнае «воспак»

Адылі ці так было ў першапачатковай вэрсіі? Пазьнейшыя ўстаўкі выразна зазначаны ў летапісе Красінскіх словамі «вернемся назад (воспак)». Два «воспак» няважныя, бо наступаюць па ўстаўленых апісаньнях паганскага культу часоў князёў Сьперы і Кукавойта. Трэцяе стаіць пасьля аповеду аб наданьні Скірмантам земляў на правым беразе Нёману продкам Гаштаўтаў, Давойнаў і Манвідаў. Гэта абазначае, што ў першапачатковым тэксьце легенды гэтага фрагмэнту не было. Яўная ўстаўка таксама — аповед пра князёў Друцкіх.

Важнае «воспак», што стаіць пасьля аповеду пра полацкае адгалінаваньне Палямонавічаў. Першая частка «жыцця» Параскові-Праксэдыс створана на аснове жыцця сьвятой

Працяг на старонцы 32.

# Палямон. Коды легенды

Где ж одно княже римское именем Полемон, который же цесару Нерону был кровныи, забралъся з жоною и з дѣтми, и з скарбы своими, и подъданными своими, с которым жо княжетем собралося пятсот шляхты з жонами и з дѣтми и з многыми людми. И вземши с собою одного остронома, и пошли в кораблех морем по заходу слонца, хотечи собе знаити на земли месцо слушное, игде бысь мели поселити а мешкати с покоем. А с тыми шляхты чотыри были рожаи наивышшие, именем Китоврасы, Колюмны, Рожи, Ургы. А так они не малыи час по морю ходе-



**Дынастыі зьмяняліся — традыцыя жыла. Кароль Рэчы Паспалітай Ян III Сабескі ў старажытнарымскім уборы.**

**Пачатак са старонкі 31.**

Эўфрасіньні і яе сястры Эўпраксіі, дачкі Барыса Ўсяславіча. Адсюль узятае і хрысьціянскае імя Гінвіла. Імя Барысавага сына Глеба вынікае з таго, што Барыс і Глеб выступаюць разам як сьвятыя ў жыцці сьв.Эўфрасіньні, а таксама як патроны Барысаглебскай царквы ў Полацку. Другая частка сюжэту — поўнасьцю фантастычная, што паказаў яшчэ ў XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі.

Аўтарства гэтай фантастычнай гісторыі, безумоўна, належыць полацкім бэрнардынцам, паселеным у 1498 г. у Полацку з заданьнем навяртаць праваслаўных на каталіцтва. Пытаньне толькі, ці ўстаўлены быў цэлы аповед пра полацкіх Палямонавічаў, ці толькі сюжэт з Парасковіяй-Праксэдыс? Адназначна адказаць на гэта немагчыма, але ёсьць падставы меркаваць, што ўстаўлена была цэлая полацкая гісторыя, бо расказ пра полацкіх і наваградзкіх князёў ідзе асобна, безь ніякай сувязі між імі. Спачатку нейкі полацкі бэрнардынец стварыў «жыцце» Парасковіі-Праксэдыс, у якім пра яе літоўскае паходжаньне не гаварылася, бо бэрнардынцы меліся навяртаць русінаў, і важным зь іхняга гледзішча было толькі перахрышчаньне рускай полацкай князёўны ў каталіцызм.

Постаці Мінгайлы і Гінвіла, відаць, былі прыдуманы рэдактарам новай вэрсіі легенды дзеля далучэньня да яе «жыцця» Парасковіі-Праксэдыс. Гэты рэдактар працаваў іншым спосабам, чым аўтар легенды, — не прыдумваў зусім фантастычных асоб і падзей, а толькі ствараў фіктыўныя асобы і падзеі на аснове рускіх летапісаў ды канцылярскіх дакумэнтаў.

Мінгайла і Гінвіл — гэта звычайныя літоўскія імёны, але вялікаму князю наваградзкаму і полацкаму Мінгайлу аўтар даў, відаць, імя Мінігайлы, у хрышчэньні Міхала (як у летапісе Альшэўскага), віленскага кашталяна часоў Вітаўта. Вітаўтавым баярам і канюшым быў таксама гістарычны Гінвіл. Сюжэт зь бітвай Мінгайлы з палачанамі пад Гарадцом аўтар мог узяць, як заўважыў менскі гісторык Юры Заяц, толькі з Іпацьеўскага летапісу. Паводле гэтага летапісу, у 1161 г. пад Гарадцом войска полацкага князя Рагвалода-Васіля Барысавіча было разьбітае Валадарам Глебавічам, якому дапамагалі літоўскія атрады.

Таксама імя Шварн, якое сапраўды належыць валынскаму княжычу, які стаў наваградзкім князем, узятае з Іпацьеўскага летапісу. Рэдактар відавочна прыпісаў Шварну пачыны Мантвілавага сына Скірманта, у якога ў арыгінальнай легендзе, відаць, не было ні сына Мінгайлы, ні ўнукаў Шварна і Гінвіла. Дарэчы, гэтыя ўстаўкі — доказ таго, што на пачатку XVI ст. у Вільні захоўваўся летапіс тыпу Іпацьеўскага, а гісторыя Вялікага княства хвальшавалася сьвядома.

## Рука Гаштаўта

Сярод рымскай шляхты ў легендзе вылучаюцца чатыры роды найважнейшых таварышаў Палямона, але прысьвячаецца ім неаднолькавая ўвага. Пра пачыны Гаштаўтаў, Манвідаў і Давойнаў і не апавядаецца практычна нічога, хоць рэдактары ўлічвалі магчымасьць дапісваньня сяго-таго і пра іх. Сьведчыць аб тым занатоўка «Тут Давойна», якую мэханічна перапісаў капіст летапісу. Вядома, любы аўтар так пазначае месца, дзе мае намер зьмясьціць нейкі сюжэт.

Некаторыя дасьледчыкі лічаць, што ў легендзе маецца на ўвазе, што Палямон быў з роду Калюмнаў, да якога належалі Ягелёны, а Мікола Ўлашчык далучае Палямона да Кітаўрасаў. Тым часам у самім тэксьце няма нават намёку ні на першае, ні на другое. З гербавых родаў таварышаў Палямона вылучаюцца толькі Кітаўрасы, да якіх пераходзіць улада пасьля таго, як адмерлі Палямонавічы. Дынастыя Калюмнаў зьяўляецца толькі ў асобе Віценя. Вынясеньне як Швінтарога Ўценусавіча, так і Віценя на вялікае княжаньне панамі мае падмацаваць права паноў-рады выбіраць вялікага князя і ў час, калі створана была гэтая легенда. Так ці інакш, вы-

лучэньне Кітаўрасаў выразна паказвае на ініцыятара стварэньня легенды: Кітаўрасам (лац. Centaurus) пячаталіся князі Гальшанскія і князі Гедройскія, якія раней карысталіся гербам «Ружа». З князёў Гедройскіх у час напісаньня легенды ніхто асабліва не вылучаўся. Так што, відаць, тут перш за ўсё рука Паўла Гальшанскага, запісанага ў Кракаўскі ўнівэрсытэт у 1504 г., а ў 1507 г. ужо каталіцкага луцкага біскупа, з 1522 біскупа берасьцейскага і з 1536 біскупа віленскага.

Паколькі большая частка легенды — гэта аповед пра «Вялікае Княства Наваградзкае», а на пачатку стагодзьдзя наваградзкімі ваяводамі былі Альбрыхт Гаштаўт, пасьля ягоны сын Станіслаў, а раней яшчэ і бацька Альбрыхта Марцін, Мікола Ўлашчык напісаньне гэтай часткі легенды зьвязаў, перш за ўсё, з гэтым родам. Найбольш праўдападобным ініцыятарам ён лічыць Станіслава, але гэты ўсё жыцьцё ва ўсім падпарадкоўваўся свайму магутнаму бацьку, якога, зрэшты, перажыў толькі на тры гады. Такім чынам, дачыненьне да стварэньня легенды мог мець толькі Альбрыхт Гаштаўт.

Ініцыятарскай роляй Альбрыхта Гаштаўта можна растлумачыць шмат якія сюжэты легенды. Магчыма, гэта датычыцца нават першпапачатковай легенды: выхадцы з Рыму, як заўважыла Альбіна Семянчук, прызямляюцца ля зьліцьця Дубісы зь Нёманам, а першы гістарычны Гаштаўт быў старастам Вялёны, якая ляжыць якраз у гэтым месцы; недзе тут разьмяшчалася і сядзіба Гаштаўта. Калі ідзе гаворка пра гісторыю «Вялікага Княства Наваградзкага», тут супадзеньні ўжо шматлікія і, безумоўна, невыпадковыя. Альбрыхт Гаштаўт ваяваў з татарамі, у прыватнасьці абараніў ад іх Наваградак у 1505 г., калі быў тут намесьнікам. У 1508-м ён стаў наваградзкім ваяводам, з 1513 г. — бельскім старастам на Падляшшы. У 1514—1519 гг. быў полацкім ваяводам; у 1518 годзе абараніў Полацак ад маскоўцаў. З 1515 г. быў мазырскім старастам, а з 1525 г. яшчэ і барысаўскім старастам.

Пасады Гаштаўта тлумачаць, адкуль у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага ўзяліся Полацак, Барысаў і Мазыр, якія часткай Літвы ніколі не лічыліся. Альбрыхт быў унукам Сямёна Сямёнавіча Гальшанскага, які стаў называцца Трабскім, і Марыі з князёў Зубрэвіцкіх-Друцкіх, якая ўсю сваю вялікую маёмасьць адпісала менавіта яму і ягонай сястры. Гэта вычарпальна тлумачыць устаўку ў легенду аповеду пра князёў Друцкіх і дадаткова зьяўленьне ў легендзе Трабуса. Разам з рукой Сафіі з князёў Вярэйскіх Альбрыхт атрымаў яе ўладаньні, у тым ліку Койданава, якое ляжала на мяжы гэтых уладаньняў. Таму легендарны хан Балаклай быў разгромлены пад Койданавам, на мяжы «Вялікага Княства Наваградзкага».

Сама маляўнічы з падобных сюжэтаў — гісторыя з Тройдзенем, які нібыта быў заснавальнікам Райгораду і вельмі жорсткім ды ваяўнічым уладаром гэтага «панства». Сапраўднае «райгорадзкае панства» пасьля бунту Глінскага дасталося Мікалаю Радзівілу. Такім чынам Радзівіл, тады галоўны вораг Альбрыхта Гаштаўта, стаў ягоным суседам на Падляшшы. У 1519 г. адзін з радзівілаўскіх старастаў напаў і спаліў замак у Тыкоціне, зь якога Гаштаўт ледзьве ўцёк жывым. Таму пра Тройдзеня пішацца ў легендзе, што «горшы быў тым землям, ніжлі Антыёх Сырыйскі, і Ірад Ерусалімскі, і Нэрон Рымскі». Каб больш яшчэ дапячы Радзівілам, іх род увогуле ня быў згаданы сярод названых у легендзе найбольш выдатных родаў рымскай шляхты, хаця такое месца Радзівілам па значэньні, безумоўна, належалася. Толькі Стрыйкоўскі далучыць іх да легенды, але гэта ўжо зусім іншая гісторыя…

Уважлівы і лепей азнаёмлены з гісторыяй роду Гаштаўтаў чытач, пэўна ж, знойдзе яшчэ больш падобных супадзеньняў, але й вышэйпералічаных дастаткова, каб сьцвердзіць, што летапіс «Вялікага Княства Наваградзкага і Полацкага» аказваецца зашыфраваным жыцьцяпісам Альбрыхта Гаштаўта — наваградзкага намесьніка і ваяводы бельскага і мазырскага старасты, затым полацкага ваяводы і барысаўскага старасты — «Вялікае Княства Наваградзкае» пашырае свае межы разам з кожнай чарговай Альбрыхтавай пасадай і кожным ягоным маёмасным набыткам. «Роля» Гаштаўтаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага першапачаткова засакрэчаная, у наступных жа разьдзелах, пачынаючы з панаваньня Гедыміна, будзе асьвятляцца больш адкрыта. Самае важнае — Гаштаўты абвяшчаюць сябе Калюмнамі, што абазначае роўнасьць іхнага паходжаньня зь Ягайлавічамі. Альбрыхтава пахвальба свайго апагею дасягне ў хроніцы Быхаўца, абшырныя фрагмэнты якой — гэта проста панэгірык Гаштаўтам.

Улічыўшы шырокамаштабную інтэрвэнцыю Гаштаўта ў першапачатковы тэкст легенды, можна меркаваць, што легенда спачатку расказвала толькі пра прыбыцьцё Палямона і стварэньне Кернусам назвы Літвы. Калі ж усё-такі згадваўся і Наваградак, дык толькі ў кантэксьце далучэньня да Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага менавіта яго. У такім выпадку легенда магла абмяжоўвацца імёнамі Скірманта і Рынгальта.

## Палямон жыў у Турцыі

Але прыхаваная пахвальба Гаштаўтаў — гэта не апошні код легенды. Найважнейшы, самы асноўны код хавае імя «Палямон». Палямонаў у антычнай гісторыі было шмат, але ў эпоху Нэрона жыў толькі адзін сваяк імпэратара з такім імем, пры тым кароль, — зусім як у байцы з майго дзяцінства: Палямон II, кароль Понту, элліністычнай дзяржавы на беразе Чорнага мора ў Малой Азіі, на тэрыторыі сёньняшняй Турцыі. Як Нэрон, так Палямон былі па кудзелі праўнукамі Марка Антонія.

Бацька Палямона II Палямон I стаў каралём Кілікіі й Понту менавіта дзякуючы Марку Анто-

Працяг на старонцы 34.

чи, пришли Межиземского моря и дошли до реки до Шума и тою рекою Шумою в море окиян, и морем окияном дошли до устья, игде река Немон впадываеть в море окиян. Потом пошли Немном у верх, ажь в море зовемое Малое, которое называется /л.65/. море Немновое, а с тое причины тое море Немновое называется, ижь в тое море впадаеть Немон двանадцатми устьи и кождое зовется своим именем, Скиля. И пошли тым устьем уверх, и дошли цѢлого Немна, где вжо он сам во одном месци течеть весь, а у верх Немном пошли до реки Дубисы, где ж вшедши в тую реку Дубису, и над нею нашли горы высокие, и на оных горах ровнины великие, и дубровы роскошные и розмаитое офитости наполненых роз

# Палямон. Коды легенды

Пачатак са старонкі 33.

нію, якога затым збройна падтрымаў у вайне з Актавіянам. Пасьля паражэньня Антонія пры мысе Акцыюм Палямон I нейк выкруціўся ад віны перад пераможцам. Як сябру і саюзьніку рымскага народу Палямону I выдзелілі яшчэ й Баспорскае каралеўства (у Крыме і на Таманскай паўвысьпе). Тут Палямон I зьнішчыў непаслухмяны горад Танаіду ля ўпадзеньня Дону ў Азоўскае мора. Пасьля па-здрадніцку, прыкідваючыся сябрам, напаў на барбарскае племя аспургаў, але трапіў у іх палон і быў пакараны сьмерцю.

Яго сыну Палямону II Калігула надаў Понцкае і Баспорскае каралеўства, зь іх другое празь нейкі час было заменена Кілікійскім. Разам зь іншымі суседзкімі каралямі Палямон наведаў аднойчы юдэйскага караля Ірада Агрыпу I у Тыбэрыядзе (пэўна ж, рыхтавалася нейкая супрацьрымская змова). Юдэйская князёўна Бэраніка выбрала яго сваім трэцім мужам, каб выправіць сваю рэпутацыю, пацярпелую ў выніку яе скандальных паводзін. Палямон, са свайго боку, ажаніўся з Бэранікай ня столькі дзеля яе слаўнай на ўвесь антычны сьвет прыгажосьці, колькі дзеля багацьця. Згадзіўся нават прыняць юдаізм і паддаўся абразаньню. Бэраніка неўзабаве яго кінула, і Палямон таксама хутка кінуў юдаізм. Недзе ў 62—64 г. ад Нараджэньня Хрыстовага ён быў прымушаны Нэронам адрачыся ад Понцкага трону (і гэтае ягонае каралеўства стала часткай Рымскай імпэрыі), але захаваў Каралеўства Кілікіі. Паводле папулярнай легенды пра сьвятога Варфаламея-апостала, гэты сьвяты быццам бы навярнуў Палямона ў хрысьціянства. Калі нават так было, Палямон хутка зноў вярнуўся ў паганства. Памёр у 74 годзе.

Тым часам у Понце пасьля сьмерці Нэрона былы камандзір понцкага флёту, Палямонаў вызваленец Аніцэт, падняў у 69 г. паўстаньне і спаліў рымскі чарнаморскі флёт у выніку раптоўнага нападу на Трапэзунд. Аніцэт набраў у сваё войска ўсялякага роду барбараў, шукальнікаў прыгод і трафэяў ды нейкі час рабіў пірацкія набегі на рымлянаў на адмыслова сканструяваных ладзьдзях зь нізкімі бартамі і шырокім дном. Рымляне ўрэшце абкружылі Аніцэта ў вусьці ракі Кгоба (у Заходняй Грузіі). Выдадзены тутэйшым барбарскім каралём рымлянам, Аніцэт быў пакараны сьмерцю. Так закончылася гэтая нявольніцкая вайна.

Г.Берасьнявічус бачыць гістарычную аснову міту пра Палямона ў кантактах Палямона II з прыбалтыйскімі землямі. На жаль, праца Берасьнявічуса мне вядомая толькі з трэціх рук, дык ня ведаю, ці адказаў ён на асноўнае пытаньне: калі міт пра Палямона створаны, каб даказаць рымскае паходжаньне літоўцаў, то чаму аўтар надаў іхнаму быццам бы рымскаму роданачальніку грэцкае імя?

Усе пададзеныя вышэй зьвесткі пра понцкіх Палямонаў рассыпаны па старонках прац антычных аўтараў — «Геаграфіі» Страбона, «Аналаў» і «Гісторый» Тацыта, «Юдэйскай даўніны» Язэпа Флявіюса, «Паралельных жыцьцяпісах» Плютарха, «Дванаццаці Цэзараў» Сьветонія і «Гісторыі Рыму» Дыёна. Апрача апошняй, усе гэтыя працы на пачатку XVI ст. былі ўжо надрукаваныя: Тацыт, Флявіюс і Сьветоніюс яшчэ ў 1470 г., Страбон у 1516 і Плютарх — у 1517 г.

## Геній маніпуляцыі

Ня думаю, каб наш Ананім прачытаў усё вышэйзгаданае, хаця тэарэтычна мог гэта зрабіць. Можна сабе ўявіць, што, атрымаўшы заказ напісаць старажытную гісторыю Літвы, ён пачаў працу як дасьледчык. Адштурхнуўся ад Длугаша, паводле якога міграцыя продкаў літоўцаў з Рыму адбылася ў часы грамадзянскіх войнаў, сьпярша між Марыем і Сулам, пасьля між Цэзарам і Пампэем і пазьней між іхнімі наступнікамі. Таму Ананім стаў гартаць антычных аўтараў, каб высьветліць усю справу. Сьпярша прачытаў пра войны Сулы, а пасьля Пампэя, і, нічога не знайшоўшы, шукаў далей, пакуль не дайшоў да Нэрона і Палямона. Гартаў-перагортваў, чытаў-перачытваў і нарэшце зразумеў — Длугаш змахляры́ў: ніякага перасяленьня рымлянаў у паўночныя краіны не было, і ўся антычная гісторыя Літвы — проста выдумка. Тады вырашыў прыдумаць нешта «замест» літоўскіх і жамойцкіх хронік. Канцэпт з Палямонам і ягоным мараплаваньнем прыйшоў яму на думку, безумоўна, пад уплывам аповеду пра бунт Аніцэта, зьмешчанага ў трэцяй кнізе «Гісторый» Тацыта. Але мог мецць месца ўплыў і «Геаграфіі» Страбона, які расказвае пра Палямона I і ягоную сьмерць у краіне аспургаў у адзінаццатай і дванаццатай кнізе сваёй працы.

Аўтар легенды пра Палямона мог поўнымі жменямі чэрпаць з Тацыта імёны рымскіх нобіляў, але выбраў грэка. Ніхто не сумняваецца, што ў час узьнікненьня твору «За кройнікі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага» пад «рымскім» мелася на ўвазе

ного рожаю звереи, то есть наперьвеи туров, зубреи, лосеи, еленеи, серн, рысеи, лисиць, бѣлок, горнастаев, ласиць и иных розмаитых рожаев. И ту теж в реках великую объфитось рыб непосполитых, иж не толко тые рыбы, которые в тых ся реках плодять, але множьство рыб розмаитых а дивных з моря приходять, а то за тою причиною, иже недалеко устье Немновое, где Немон в море впады




рыма–каталіцкі, «літоўскі» варыянт.
грэка–бізантыйскі, «рускі» варыянт.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

«каталіцкае». Затое «грэцкае» атаясамлівалася з «рускім» і «праваслаўным». Такім чынам, сьцьверджаньне, што Палямон быў сапраўды грэкам, а ня рымлянінам, ставіць усю легенду з галавы на ногі: Вялікае Княства Літоўскае, Жамойцкае і Рускае аказваецца творам грэка-праваслаўнай, а ня рыма-каталіцкай цывілізацыі. З гэтага вынікае, што аўтар легенды мусіў быць русінам, які ў імені Палямон зашыфраваў свой погляд на сутнасьць Вялікага Княства.

Сапраўднае паходжаньне Палямона тлумачыць, чаму ў арыгінальнай вэрсіі легенды Палямон накіроўваецца на захад. Заходні напрамак падарожжа Палямона бянтэжыў яшчэ рэдактараў легенды, бо, плывучы з Рыму на захад, у Жамойць ніяк не пападзеш. Дасьледчыкі легенды палічылі пазьней, што яе аўтар нібыта ня ведаў геаграфіі. Тым часам згаданае ў «Летапісе» мора-Акіян — гэта зусім не Балтыйскае, а толькі Чорнае мора, якое грэкі звычайна называлі Понт, гэта значыць Акіян.

«Трубы дубасныя» асацыююцца з фразэалягізмам «смаленыя дубы плясьці», якія абазначае небыліцу, недарэчнасьць.

Але гэтага яшчэ мала. Літоўскі роданачальнік аказваецца ня толькі грэкам, але яшчэ і… жыдам. Палямонава кампанія таксама падазроная — ніякай шляхты, толькі рознага роду Аніцэты, зьбеглыя нявольнікі і шукальнікі прыгод ды трафэяў, сармацкі (чытай — славянскі) зброд з пабярэжжа Чорнага мора, на спрытных лодках — проста казакі на чайках. З геніяльнай інтуіцыяй апісаў іх Ян Бжэхва: «Ukazuje siź załoga / Rozbyjnicza i złowroga: / A więc sternik-kuternoga / Piźędziesięciu marynarzy, / Strasznych zbyjyw i korsarzy». Іхны шлях вёў з Чорнага мора ў «малое» Азоўскае, а адсюль уверх па Доне (Танаісе), уздоўж мяжы Эўропы і Азіі, і далей на захад, у глыб Сармацыі, да краіны раксаланаў, гэта значыць у Русь; і толькі адсюль іхныя нашчадкі пайшлі за Вяльлю і назвалі гэтую зямлю па-простаму: Літва.

Дзяржавастваральным цэнтрам Вялікага Княства аказваецца Наваградак, да якога былі далучаны спачатку Горадзен, Берасьце, Драгічын і Мельнік, пасьля Полацак, затым Пінск і Тураў, пасьля яшчэ Мазыр, Чарнігаў, Старадуб і Карачаў (фактычна ў сёньняшнім разуменьні ўся беларуская этнаграфічная тэрыторыя), ды нарэшце Літва і Жамойць. Горад Вільня быў пабудаваны ў межах Наваградзкага княства, на Рускай зямлі, апусьцелай пасьля татарскага нашэсьця, г. зн. стаіць на месцы рускага гораду. Падумаць толькі, усё гэта амаль што на пяцьсот гадоў да Міколы Ермаловіча!

Аўтар легенды, як адзначыў яшчэ Ян Якубоўскі, пісаў гісторыю Літвы і Жамойці, а не гісторыю Русі. Кажучы дакладней, яму было гэта даручана Паўлам Гальшанскім і Альбрыхтам Гаштаўтам. Апынуўшыся паміж Сцылай заказу з боку ўлады і Харыбдай гістарычнай праўды (адсюль, відаць, назваў вусьце Нёману менавіта Скіляй), аўтар геніяльна прашмыгнуў між страшнымі скаламі. Заданьне выканаў, на першы погляд, згодна з зака-

Працяг на старонцы 36.

Пачатак са старонкі 35.

зам, хаця заказчыкаў відавочна не зусім задавальняў канчатковы вынік ягонай працы. Пасьля літоўцы памалу разьбіраліся ў сваёй сапраўднай гісторыі, і ў наступных рэдакцыях зьнікае славянская назва Жамойці, замест фантастычных даюцца імёны сапраўдных літоўскіх і жамойцкіх князёў. Тым ня менш, асноўны сэнс легенды заставаўся непарушным так доўга, як доўга на картах летапісаў і хронік красаваўся Палямон. Што нешта тут з гэтым Палямонам ня тое, адчуваў, відаць, Мікалай Венцлавовіч, сапраўдны літоўскі нацыяналіст (які схаваўся за літаратурным псэўданімам Міхалон Літвін), і адкінуў гэтую легенду. Рымскае паходжаньне літоўцаў ён даказваў на моўным матэрыяле. Дарэчы, Венцлавовіч дзесяцігодзьдзямі быў пісарам пры Альбрыхце Гаштаўце, дык напэўна ведаў аўтара легенды пра Палямона.

## Жамойцкая небыліца

Наш аўтар літоўскай мовы, відаць, ня ведаў. Паводле яго, рымскія прышэльцы спачатку назвалі сваю новую зямлю славянскай мовай, а толькі затым літоўскай. Да таго аўтар называў Жамойць па-славянску «Пабярэжнай зямлёй», хаця зь літоўскай мовы

> Ды колькі было тады ў Вільні русінаў, здольных чытаць антычных аўтараў і шкадаваць Сэнэку? Хто вядомы любоўю шыфраваць свае тэксты?

Жамойць перакладаецца на «славянскую» як «Ніжняя зямля». Улічыўшы, што Літва стала называцца «ад Жамойці», можна прачытаць славянскі адпаведнік «лацінскай» назвы «Літустуба» («Пабярэжная труба») і як «Жамойцкая труба». Далей, «трубы дубасныя» асацыююцца з фразэалягізмам «смаленыя дубы плясьці», які абазначае небыліцу, недарэчнасьць. Такім чынам, маем пэўнае права прачытаць назву «Літустуба» і як «жамойцкая небыліца», што добра перадае адносіны аўтара да ўсёй гісторыі.

Сюжэт з трубамі дазваляе ўдакладніць і тэрмін ad quem напісаньня твору. Польскі гісторык і географ Мацей Мяхоўскі зь недаверам прыводзіць чутку, што назва Літвы нібыта паходзіць ад лацінскага слова «lituus», якое абазначае «паляўнічую трубу». Значыць, чуў, што звоняць, але ня ведаў, у якой царкве. З гэтай згадкі вынікае, што легенда аб Палямоне ўзьнікла да другога выданьня «Трактату аб дзьвюх Сарматыях» Мяхоўскага у 1521 г., знаёмага мне з польскага перакладу. Магчыма, гэтая згадка ёсьць ужо ў першым выданьні 1517 г., якім скарыстацца я пакуль што ня меў магчымасьці.

«Вяртаючыся «воспак» да аўтара найвялікшай у гісторыі беларускай літаратуры маніпуляцыі, ды ня проста маніпуляцыі, а сапраўднага зьдзеку з заказчыка (ён надуў, ці, як кажуць ляхове, «zrobił w trąbę», усю паноўную нацыю), я разумею, што ў галаве чытача гэтых радкоў няўмольна паўстае пытаньне: хто ён, гэты геній літаратурнай маніпуляцыі? Адкажу рытарычным пытаньнем: ды колькі было тады ў Вільні русінаў, здольных чытаць антычных аўтараў і шкадаваць Сэнэку? Хто з усіх водаў, што абліваюць Эўропу, мог назваць якраз спалучэньне Паўночнага мора з Балтыйскім праз Дацкія пралівы? Хто вядомы любоўю шыфраваць свае тэксты? Так, так — ён, толькі ён…

Хто б ён ні быў, мусіў усьміхацца пад вусам, чуючы выхваляньне сваіх цёмных чытачоў іхным рымскім паходжаньнем. А ў карчме ў Вільні, калі сядзеў над куфлем піва са сваім найлепшым сябрам (з кімсьці ж мусіў сваёй таямніцай падзяліцца), таксама някепска начытаным, мабыць, аўтарам навагрудзкай часткі легенды, хапала, каб увайшоў пышны жамойцін. Тады сябры коратка абменьваюцца над куфлямі адным ім зразумелымі словамі: «Палямон!» — «Рымскі шляхціц!» — і заходзяцца ў шчырым, грэкарускім, проста гамэрычным сьмеху. Будзьма!



# З радзімы Сумара

Матэрыялы для гэтай кніжкі зьбіраліся этнографам яшчэ на пачатку XX ст., кніга выйшла ў 1928 г. Цяпер жа ўраджэнец тых самых мясьцін, якія апісваў Сербаў, прадпрымальнік Уладзімер Пясоцкі фундаваў перавыданьне манаграфіі.

Беларускі дасьледчык І.Сербаў на падставе цэлага комплексу адметнасьцяў вылучыў невялічкі этнаграфічны рэгіён — Вічынскую зямлю, утвораную вакол вёскі Вічын на левым беразе сярэдняга цячэньня Прыпяці (цяпер гэта ў Лунінецкім раёне). Вічынская зямля разьмешчаная ў бязьлеснай роўнай даліне, і жыхары яе называлі сябе палявымі людзьмі, альбо палянамі, у адрозьненьне ад палешукоў — жыхароў лясной часткі Палесься. Прытым палянін не лічыў палешука за роўнага сабе ды глядзеў на яго зьверху.

бог і лето даў, каб воны поўзалі: зімой не полезуць!»

Між тым сам Сербаў падкрэсьліваў, што паляне «выяўляюць зь сябе здаровы чысты народ, моцнага целаскладу і прыемнага выгляду», а «паміж вічынцамі часта сустракаюцца надзвычайна мілавідныя жанчыны і прыгожыя самавітыя мужчыны». І яшчэ: «Палянін адрозьніваецца сваімі здольнасьцямі і працавітасьцю». Можна быць прыгожым, здольным і працавітым, але жыць у брудзе.

Ня прага да прыгодаў, а ўсё тое ж пытаньне пра падзаробкі ўцягвала беларусаў у падарожжы. Многія вічынцы зьязджалі на працу ў Амэрыку. «У кожным селішчы ўжо маецца некалькі гэткіх «амэрыканцаў», якія, пражыўшы гады тры-чатыры на чужыне і сабраўшы крыху грошай, вяртаюцца дахаты і абзаводзяцца тут сваёй гаспадаркай, больш-менш па-новаму. Аднак вялікага ўплыву яны на акаляючае асяродзьдзе пакуль што ня робяць, наадварот, родная старына часта зьвяртае іх на бацькоўскую сядзібу».

*Можна быць прыгожым, здольным і працавітым, жывучы ў брудзе.*

Трэба адзначыць, што сам аўтар быў у вялікай ступені па-пазытывісцку настроены ў дачыненьні да этнаграфічнай мэтодыкі і не лічыў патрэбным з замілаваньнем апісваць сялянства. Крытычныя выказваньні на адрас беларусаў прагучалі задоўга да канца XX ст.: «Вічынскія селішчы, за невялікім, зразумела, выключэньнем, маюць бедны і вельмі непрыветлівы выгляд. Чысьціць рэгулярна вуліцу і двары тут наагул не прывыклі. Гэтая справа аддана самой прыродзе: усхопіцца вецер і падмяце ўсё начыста. Тут у селішчы ўсё навакол шэрае, збуцьвелае, паламанае».

Альбо вось ужо зусім постмадэрнісцкі сюжэт: «Да нас у школу прыйшла бабка Агапа Верас, зь дзіцем на руках. І вось, усе мухі, якія былі ў нас на кухні, зьляцеліся на Агапу і дзіцянё і разьмясьціліся кучамі на плямах сьвежае ежы, што засталася пасьля абеду ў яе на рукавох і на грудзёх. Мухі абляпілі рот і павольна нырalі ў носе. На запытаньне, чаму Агапа не адмахваецца ад гэтых дакучлівых кузурак, яна з чыста эпічнай павольнасьцю адказала: «Да навошчэ ж іх отгоняці? На то ж ім

Апроч вось гэтых зьвестак, што насуперак уласнае волі выводзяць нас на абагульненьні і актуальныя паралелі, чытач знойдзе ў этнаграфічных нарысах даволі багата прыкладной інфармацыі, якая можа спатрэбіцца ў самых нечаканых сытуацыях.

На апошнім адзначэньні дня сьв.Марціна, якое наладзіў наш галоўны тэарэтык кулінарыі Алесь Белы, кожны з гасьцей мусіў распавесьці за сталом апошнія ўражаньні, зьвязаныя зь ежай. Я прыгадаў, як каштаваў у Парыжы нармандзкія блінчыкі з грэчкі. Аповед выклікаў жывую рэакцыю гаспадара сустрэчы, аказваецца, ён разам з жонкай ужо экспэрымэнтаваў з грэцкімі блінчыкамі, і ў іх нічога не атрымалася. Бліны ўвесь час распадаліся. Трэба будзе неяк падказаць Алесю, што рэцэпт бліноў з грэчкі ён знойдзе ў кніжцы Сербава.

**Алег Дзярновіч**




**Сербаў І. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура. Этнаграфічны нарыс Беларускага Палесься /** Прад. Т.Навагродзкага, Я.Пясоцкай. — Менск: Беларускі фонд культуры, 2005. — 88 с.

## НОВЫЯ КНІГІ

**Краўчанка, Пётар. «Каб ні Ўсходняй, ні Заходняй ты была — сама сабой».** — [Бязь месца і году выданьня]. — 44 с.

Сабраныя ў гэтым зборніку артыкулы і выступленьні сьведчаць пра імкненьне палітыка, які цяпер жыве ў Маскве ды зарабляе на жыцьцё гандлем нафтаю, будаваць публічны імідж у Беларусі. Тыя некалькі рэцэптаў і парад, якія дае экс-міністар, сьведчаць, што П.Краўчанка расказаў далёка ня ўсё, што ведае пра палітычную кухню 1990-х. Палітык мяркуе, што «наша нацыянальная хвароба — гэта зайздрасьць».

**Летапіс дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны». 1989—2004** / Укл. І. Марачкіна, С. Суднік. — Менск, 2005. — 96 с. + 16 с. іл.

Актывісты ТБМ зрабілі спробу сыстэматызаваць і абагульніць рознабаковую працу ТБМ ад моманту Ўстаноўчага зьезду арганізацыі 27 чэрвеня 1989 г. Укладальнікі выданьня мяркуюць: «…у кнігу ня трапіла вельмі і вельмі многае зь дзейнасьці Таварыства, але тое, што сабрана, уяўляе сабой даволі глыбокі зрэз гэтай дзейнасьці». Таксама яны ж заклікаюць актывізаваць працу па складаньні гісторыі ТБМ, «каб яшчэ празь пяць гадоў мы маглі прэзэнтаваць на чарговым зьезьдзе ня толькі больш поўны Летапіс, а магчыма, і энцыкляпэдыю ТБМ». Зарана, сябры, думаеце вы пра энцыкляпэдыю. Вы патрэбны яшчэ жывыя.

**Роб-Грые, Ален. Праект рэвалюцыі ў Нью-Ёрку** / Пер. з фр. З. Коласа. — Менск: ІП Колас, 2005. — 216 с. — (Літаратурная скарбонка).

Гэтай кніжкай З.Колас заснаваў новую выдавецкую сэрыю «Літаратурная скарбонка». Твор аднаго з заснавальнікаў і тэарэтыкаў школы «новага раману» А. Роб-Грые ўвасабляе нараджэньне такога творчага кірунку, як «новая міталёгія». Кніжка не зьмяшчаецца ў клясычных жанрах дэтэктыву ці трылеру.

«Клацаньне засаўкі запускае ў мяне ў галаве мэханізм, да якога я ўжо прывык… Я пакінуў у жалезнай клетцы, на якую зноў павесіў замок, маленькі шкілет іншай дзяўчыны — той, што не падышла нямецкаму тэлебачаньню…»

**АДз**

# Поўны рот каўбасы

Клічаўшчына абняславілася гіганцкай махлярскай акцыяй. Аўстрыйцы схамянуліся, толькі калі кампэнсацыі сталі атрымліваць людзі, народжаныя пасьля вайны... Рэпартаж з Клічаўскага раёну **Аляксея Бацюкова.**



### Край чужых партызан

Клічаўшчына — гэта калі наўкола адзін лес. Калі невысокі зарасьнік з дробным і голым ствольлем абступае дарогу, палі, не даючы разгулящца погляду і як губка ўбіраючы ў сябе вашу думку і волю. На самых ускрайках раёну ёсьць вёскі, да якіх не пракладзена дарог, ня тое што тэлефона. Далёкія ад усіх буйных гарадоў, людзі здаўна прывучыліся жыць, разьлічваючы толькі на сябе.

Вёска Гонча паўстала трыста гадоў таму — тут сяліліся ганчары. Пасьля рэвалюцыі вяскоўцы разабралі зямлю і расьсяліліся па хутарах. «Ох, добра жылі!» — аж прымружваецца мой суразмоўнік у асалодзе. Спадар Іван шляхецкай фаміліі пацьвярджае гэта з гонарам, хоць і ня ўпэўнена. Вэтэран, прайшоў фінскую вайну, браў лінію Манэргейма, абараняў Ленінград — паказвае прастрэленае плячо. Быў вязьнем. «Пра гэта падрабязьней», — прашу яго.

Часьцей за ўсё пра раён вы пачуеце ўсяго адно ёмістае азначэньне — партызанскі край. Панятак ператварыўся ў шаблён і нярэдка ўводзіць у зман чалавека, не знаёмага з рэальнай Клічаўшчынай. У часы вайны тут сапраўды была адна з самых вялікіх на Беларусі партызанскіх зон. Увесну 1942-га Клічаў нават на тры дні быў вызвалены партызанамі ад немцаў. Аднак партызанілі тут рэшткі Чырвонай Арміі, дывэрсанты з-за лініі фронту і камсамольцы з усёй Магілёўшчыны. Яны, а не мясцовы люд сталі ядром партызанскага руху тут.

Адпаведныя органы зацікавіліся Клічаўшчынай, калі раён выйшаў у рэкардсмэны па наяўнасьці асабістых аўтамабіляў і падняліся цэны на жыльлё.

### «Грэх ня ўзяць»

Клічаўшчына абняславілася гіганцкай махлярскай акцыяй. У 2000—2001 гадах незьлічоная колькасьць жыхароў раёну атрымалі кампэнсацыі ад аўстрыйскага дабрачыннага фонду як вязьні канцлягераў.

Пасьля таго, як у 1993—1997 гг. нямецкі і аўстрыйскі ўрады выплацілі кампэнсацыі беларускім вязьням нацысцкіх канцлягераў, чый статус быў афіцыйна пацьверджаны па архіўных зьвестках, у Аўстрыі і Нямеччыне была заснавана недзяржаўная арганізацыя «Памяць. Адказнасьць. Будучыня». Яе стварылі буйныя прамыслоўцы, якія палічылі, што грошай, выплачаных урадамі іх краін, было мала для рэальнай кампэнсацыі вязьням. Было таксама ўзята пад увагу тое, што засталася незадаволенай агромністая частка вязьняў, зьвестак пра якіх не захавалася ў архівах. Цяпер выплачваліся грошы тым людзям, што не маглі падаць ніякага дакумэнту пра сваё выгнаньне ў Нямеччыну. Патрабаваліся толькі сьведчаньні двух іншых, афіцыйна зарэгістраваных вязьняў.

У 2000 г. Клічаўшчыну наведалі прадстаўнікі іншага, аўстрыйскага фонду, каб правесьці чарговую сэрыю выплат. Чаму выбралі менавіта гэты раён, загадка. Паводле новых умоў, для атрыманьня кампэнсацыі ўжо не абавязкова было мець сьведак, хапала ўспамінаў.

Гэта значыць, гіпатэтычна любы жыхар раёну, якому ў

часе нямецкай акупацыі было хаця б некалькі дзён, мог падаць заяву на атрыманьне кампэнсацыі. Толькі да заявы патрабаваліся ўспаміны — здабыць іх было ўжо ў чалавечых сілах. «Калі зьявілася такая магчымасьць, — сьмяецца жанчына, зь якой мы разгаварыліся ў вясковым доме культуры, — грэх ня ўзяць!»

«Падрабязьней», — прашу вэтэрана Івана Сьцяпанавіча са шляхецкім прозьвішчам. «І я атрымаў кампэнсацыю, — адказвае спакойна, разважліва, — але я ў лягеры быў. А мой сусед В-вік ня быў і атрымаў. Шмат хто атрымаў. Та-ак», — засяроджана ківае. Ці ён іх асуджае, гэтых несапраўдных вязьняў? Не.

Лёгіка людзей, якія пісалі падробныя анкеты, была простая. Яны перажылі вайну. У іх пад нагамі гарэла зямля. І вайну пачыналі не яны. У гэтага загінуў брат, той да сёньня памятае месца, дзе да вайны стаяла хата. Вялікая, і яблыні каля яе — яшчэ цьвітуць. Спалілі немцы. Вайна на Клічаўшчыне была бязьлітасная. Тут ёсьць свая Хатынь — вёска Боркі, спаленая зь дзьвюма тысячамі жыхароў. Вось ён, меркаваны разлом сьвядомасьці — як зарыентавацца паміж пакутамі і махлярствам? Што было сапраўднае?

## Бяруць і ад нашых, і ад немцаў

«Дзед Іван?» — грэбліва сьмяецца немаладая жанчына зь мясцовай улады. І дзесяць разоў моліць: нідзе не пішыце маё імя. «Яны мяне растопчуць, я тут жыць не змагу». «Што дзед Іван?» — не адступаю я. «Знаем гэтага дзеда. Плячо сабе прастрэліў, цяпер паказвае — паранены быў. Ён з такіх, што і да афіцыйных узнагарод прагны, і ад немцаў хоча атрымаць».

Сьцены сельсавету ператвараюцца ў абарончы вал ад хцівых аднавяскоўцаў. Жанчына адначасова ня можа маўчаць і баіцца гаварыць. Азіраецца на акно, нібыта ўся вёска ўжо сабралася паслухаць, што яна кажа журналісту.

## 300 эўра за паслугі вязьня

«Гэта быў ажыятаж», — другі раз за дзень чую я. Суседка хавалася ад суседкі. Пісалі анкеты аўстрыйцам сем'ямі. Таемна, ціха, нікому ня кажучы. Аднак пісалі ўсе, і ўсе ўсё ведалі. Тыя, у каго не было вязьняў сярод родных, падкуплялі знаёмых. Бывалі выпадкі, арганізоўваліся цэлыя кампаніі камэрсантаў, якія езьдзілі па вёсках і прапаноўвалі за 100—300 эўра «аформіць» успаміны і сапраўднага вязьня ў сьведкі. Апошняе давала большую гарантыю кампэнсацыі.

Безыменная жанчына выкрывае з жарсьцю і злосьцю. «У нас тут такія людзі — таемна пашлюць анкету, дзеля гэтых грошай, каб потым на бяседзе сказаць: «А я, суседка, каўбасу ем у поўны рот».

Адпаведныя органы зацікавіліся Клічаўшчынай, калі ў раёне стаў рэзка расьці дабрабыт. Раён выйшаў у рэкардсмэны па наяўнасьці асабістых аўтамабіляў на тысячу чалавек. Падняліся цэны на жыльлё ў самім Клічаве. Ні ў адным з дамоў я ня ўбачыў старога тэлевізара. Рэдкая хата неабшаляваная і непафарбаваная. Не зьмяніліся толькі вуліцы, дарогі, платы на цэнтральных вуліцах вёсак. Бо не свае, дзяржаўныя.

## Людзі зь іншага сьвету

Веру дзеду-вэтэрану і ня веру. Маладжавы, жыцьцярадасны, з параненым плячом. Быў у палоне — веру. Але жонка яго таксама атрымала кампэнсацыю. Пытаюся, у якім лягеры яна была. «Тут была», — няпэўна адказвае ён. У акупацыі — лічы што ў лягеры.

Веру гэтай безыменнай жанчыне і ня веру. Веру, бо выкрывае, і ня веру, бо ёй яўна меней за шэсьцьдзесят. Яна ня мела спакусы.

Веру ў пакуты людзей ваеннага часу. Веру, што быў боль. Ня ведаю, як можна паверыць махлярам. Паводле сьціп- лых падлікаў, у адным толькі Ганчанскім сельсавеце кампэнсацыю атрымалі каля двухсот чалавек. Рэальных вязьняў зарэгістравана восем.



УЛАДЗІМЕР НЕДАБОЕЎ

**У Гончаўскім сельсавеце кампэнсацыю атрымалі каля двухсот чалавек. Рэальных вязьняў зарэгістравана восем.**

Жанчына, якая прайшла нямецкія канцлягеры: «Яны мяне ненавідзяць, бо я сапраўды была там».

**Цяпер гастарбайтэрам хацеў быць кожны.**


Arbeitskarte
für
ausländische Arbeitskräfte

І тыя цяпер атакаваныя з двух бакоў. На маю спробу сустрэцца зь яшчэ адным сапраўдным вязьнем яе дачка толькі замахала рукамі. «Мама нічога ня памятае». Маўляў, ведаю, што вы пра яе скажаце.

Дыскрэдытаванымі аказаліся ўсе: і несапраўдныя, і сапраўдныя вязьні. Другая жанчына, якая таксама прайшла нямецкія канцлягеры, усё памятала, але нічога ня стала гаварыць пра суседзяў. «Яны і так мяне ненавідзяць — сапраўды была там. А цяпер і зусім задзяўбуць».

Дарога дадому была як дарога зь іншага сьвету. Са сьвету людзей, якія не гавораць праўды, якія жывуць дзеля сябе, якія ня хочуць мець імёнаў і права выказацца ўголас. Са сьвету людзей з поўным ротам каўбасы.

Бываюць такія процілеглыя паняцьці, процілегласьць якіх, нягледзячы на законы дыялектыкі, ніколі не ўяўляе адзінства. Напрыклад, гераізм і хцівасьць. Або пакуты і махлярствы.

Іх не аб'ядноўваеш у адно, зь іх выбіраеш.

Аўстрыйцы схамянуліся, толькі калі на кампэнсацыі сталі нахабна падаваць людзі, народжаныя пасьля вайны... Аўстрыйская прэса назвала «клічаўскае шулерства» махляжом дзесяцігодзьдзя. Цікавасьць адпаведных беларускіх органаў ня вылілася ў крымінальныя справы: адсутны пацярпелы бок. Усім добра, ніхто не вінаваты.

*Клічаў—Магілёў*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Памежнікі жартуюць. Новы год у камэндатуры Гудагай Смаргонскага пагранатраду адзначыўся затрыманьнем Дзеда Мароза.**

# Цуд на Каляды

Як беларусы прыходзяць да роднай мовы? Кожны па-свойму. На **Андрэя Хадановіча** паўплываў... **Дзед Мароз.**



Разумныя людзі, ад грэцкіх філёзафаў да беларускага паэта Ўладзімера Някляева, выказвалі гіпотэзу, што напраўду чалавек бывае свабодны толькі двойчы, у часе двух вялікіх падарожжаў, пярэбараў з таго сьвету на гэты й з гэтага на той.

На шчасьце, паміж гэтымі архіважнымі падзеямі ў нашым жыцьці надараюцца й драбнейшыя, звычайныя цуды, дзівоснасьць якіх намякае на нешта большае, чым яны самі.

…Я быў яшчэ дашкольнікам і, як бальшыня маіх савецкіх раўналеткаў, ня ведаў, што такое Каляды, і адзначаў выключна Новы год. Таксама нічагуські ня знаў я і пра магаў — Каспара, Бальтазара й Мэльхіёра. Апошняе імя асацыявалася ў мяне адно з сталовымі прыборамі. Ня ведаў і пра іхныя дары — золата, ладан. А «сьмірна» была для мяне вайсковай камандаю з тэлеперадачы «Служу Савецкаму Саюзу». Затое сам я быў бясспрэчным чэмпіёнам па атрыманьні падарункаў пад вечназялёнай расьлінаю ў зырківх шарыках і яскравых лямпачках, што ўставала ў мяне дома пад Новы год. І мне ў гэтым зусім не заміналі дзьве постаці, што несьлі пад ялінкай сваю варту, — Дзед Мароз і ўдвая вышэйшая і зграбнейшая ад яго Сьнягурка, нібы ўлюбёная топ-мадэлька побач з старым модным кутур'е, пра існаваньне якіх я, зрэшты, таксама тады ня ведаў. Затое я напэўна ведаў, што калі 1 студзеня ўстану раней за сяброўку, якая прыехала сьвяткаваць Новы год да нас, то знайду пад елкаю-ёлкаю ня толькі свой, але і ейны прэзэнт, і толькі цуд зможа ўратаваць яе ад гэтага.

І вось аднойчы бацька прывёў мяне на сьвяткаваньне Новага году ў Дом літаратара. Тамтэйшы бар уразіў мяне багатым выбарам шакалядных вырабаў. Магчыма, я адзіны беларускі паэт, для якога славуты бар асацыюецца ня з моцнымі напоямі, а зь нявіннай шакаляднаю пліткай. Менавіта ейны смак суняў маё хваляваньне перад архіадказнаю аўдыенцыяй.

Юныя наведнікі Дому літаратара сустракаліся ў той дзень зь мясцовым Дзедам Марозам, расказвалі яму вершыкі й сьпявалі песенькі, за што атрымлівалі з шчодрых рук навагоднія падарункі — свае першыя літаратурныя ўзнагароды. Наконадні сьвяточнай падзеі бацька вывучыў з мною навагодні вершык. Калі не памыляюся, гэта быў першы тэкст на беларускай мове, што трапіў у поле маёй увагі. Мова мяне крыху зьдзівіла. У мяне былі сур'ёзныя падазрэньні, што жывыя людзі так не гавораць. І напраўду, выявілася, што я быў адзіным на імпрэзе дзіцём, якое чытала верш на гэтай мове. Але ж знайшлася істота, што падтрымала мой высакародны парыў. Сівабароды Дзед Мароз гаварыў па-беларуску!

Мая тэорыя спраўджвалася. Звычайныя людзі так не гавораць, але ж Дзед Мароз быў стварэньнем казачным, незямным. Я быў узрушаны й перакананы: *беларуская мова — мова Дзядоў Марозаў…* З часам калядна-шакалядная магія часткова разьвеялася, але вершык я ведаю на памяць дагэтуль.

Мінулі гады. Беларусь здабыла незалежнасьць. Па-дзівоснаму раптоўна, як калядны падарунак, і, як бывае з падарункамі, не да канца заслужана.

. Беларуская мова — прынамсі, фармальна — на некалькі год зрабілася адзінаю дзяржаўнаю. А беларускія дзеці дазналіся, што апроч Новага году ёсьць яшчэ й Каляды, а па-за Дзедам Марозам — і Сьвяты Мікалай. Як сьцьвярджае тэлебачаньне, ён працуе кіроўцам вялізарнай чырвонай фуры, на якой развозіць дзеткам «Кока-Колу» — на зайздрасьць незваротна пасталеламу пакаленьню «Пэпсі».

І раптам выявілася, што ў Беларусі ня так ужо й мала моладзі майго пакаленьня валодае беларускаю нічым ня горай за таго «літаратурнага» Дзеда Мароза. Моладзі, для якой «кола» — гэта ня толькі калядны напой, але й прадмет круглай формы; моладзі, што сама стварае вершы й песьні, якія ня сорамна было б выканаць перад навагоднім дзядунем з вуліцы Фрунзэ, 5.

Час ад часу гэтыя мальцы гуртуюцца на якім-небудзь школьным стадыёне, каб пагуляць у футбол. І тады пацаны з навакольных дамоў, што далучаюцца да іх, чуюць дзіўныя словы, якіх не пачуеш ад камэнтатараў БТ: «апука», «брамнік», «нападнік», «кутні», ці нават «рагавы». Хто ведае, мо для гэтых падлеткаў наша мова — такі самы цуд, якім для мяне была мова Дзеда Мароза?..

Прыходзячы заўзяць на «Дынама», гэтая моладзь прыносіць з сабою нашыя сьцягі забароненых колераў, за што яе тутсама арыштоўваюць заўзятары ў цывільным. Гэтыя тыпы добра ведаюць у твар шмат каго з арыштаваных, бо бачылі іх ня толькі на стадыёнах.

Афіцыйная прапаганда называе гэтых мальцаў са сьцягамі «адмарозкамі». Ці не таму, што ў дзяцінстве кожнага зь іх адбылася сустрэча са сваім беларускім Дзедам Марозам?

Нават у судзе гэтыя мальцы не жадаюць адказваць на пытаньні па-расійску й заўзята патрабуюць беларускага перакладніка. Што імі рухае? Магчыма, яны таксама прыйшлі да формулы, што па-сапраўднаму свабодным чалавек бывае двойчы: зьяўляючыся ў гэтым сьвеце й сыходзячы зь яго? А гэта значыць, што, акрамя дзіцячага пакою міліцыі, ёсьць яшчэ й яна, нябесная канцылярыя, дзе, у апошні раз адказваючы за свае дрэнныя паводзіны, можна будзе адказваць, як думаеш, – не патрабуючы перакладніка.

*(газэтны варыянт)*



# Калядкі

УЧОРА ЗЬВЯЧОРА

Учора зьвячора*
Засьвяціла зора.
Зора засьвяціла,
Сьвет узьвесяліла.
Сьвет узьвесяліўся:
Хрыстос нарадзіўся.
Хрыстова раджэньне
Людзям на збаўленьне.
Людзі, выбягайце,
Хрыста прывітайце.
Хрыста прывітайце,
Нам каляду дайце.

* Кожны радок сьпяваецца двойчы.



НОВА РАДАСЬЦЬ СТАЛА

Нова радасьць стала,
Яка не бывала.
Над Бэтлемам зьвезда ясна,
Сьветла засіяла.

Там Хрыстос радзіўся,
Зь Дзевы ўцелавіўся,
На нябесі і на землі
Нам дабраславіўся.

Ангелы сьпяваюць,
Ісуса вітаюць,
На нябесі і на землі
Мір правазглашаюць!

НЕБА І ЗЕМЛЯ

Неба і земля,
Неба і земля,
Радасна сьпяваюць.
Анёлы сьвету,
Анёлы сьвету
Дзіва абвяшчаюць.

Прыпеў:

Хрыстос нарадзіўся,
Бог аб'явіўся,
Анёлы сьпяваюць,
Пастушкі іграюць,
Дзіва-дзіва абвяшчаюць.

У Бэтлееме,
У Бэтлееме
Вясёла навіна
Чыстая Дзева,
Чыстая Дзева
Нарадзіла Сына.

Прыпеў.

А мы Дзіцятку,
А мы Дзіцятку
Богу паклон дайма.
Славу на вышынях,
Славу на вышынях
Яму засьпявайма.

Прыпеў.

ЦІХАЯ НОЧ

Ціхая ноч, сьвятая ноч!
Усё сьпіць, сьніць даўно.
Толькі Маці Сьвятая усьцяж
Ціха ў ясьлях люляе Дзіця —
Сьпі, Сыночак малы,
Люлі-люлі, сьпі!

А угары усё гарыць
Серабром зорных крыг,
Хор анёлаў пяе пастухом
Аб Дзіцяці, што будзе Хрыстом,
Сьветлай песьняй хвалы
Славяць Збаўцу зямлі.

Ціхая ноч, сьвятая ноч,
Ў родны край завітай,
Людзям сум і тугу разгані,
Хай жа цешацца ў гэтыя дні,
Ў ціхую, сьвятую ноч,
Ў ціхую, сьвятую ноч!

ДОБРЫ ВЕЧАР ТОМУ

Добры вечар тому*,
Хто ў гэтаму дому!
Мы самі з сабою,
Зь дзецьмі і жаною,
Сталы засьцілаем,
Каляды спраўляем.
А па гэтай мове
Будзьма ўсе здаровы,
А па гэтай казцы
Жывіце ў ласцы.

* Кожны радок сьпяваецца двойчы.

ЗОРА ЗАСЬВЯЦІЛА

Учора зьвячора зора засьвяціла,
Новы год, новы, зора засьвяціла.

А Божая Маці Сына нарадзіла,
Новы год, новы, Сына нарадзіла.

Сына нарадзіла, у пялёны спавіла,
Новы год, новы, у пялёны спавіла.

У пялёны спавіла, анёлам сказала,
Новы год, новы, анёлам сказала:

«Анёлы сьвятыя, калышыце Сына,
Новы год, новы, калышыце Сына.

Калышыце Сына, пойце Яму песьні,
Новы год, новы, пойце Яму песьні.

Пойце Яму песьні, да ўсё і сьвятыя,
Новы год, новы, да ўсё і сьвятыя».

Усе людзі рады, усе весяляцца,
Новы год, новы, усе весяляцца.

На Божага Сына ўсё не наглядзяцца,
Новы год, новы, ўсё не наглядзяцца.

НА НОВА ЛЕТА РАДЗІ, БОЖА, ЖЫТА

На нова лета радзі, Божа, жыта,
Шчодры вячор, багаты вячор*,
Жыта пшаніца, усякая пашніца,
Дай табе Божа, пане-гаспадару,
Піва варыці, сынкоў жаніці,
Гарэліцу гнаці, дачок выдаваці,
Залезь на баляску і дастань каўбаску!
Стань на драбінку і дастань саланінку!
Кошычак маку да таго прысмаку.
Збаночак мёду нам на асалоду.

*Паўтараецца пасьля кожнага радка.



# Нашто існуе Раства

## КСЁНДЗ ЯН ТВАРДОЎСКІ


WWW.VULKAN.EDU.PL

### «У БЭТЛЕЕМЕ, УБОГІМ ДОМЕ…»

У тую ноч, якая шчэ ня ведала, што яна сьвятая,
ні лісьліўцы,
ні падлізы,
ні кандыдаты ў саноўнікі,
ні службоўцы,
ні спрытнюгі,
ні ганарліўцы, якія «былі там першыя»,
ні рэпартэры з тэленавінаў, ні журналісты,
але найбліжэйшыя,
заўсёды родныя,
непісьменныя зь вялікім сэрцам
і тыя цары, што шукаюць,
беглі стрывожаныя —
ці не прастудзіўся Ён,
ці зорка Яго не спалохала зблізку,
ці сухія ў Яго пялюшкі,
ці не ахрып Ён пад пекныя сьпевы анёла,
ці ня колка Яму на сене,
ці асёл ня брыкнуў свайго большага брата —
паважнага вала.
Пакуль разумнікі абураліся,
усёмагутны Бог стаў чалавечым дзіцем
і бязрадна выцягнуў рукі,
а сьвет не перакуліўся,
толькі — згорблены — усьміхнуўся
і пачаў выпростваць сьпіну.

1970, 1995

### ПРА ФІРАНКІ Ў СТАЙНІ

Каб тады, у сьвятую ноч,
калі сьвяціла адна зразумелая зорка,
яны прыйшлі да Цябе
зь верай, што трэба ўсё мець, каб не перастаць быць,
баючыся бездапаможнасьці Твайго нараджэньня,
можа, яны б укрылі Цябе цёплаю коўдрай,
павесілі ў стайні фіранкі,
справілі сьвятому Язэпу пальчаткі,
а лепей — тоўстыя рукавіцы,
правялі цэнтральнае ацяпленьне.
Самыя важныя прасілі б для Цябе ў жылканторы
кватэру з выгодамі,
каб Ты не туліўся па чужых кутах.
Скептыкі ўбачылі б у гарэзьлівым восьліку
траянскага поні зь нячыстым сумленьнем.
Самыя адважныя пратэставалі б, спасылаючыся
на Дэклярацыю правоў чалавека й грамадзяніна
і ўсе дэкрэты пра свабоду веравызнаньня.
Паэты б упрыгожвалі Бэтлеем лірычнымі выкрутасамі,
мастакі мазалі б залатым пэндзлем.
У найлепшым выпадку Табе маліліся б,
як маленькаму алігарху,
якога наўмысна паклалі тут на сена,
а ты тлумачыў бы шырока адкрытымі вачыма,
тулячыся шчакою да замерзлай маці,
што Ты напраўду ёсьць,
а таму аддаеш усё.

1969

### НАШТО ІСНУЕ РАСТВА

Нашто існуе Раства?
Нашто мы ўглядаемся ў зорку на небе?
Нашто сьпяваем калядкі?

На тое, каб вучыцца Божай любові,
На тое, каб падаваць адно аднаму рукі,
На тое, каб усьміхацца адно аднаму,

На тое, каб адно аднаму прабачаць,

Каб ніводная чараўніца праз трыццаць гадоў
не зрабілася ведзьмай.

1973

**Пераклаў з польскай**
**Андрэй Хадановіч**



АКСАНА ІГНАШЧАНКА

# Робін–Бобін

Робін–Бобін–Ненажэра
схрумаў міліцыянэра!
Зьеў каня, і сем цялят,
і дванаццаць парасят!
Згрыз палац, і пяць дамоў,
і трынаццаць караблёў,
згамаў кузьню, каваля
і самога караля!
Лёндан зьеў і Лівэрпуль,
выпіў рэчку — буль–буль–буль,
зжэр карову і быка,
рака, жабу і жука!..
Загарні хутчэй старонку,
каб цябе хоць ён ня зьеў!

**Паводле ангельскай песьні й украінскага перасьпеву Івана Малкавіча пераклаў па-беларуску Мікола Бугай.**

# Шахматныя вынікі году

2005 г. для шахматыстаў Беларусі аказаўся ўдалым. Валтузьня вакол Фішэра ды Каспарава, сусьветны посьпех Тапалава паспрыялі ажыўленьню шахматнага жыцьця ў краіне. Інтрыгоўныя чэмпіянаты сярод мужчынаў, жанчын, дзяцей, міжклюбныя баталіі, адроджаны міжнародны оўпэн-турнір у Менску — усе гэтыя падзеі асьвятляліся ў «НН».

Найбольш яскрава сябе праявілі сёлета гросмайстры Аляксей Фёдараў, Ігар Люцко, Андрэй Кавалёў. Першы вярнуў сабе тытул чэмпіёна краіны ды нядаўна пазмагаўся ў ханты-мансійскім Кубку сьвету, дзе на тай-брэйку прайграў сэкунданту Тапалава, бліскучаму аналітыку Івану Чапарынаву. Другі, пасьля шэрагу параз, здолеў утрымацца ў дзясятцы лепшых беларускіх шахматыстаў. Трэці перамог у неафіцыйным чэмпіянаце Эўропы ў Пардубіцах.

Радаваў аматараў напорыстай гульнёй віцэ-чэмпіён Беларусі Юры Ціханаў, амбітны 32-гадовы гарадзенец Андрэй Сьвятоха стаў бронзавым прызэрам у чэмпіянаце кантынэнту сярод інвалідаў.

Сярод прадстаўніц прыгожага полу па-за канкурэнцыяй была міжнародная майстарка 20-гадовая Ганна Шарэвіч. Тройчы чэмпіёнка Беларусі паволі падбіраецца да сусьветнага Алімпу.

Адкрыцьцём году стаў 11-гадовы Давід Хачыкян з Баранавіч. Перапісачнік Зьміцер Лыбін атрымаў ня толькі сярэбраны мэдаль ІКЧФ, а і ганаровы знак міжнароднага арбітра ФІДЭ, урачыста перададзены яму 13 лістапада ў клюбе «Вясьнянка» з рук легендарнага Давіда Бранштэйна. Віцэ-чэмпіён сьвету 1951—1954 гг. пасяліўся ў Менску, але нячаста зьяўляецца на публіцы — здароўе ня тое.

Цягам году спраўна выдаваўся бюлетэнь для кампазытараў «Альбино», функцыянаваў партал «Bychess. narod.ru», узьніклі новыя сайты: «Шахматы ў Магілёве» (mogilew-chess.narod.ru), «Жаночыя шахматы» (female chess.narod.ru), «Шахматныя навіны Беларусі» (sportby. narod.ru/chess.html). Упершыню ў Беларусі выйшлі паштовыя маркі і кішэнны каляндарык на тэму шахмат.

Здараліся прыкрасьці. У шахматнага клюбу «Стратэг» у Палацы дзяцей і моладзі забралі цэлы кабінэт. На пачатку году студэнтка пэдунівэрсытэту Алена Клімец перадала фэдэрацыі шахмат праект, паводле якога штогод мусілі выбірацца і ўзнагароджвацца найлепшыя трэнэры краіны. Але праект патануў ва ўзгадненьнях, так што галасаваць за прэтэндэнтаў на беларускі шахматны «Оскар» пакуль не выпадае.

**ВР**



### Як бы вы згулялі?

А.Крупеніч — У.Ліцьвін. Чэмпіянат Слоніму, 2005. Ход чорных.

**Адказ:** 1...Кf3! 2. Те8 Кg3+! 3. hg Фh5+ 4. Сh4 Фb5 і чорныя выйгралі. Творчае дасягненне дэлегата зьезду БНФ!

# «Песьні свабоды»: складзем дыск разам!

Увага! Рыхтуецца да выданьня альбом беларускай музыкі «Песьні Свабоды».

Выдаўцы зьвяртаюцца да чытачоў «Нашай Нівы» з просьбай прапанаваць пяць песень, якія найбольш вартыя для гэтай складанкі.
Просьба запоўніць купон і даслаць на адрас: **а/с 5, 220085, Менск, (для Віталя). Таксама можна скарыстацца e-mail: pesni2006@tut.by**

Кожны, хто дашле купон, атрымае ў ПАДАРУНАК кампакт–дыск! Дасылайце купон да 15 студзеня. Выканаўцы, што жадаюць прапанаваць свае творы, могуць зьвяртацца па вышэй пазначаных кантактах.

| **Назва гурту** | **Назва песьні** |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |
| **Імя** | **Кантакт (e-mail, тэлефон)** |



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зрабі з газэты кнігу



«Нашу Ніву» ў новым фармаце зручна пераплятаць у квартальнікі ці гадавікі.


**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284–68–18, 284–72–17, 284–81–07
8–029–6–400–100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284–81–84
284–32–72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285–79–29
8–029–645–99–54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284–37–07
8–029–622–83–01
8–029–622–83–04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22–77–133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8–029–388–40–82
8–029–570–74–11
8–029–400–48–55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8–029–758–06–16, 774–62–13
8–029–341–17–29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211–00–63/64/65, 226–45–48
8–029–643–80–77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**8** (ндз) — «Смак яблыка».
**9** (пн) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**11** (ср), **12** (чц) — «Ідылія».

**Ранішнія спэктаклі**
**8** (ндз) – «Паўлінка».

**Малая сцэна**
**8** (ндз) — «Саламея».

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар юнага гледача**
**8** (ндз) — «Паліяна».
**15** (ндз) — «Шлях на Бэтлеем».

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**Зламаныя кветкі**
Драма, ЗША, 2005,
рэж. **Джым Джармуш.**
У ролях: **Б.Мюрэй, Дж.Райт, Ш.Стоўн.**
Герой наведвае чатырох палюбоўніц, каб даведацца, ад каго ў яго сын.
**Менск, Кісялёва, 12, тэл.: 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Магі і Сярдзючка

«Гары Потэр і Келіх Агню» («Harry Potter and the Goblet of Fire»).

ЗША—Вялікабрытанія, 2005, каляровы, 157 хв.

**Жанр:** фэнтэзі, казка паводле Дж.Роўлінг.

**Адзнака:** 7 (з 10).

Моцны бок стужкі Майка Ньюэла — дакладнасьць экранізацыі. Падводныя выпрабаваньні, чорны знак, цмокі, змрочныя фарбы. Варта адзначыць, што да герояў прыходзіць каханьне, таму на маленькіх дзетак кіно не разьлічанае.

«Дзённы дазор» («Дневной дозор»).

Расея, 2005, каляровы, 142 хв.

**Жанр:** містычны баявік.

**Адзнака:** 5,5 (з 10).

Нехта забівае цёмных чараўнікоў. Алібі ня мае сьветлы маг Антон Гарадзецкі (К.Хабенскі)… У 2-й частцы «Дазору» шмат сэксу. Гарадзецкі (у целе каляжанкі Вольгі) прызнаецца ў каханьні да магіні Сьветы (глямурная лесьбійская сцэна прыкладаецца); ведзьма Аліса (Жанна Фрыске) пакутуе ад непадзеленага каханьня да вампіра Косьці... Сярод запрошаных VIP-пэрсонаў Арцём Троіцкі й Барыс Маісееў (пад сваімі імёнамі). Статусныя спэцэфэкты: астанкінская вежа падае, кола агляду коціцца па горадзе. Фільм спадабаецца аматарам Веркі Сярдзючкі. Пагоня на матацыклах ідзе пад песьню травэстыйнае прымадоны.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 7 студзеня

**АНТ, 16.10**

«Дванаццаць крэслаў», 1-я і 2-я сэрыі.

Расея, 1977, рэж. Марк Захараў.

Камэдыя паводле раману Ільфа і Пятрова з А.Міронавым, А.Папанавым, Р.Быкавым.

**БТ, 19.25**

«Дзень поўні».

Расея, 1998, рэж. Карэн Шахназараў.

Кінапрыпавесьць.

Калейдаскоп імгненьняў ад Карэна Шахназарава. «Новыя рускія» і княжна Альшанская, таямнічы манах і ды-джэй вядоўца, стары ўзбэк, пасьпяховы кілер... Рэальнасьць пераплеценая з успамінамі, паэтычнае вандраваньне ў прасторы й часе.

### Нядзеля, 8 студзеня

**«Лад», 10.25**

«Бясконцая гісторыя».

Нямеччына—ЗША, 1984, рэж. Вольфганг Пэтэрсэн.

Фэнтэзі, казка.

Малы Бастыян знаходзіць кнігу «Бясконцая гісторыя» і трапляе ў краіну Фантазію, дзе жывуць Камняежка, лагодны цмок, маленькая прынцэса і дзе герой Атрэю ратуе краіну ад Пустаты.

**AP**





ЯКУБ КОЛАС
Сымон–музыка
містэрыя ў 2–х дзеях
16, 20, 30 студзеня
пн., пт., пн.
Купалаўскі тэатар
вул.Энгельса, 7
быць

## У НУМАРЫ



### Імпэрыя наносіць удар у адказ

Вынікі газавай атакі Расеі на Ўкраіну аналізуюць Віталь Тарас і Аляксандар Класоўскі. **Старонка 28.**

### Сюрпрызы прэзыдэнцкай кампаніі



Праляскоўскі — у адстаўцы. Хто супраць Лукашэнкі, галасуе ад 12-й да 14-й. Пазьняк прапануе «народнае галасаваньне». **Старонка 8.**



### Вось сымбаль твой…

74-дзённай галадоўкай ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч дабіўся вызваленьня з турмы. За час галадоўкі 40-гадовы Мікалай Аўтуховіч страціў 40 кг. **Старонка 11.**



### Сьвет узьвесяліўся

Між Калядамі. **Старонкі 40—43.**

### Як дыхаць у беспаветранай прасторы



Прэм'ера Свабоднага тэатру. **Старонка 19.**

## ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Газ, славяне!

Газавая блякада братняй Украіны — пісец панслявізму. Аднак пацыента яшчэ можна адкачаць. Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Канстатуем сумны факт: 1 студзеня кіраўнікі Расеі раптоўна пахавалі ўсе напрацоўкі Данілеўскага, Хамякова, Аксакава, Скобелева і іншых аракулаў ідэі наднацыянальнай абшчагі славянаў, у якой адносіны грунтуюцца на каштоўнасьцях братэрства. Пачынаючы з 1.01.06 мы не народы-браты, а рынкавыя суб'екты, якія кантактуюць паводле прынцыпу «No money — no funny». Заламіць з Мацеры гарадоў рускіх удвая больш бабла за газ, чым зь нейкіх туркаў — найлепшае сьведчаньне клімаксу нашага цывілізацыйнага фратэрнітэ.

Адзін, каму пашэнціла — беларусы, аднак у рэзонах «Газпрому» мулька наконт славянскага пхай-пхай таксама не фігуруе. Бедныя прыхільнікі Данілеўскага! Яны трапілі ў парадаксальную сытуацыю. Цяпер, каб захаваць свой мэгапраект, або трэба Пуціна абвесьціць варожым агентам у Крамлі, або выдаць рашэньне ад 1.01.06 за выпадковую памылку. Відавочна, панславісты будуць намагацца адкалоць другі варыянт. Як?

З хуткасьцю Чыпа і Дэйла ляту ім на дапамогу. Адзіным апраўданьнем расейскіх мандарынаў можа быць час прыняцьця гістарычнага рашэньня — 10.00 1 студзеня. Час, калі рашэньні можна прымаць выключна па адной праблеме — як зь мінімальным галаўным болем выйсьці з навагодняга каматозу. Толькі спасылка на пахмельле ўратуе нашу славянскую хату.

Найлепшым выйсьцем будзе публікацыя адпаведнай рэдакцыі стэнаграмы паседжаньня Рады бясьпекі Расеі ад 1.01.06. Кшталту:

«Пуцін (ікаючы): Такім чынам, я хацеў бы заслухаць кіраўніка ўраду.

Фрадкоў (прачынаючыся): Хацеў бы агучыць супольную думку: паслаць Іванова па піва і вырубіць каму-небудзь па прыколе газ. Натуральна, не братам-славянам.

Мілер (яго страшна плюшчыць): Дарэчы, прыкаліцеся: у хахлоў прэм'ер — бурат.

Фрадкоў (прачынаючыся): Валі чукчаў. Пішы пастанову — вырубіць бурату газ і пасляць Іванова па піва.

Пуцін (ікаючы): Такім чынам, я хацеў бы заслухаць кіраўніка ўраду…»

Для праўдзівасьці можна прылажыць чэк аб набыцьці Івановым дзьвюх «сісек» «Арсэнальнага». Аднак гэта ўжо дэталі. Галоўнае не марудзіць з тлумачэньнямі, каб спраўдзілася мара Данілеўскага: «И своды древние Софии / В возобновленной Византии / Вновь осенят Христов алтарь! / Пади пред ним, о Царь России, / И встань, как Всеславянский Царь!»

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аляксандру А. з Горадні.** П'есы перадалі ў часопіс «ARCHE». Для газэты завялікія.

**Зьмітру З. з Гомельскага р-ну.** Найлепш пішэце зацемкі пра жыцьцё ў вашых краях, абразкі з натуры, рэфлексіі на істотныя тэмы. Чым больш адцягненыя рэчы апісваеце, тым лягчэй сфальшывіць.

**Івану К. зь Менску.** Вы прапануеце называць Беларусь Літварусьсю. Ня лічым актуальным распачынаць дыскусію наконт назвы нашай краіны. Заўважым толькі, што саманазвы эўрапейскіх народаў устаяліся. Не прыпамінаецца, каб дзе-які народ на нашай памяці іх мяняў.

**Івану С. з Горадні.** Дашліце апавяданьні ў літаратурныя часопісы. Не газэтнае.

**Міколу Б. з Дубровы, Сьветлагорскі раён.** Тэлефоны прыёмнай міністра спраўдзіце праз даведку. E-mail — на інтэрнэт-сайтах адпаведных ведамстваў.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Засьценак Хурманіха**, Віленск. губ., Ашмянск. пав. Сюды вярнуўся з Амэрыкі дзяцюк Ш. Што праўда, то не адзін, а з культурай. А культура гэта вось у чым: ён б'еца на кожным вясельлі і ігрышчы ды чапае ня толькі дзецюкоў, але і дзяўчат. А апрача гэтай «культуры» ён раве па-англійску, не гаворыць, а раве, для паказу сваёй культуры. Скора, відаць, нашыя гарадзкія хлопцы, каб не гаварыць па-беларуску, зачнуць хіба канямі ржаць ды ваўкамі выць.

**«НН» №1, 1911**